Дзяржава для народа
Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 СНЕЖНЯ 2016 г. СЕРАДА № 236 (28346)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Аўтарытэт мясцовых Саветаў дэпутатаў



Як вырашаецца пытанне нерухомай маёмасці?



У лепшых традыцыях: яблычны сыр

*ЛІЧБА ДНЯ*

**300 тысяч чалавек**

*складзе колькасць расійскіх турыстаў, якія наведалі Беларусь у 2016 годзе. Па звестках інтэрнэт-сэрвісу пошуку гатэляў RoomGuru.ru, расійскай версіі самага лепшага ў свеце пашукавіка па гатэлях, Мінск узначаліў рэйтынг папулярных сярод расіян турыстычных напрамкаў СНД і Грузіі па выніках адыходзячага года. Беларусь увайшла ў першую дзясятку самых папулярных у 2016 годзе ў расійскіх турыстаў замежных краін, сярод якіх Італія, Тайланд, Іспанія, Германія, Чэхія, Францыя, Грузія, Грэцыя і Эстонія.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9696 | ▼ |
| Еўра | 2,1197 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0308 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0754 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ПТУШКА НА ШЧАСЦЕ



Фота БЕЛТА.

Стала ўжо модным на зімовыя святы дарыць сувеніры ў выглядзе сімвала года паводле ўсходняга календара. 2017-ы будзе годам Пеўня, і ў крамах ужо безліч гэтых птушак у розных выявах. Але такія — вялікія, з каляровага шкла, як робіць майстар-шкловыдзімальшчык Юрый ЛЕЙТАР і яго калегі па брыгадзе на Бярозаўскім шклозаводзе «Нёман», больш падобныя не на цацкі, а на сапраўдныя творы мастацтва.

■ З першых вуснаў

## У БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ — ГОД ЯКАСЦІ

**Міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ даў «Звяздзе» эксклюзіўнае інтэрв'ю**



**Традыцыйна ў гэты перыяд у Міністэрстве абароны падводзяцца вынікі мінулага года, складаюцца планы на наступны. Год баявой падрыхтоўкі, які ўжо завяршыўся, не прадугледжваў буйнамаштабных вучэнняў узроўню «Шчыт Саюза» або «Захад», але на парадку дня былі іншыя вучэнні, праверкі, стрэльбы.**

Апошнім часам задач у галіне абароны становіцца ўсё больш. Ваенна-палітычнае становішча ў свеце абумоўлівае змяненне формаў і спосабаў барацьбы. І наша дзяржава не можа не рэагаваць на гэта. Прынятую нядаўна новую Ваенную дактрыны, а таксама глыбокая мадэрнізацыя беларускай арміі сведчаць аб тым, што Узброеныя Сілы ідуць у нагу з часам. Што яшчэ спрыяе далейшаму ўмацаванню бяспекі, падтрымлівае мір і стабільнасць у краіне, расказаў **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.**

***— Андрэй Аляксеевіч, ці ўдалося павысіць баявую падрыхтоўку вайскоўцаў? Або, на ўжо мінулы навучальны год, ставіліся іншыя мэты?***

— Вынікамі аператыўнай і баявой падрыхтоўкі, а таксама выкананымі падчас вучэнняў задачамі пацвярджаецца надзейнасць сістэмы ваеннай бяспекі нашай краіны. Камандна-штабное вучэнне Узброеных Сіл, якое прайшло ў верасні, стала апагеем мерапрыемстваў баявой і аператыўнай падрыхтоўкі за 2015/2016 навучальны год.

СТАР. 4

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## СВЯТА З ЗАПАЛАМ

**Нават бенгальскія агні могуць стаць прычынай траўмы, не кажучы ўжо пра петарды**

**Немагчыма ўявіць навагоднія святы без піратэхнічнай вячэрняй кананады. І хоць лепшым месцам для запуску салютаў, петард і ракет лічыцца пустка, але... у вялікім горадзе вольных месцаў з кожным годам становіцца ўсё меней. Ды і кудысьці ісці, каб запусціць петарду, аматары шумнага святкавання часам ляняцца. І феерверкі адбываюцца ў дварах жылых дамоў. На тую акалічнасць, што мінімальная адлегласць да будынкаў, аўтамабіляў, ліній электраперадач павінна складаць не адзін дзясятак метраў, увага звяртаецца не заўжды. І, як вынік, вогненны «сюрпрыз» можа тэарэтычна заляцець у любую кватэру.**

— Год ад года колькасць пажараў, якія ўзніклі па віне неналежнага абыходжання з піратэхнікай, памяншаецца, — гаворыць **памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Калі раней навагодні сезон адзначаўся дзясяткамі ўзгаранняў з-за няправільна запушчаных петард і ракет, то летась іх за снежань і студзень было ўсяго чатыры. Але гаспадарам пацярпелых кватэр ад гэтага не лягчэй. Так, 1 студзеня ўжо 2016 года а палове другой ночы экіпаж ратавальнікаў тэрмінова выехаў у вёску Копішча, што знаходзіцца пад Мінскам. На чацвёртым паверсе шматпавярховага дома гарэла кватэра, у якую з вуліцы заляцела петарда, прабіўшы шкло. На шчасце, людзі не пацярпелі. Чага, аднак, не скажаш пра мэблю і зусім нядаўна зроблены рамонт.

### Узарваў петарду — застаўся без пальца

Але петарды — гэта небяспека і для людзей, таму па-ранейшаму ратавальнікаў вельмі непакоіць «святочны» траўматызм. Інструкцыю да піратэхнікі аматары шумнага святкавання чытаюць не заўжды. Спадзяюцца ці то на ўласны досвед, ці то на думку, што ў запуску петарды нічога складанага няма: маўляў, падпаліў — і адбягай. А ў выніку?

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ДЭТАЛЁВАЯ НАСТРОЙКА ДЗЕЙСНАГА МЕХАНІЗМА

## Нормы Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» адкарэкціруюць да канца года

**Такое рашэнне прынята на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі, падчас якой абмяркоўваліся пытанні ўдасканалення мер у гэтай сферы.**

Прэзідэнт адзначыў, што ў народзе адпаведны дакумент назвалі дэкрэтам супраць дармаедаў. «Напэўна, у гэтым нешта ёсць. Не будзем спрачацца з народам, — сказаў ён. — Дэкрэт быў накіраваны на ліквідацыю найскладанейшай праблемы — сацыяльнага ўтрыманства. Рашэнне гэтай праблемы бачылася ў стымуляванні працаздольных грамадзян, якія могуць і павінны працаваць, да легальнай працоўнай дзейнасці і забеспячэння выканання канстытуцыйнага абавязку па ўдзеле ў фінансаванні дзяржвыдаткаў».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб даручэнні старанна маніторыць прымяненне дэкрэта на практыцы. Адпаведная тэматыка неаднаразова абмяркоўвалася падчас дакладаў кіраўніку дзяржавы Марыяны Шчоткінай, якая раней займала пасаду міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі. «Тады я сказаў, што які б ні былі размовы, для таго, каб прымаць дадатковае рашэнне, трэба пажыць, папрацаваць. Прайшло больш за год. Мы цяпер ужо больш-менш бачым, што даў гэты дэкрэт, якія становыя бакі гэтага дакумента. Недахопы ёсць? Ну што ж, давайце папраўляць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў гэтым пытанні яго больш за ўсё турбуе нават не тое, што грамадзяне, якія падпадаюць пад нормы дэкрэта, атрымліваюць пэўнае бясплатнае абслугоўванне або льготы. «Мяне больш за ўсё хвалюе рэакцыя людзей на гультаёў. Чалавек, які можа працаваць, не інвалід, не абмежаваны ў нейкіх здольнасцях і магчымасцях, павінен працаваць, зарабляць на сябе і сваю сям'ю і прыносіць карысць краіне, выплачваючы падаткі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён прапанаваў разабрацца, якія праблемы паўсталі ў ходзе рэалізацыі дэкрэта, наколькі надзейна пастаўлены заслон сацыяльнаму ўтрыманству, ці ўздзейнічае распрацаваны механізм на тых людзей, якія не хочуць працаваць або працоўнасць нелегальна. Прэзідэнт таксама пацікавіўся, якая рэальная практыка прымянення дэкрэта на месцах, наколькі якасна і дакладна складаюцца спісы плацельшчыкаў гэтага збору. «Мне дакладваюць, што нярэдка паведамленні на выплату збору паступаюць ад падатковых інспекцый грамадзянам, якія не абавязаныя плаціць гэты збор і не павінны былі ўключацца дзяржаўнымі органамі ў спісы плацельшчыкаў: студэнтам, жанчынам, якія знаходзяцца ў дэкрэтных адпачынках, нават салдатам тэрміновай службы», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«У гэтай сітуацыі заўсёды будуць нейкія недахопы. Галоўнае, каб мы бачылі гэтыя недахопы і своечасова іх ліквідавалі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама запатрабаваў далажыць аб выніках выканання ўрадам даручэння аб стварэнні дастатковай колькасці працоўных месцаў для працаўладкавання беспрацоўных грамадзян і выніках маніторынгу ўзроўню беспрацоўя па ўсіх рэгіёнах краіны.

Як далажыла віцэ-прэм'ер Наталля Качанава, урадам ва ўзаемадзеянні з Адміністрацыяй Прэзідэнта праведзены маніторынг рэалізацыі дэкрэта. Галоўная высноўа — дэкрэт з'яўляецца актуальным, аб'ектыўным і неабходным, аказвае станоўчае ўздзеянне на сферу працы і занятасці, уцягванне ў легальную эканамічную дзейнасць незанятага насельніцтва.

На нарадзе прынятыя некаторыя навацыі, якія будуць унесены ў якасці паправак у дзеючы дэкрэт, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Перш за ўсё, гэта тычыцца цяжкіх жыццёвых сітуацый і прадастаўлення права мясцовым органам улады прымаць рашэнні аб вызваленні ад выплаты збору грамадзян на адпаведных падставах. Плануецца, што гэтым правам будуць надзелены мясцовыя Саветы дэпутатаў і выканаўчыя органы. Працэс прыняцця рашэнняў у гэтай сферы аддадуць на кантроль кіраўнікам рэгіёнаў.

Чакаецца пашырэнне пераліку катэгорый грамадзян, якія будуць вызваляцца ад выплаты збору. Гэта, напрыклад, тыя, хто праходзіць альтэрнатыўную службу, спартсмены, якія значацца ў спісачным складзе нацыянальнай або зборнай каманды Беларусі па тым або іншым відзе спорту і не атрымліваюць нейкага даходу.

Акрамя таго, падтрымана прапанова ў якасці выплачанага падаходнага падатку з фізічных асоб улічваць таксама сумы такога падатку, на якія ён быў паменшаны ў выніку прымянення ўстаноўленых заканадаўствам падатковых вылікаў, як, напрыклад, у выпадку аказання дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі пры будаўніцтве жылля або атрымманні адукацыі.

Яшчэ адно змяненне закране перанос тэрмінаў выдачы паведамленняў і выплаты збору за 2015 год на 20 студзеня і 20 лютага 2017 года адпаведна. Гэта зроблена ў тым ліку з-за неабходнасці ўдасканалення сфарміраванай інфармацыйнай базы даных плацельшчыкаў збору.

# СТАЎКА НА РЭГІЁНЫ

**Беларусь і Іркуцкая вобласць Расіі павінны знайсці рэзервы для нарошчвання ўзаемнага гандлю. Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з губернатарам Іркуцкай вобласці Сяргеем ЛЕЎЧАНКАМ.**

«Эканоміка — гэта аснова любых адносін, таму, хочаш ці не хочаш, прыйдзецца знайсці гэтыя рэзервы. А яны ёсць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы перад гэтым, што сёлета адбылося значнае зніжэнне ўзаемнага тавараабароту.

«Ёсць добрыя перспектывы для супрацоўніцтва па пастаўках вам кар'ернай, грузавой і іншай спецыяльнай тэхнікі, а таксама пагрузчыкаў для радовішчаў вугалю і іншых радовішчаў, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Акрамя таго, мы гатовыя пастаўляць вам сельскагаспадарчую, пасажырскую, дарожна-будаўнічую тэхніку. Развіваць вытворчую кааперацыю, у тым ліку з прадпрыемствамі абаронна-прамысловага комплексу. Мы гатовы ствараць сумесныя прадпрыемствы на тэрыторыі вобласці і ісці тым шляхам, які пракладзены намі ўжо ў іншых рэгіёнах Расіі».

На сустрэчы адзначалася, што ў Іркуцкай вобласці сёлета ўжо паспелі дастаткова сур'ёзна пераарыентавацца на беларускую тэхніку, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Пры гэтым было падкрэслена, што яна з'яўляецца канкурэнтаздольнай па ўсіх параметрах: якасці, прадукцыйнасці, кошту і абслугоўванні.

Беларусь і Іркуцкая вобласць маюць намер таксама шукаць узаемавыгадныя сумесныя праекты ў сельскай гаспадарцы. Нягледзячы на значную аддаленасць расійскага рэгіёна, ёсць перспектывы супрацоўніцтва і ў будаўнічай галіне. Канкрэтным напрамкам супрацоўніцтва ў гэтай сферы можа стаць стварэнне сумеснай зборачнай вытворчасці ліфтаў, а таксама рэалізацыя пілотнага праекта па будаўніцтве ў Іркуцкай вобласці аграгарадка па беларускай мадэлі. Яшчэ адной перспектыўнай сферай развіцця ўзаемадзеяння можа стаць нарыхтоўка лесу. Тут бакі разглядаюць розныя варыянты супрацоўніцтва, аж да стварэння мэблевых вытворчасцяў.

Прэзідэнт сказаў, што ў краіне робяць высокую стаўку на ўзаемадзеянне з расійскімі рэгіёнамі, таму Беларусь адкрытая для супрацоўніцтва з Іркуцкай вобласцю ў самых разнастайных сферах. «Давайце рухацца ў напрамку, які быў зададзены хоць бы ў 2015 годзе, каб тавараабарот узрастаў не толькі паміж нашай рэспублікай і Іркуцкай вобласцю, але і паміж Беларуссю і Расіяй. Мы самі сябе крытыкуем, а цяпер і за мяжой пачалі казаць: што гэта за Еўразійскі эканамічны саюз, калі падае тавараабарот. Мы і самі разумеем, што гэта ненармальна, але цяпер нас крытыкаваць пачынаюць іншыя і ставяць пад сумнеў нашы інтэграцыйныя аб'яднанні», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ў завяршэнні падкрэсліў, што Беларусь гатова нарошчваць тавараабарот з Расіяй і Іркуцкай вобласцю ў прыватнасці.

■ Ва ўрадзе

# Экспарт у краіны ЕАЭС павялічыўся,

## а пастаўкі малочных прадуктаў у Кітай прабуксоўваюць

**Чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў было прысвечана вынікам работы ў студзені—верасні і датычылася нарошчвання і дыверсіфікацыі экспарту.**

«Па-ранейшаму актуальная задача па ліквідацыі бар'ераў у гандлі з нашымі традыцыйнымі партнёрамі, перш за ўсё з Расійскай Федэрацыяй. На расійскім рынку сітуацыя хоць і выраўноўваецца, але для захавання пазіцый на гэтым рынку неабходныя дадатковыя рэсурсы пры няроўнасці на ўмовах гаспадарання прадпрыемстваў Беларусі і Расіі, якая ўзмацняецца», — сказаў **Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі.**

У агульным аб'ёме экспарту доля краін ЕАЭС, уключаючы Расію, павялічылася з 39% да 46%, доля краін Еўрапейскага саюза знізілася, паведамляе прэс-служба Саўміна. Пры гэтым зніжэнне паставак у Еўропу адбылося ў асноўным за кошт скарачэння вартасных аб'ёмаў экспарту нафтапрадуктаў. «Такая ж карціна назіраецца па многіх іншых таварных пазіцыях. Таварная структура экспарту ў краіны Еўрасаюза вымушае жадаць лепшага», — канстатаваў Андрэй Кабякоў.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, расійскі рынак застаецца прэміяльным для беларускіх харчовых тавараў, аднак канкурэнцыя з расійскімі вытворцамі нарастае. «У чым прычына, што 34 сертыфікаваныя беларускія прадпрыемствы не пачалі пастаўкі малочнай прадукцыі ў Кітай?» — пацікавіўся Андрэй Кабякоў. Пры гэтым забеспячэнне эфектыўнай работы дзеючых суб'ектаў і пашырэнне тавараправоднай сеткі за мяжой застаецца прыярытэтам экспартнай стратэгіі ўсіх прадпрыемстваў. На думку прэм'ер-міністра, уласная тавараправодная сетка, якая налічвае больш за 300 суб'ектаў у 40 краінах, павінна быць апорай у рабоце па нарошчванні і дыверсіфікацыі экспарту.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Міжнародны ўзровень

# ВЕКТАРЫ РУХУ

**Нацыянальны сход іграе найважнейшую ролю ў вывучэнні новых рынкаў, у пошуку партнёраў за мяжой. Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, упэўнены: Беларусі неабходна больш актыўна пазіцыянаваць сябе ў свеце.**

### «Асваенне» Амерыкі

Расказваючы пра вынікі ўдзелу ў 32-й асамблеі Лацінаамерыканскага парламента, віцэ-спікер ніжняй палаты звярнуў увагу на важнасць таго, што сёлета мы атрымалі там статус назіральніка.

— Мы мелі магчымасць пачуць, чым жывуць нашы калегі, партнёры ў гэтым велізарным рэгіёне, і нам далі магчымасць выступіць там, абазначыць уласную пазіцыю, — адзначыў Баляслаў Пірштук. — Наша задача ў лацінаамерыканскім рэгіёне — садзейнічанне гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву. Хачу нагадаць, што з многімі краінамі кантынента ў нас закладзены дастаткова трывалы фундамент супрацоўніцтва. Перш за ўсё, за кошт сустрэч і перамоў кіраўніка нашай дзяржавы з кіраўнікамі такіх дзяржаў, як Венесуэла, Бразілія, Куба, Эквадор... Для нас гэта аснова, і нам цяпер прасцей прасоўваць свае інтарэсы ў гэтых рэгіёнах.

Па словах Баляслава Пірштука, нават на гэтым мерапрыемстве, куды наша краіна была запрошана ўпершыню і дзе было не так шмат прадстаўнікоў бізнесу, атрымалася завязаць карысныя кантакты.

— Кіраўнік дэлегацыі Эквадора хоча шчыльна папрацаваць па пастаўках нашай тэхнікі — перш за ўсё трактарнай, а таксама мінеральных угнаенняў. Са свайго боку, яны прапануюць нам свае адмысловыя лекавыя прэпараты, якіх няма ў нас у краіне і якія мы імпартуем. Амерыканскі партнёр прапанаваў папрацаваць у рэчышчы арганізацыі невялікіх адукацыйных, гуманітарных праектаў. Безумоўна, мы з задавальненнем прымем такія прапановы. У якасці пілотнага паспрабуем літаральна напачатку наступнага года дамовіцца, каб іх прадстаўнікі прыехалі да нас у краіну, мы прапануем рэгіён, канкрэтны населены пункт, і там адпрацуем такія пілотныя схемы, якія ў будучыні можна будзе пашырыць.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» пра магчымых новых партнёраў у гэтым рэгіёне, Баляслаў Пірштук падкрэсліў: у кожнай краіны — свае асаблівасці. Мы мала што зараз ведаем пра Чылі, Перу, але яны ўяўляюць для нас цікавасць — калі добра вывучыць патрэбы гэтых краін.

### Азіяцкі напрамак

— Не так даўно — напрыканцы лістапада — я ўдзельнічаў у парламенцкай канферэнцыі ў Казахстане, — расказаў Баляслаў Пірштук. — Для нас вельмі цікавы partner Казахстана. За 25 гадоў незалежнасці ВУП краіны вырас больш чым у 10 разоў. Прамыя інвестыцыі перавысілі 200 млрд долараў. Гэта наглядны прыклад таго, як можна ў складаных эканамічных умовах развівацца.

Па словах намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў, казахстанскі бок праяўляе вялікую цікавасць да тых падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне.

— У іх новым складзе парламента сфарміравана працоўная група па ўзаемадзеянні з нашым Нацыянальным сходам. З 107 дэпутатаў у гэту групу запісалася 53 дэпутаты! Уяўляеце? Хоць па іх рэгламенту максімальная колькасць павінна быць 25. Мы дамовіліся са спікерам парламента Казахстана, што напачатку наступнага года ён здзейсніць афіцыйны візіт у нашу краіну — гэта хутчэй за ўсё будзе студзень-люты, дата ўдакладніцца пазней.

### Пазітыўны прагноз па ЕС

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» пра перспектывы парламенцкага супрацоўніцтва з Еўрапейскім саюзам, Баляслаў Пірштук прызнаўся, што ўпэўнены ў пазітыўным развіцці адносін Беларусі і ЕС у 2017 годзе. Ён звярнуў увагу, што ў сферы эканомікі ў Беларусі і ЕС няма праблем. На думку парламентарыя, у 2017 годзе і ў іншых сферах «адносіны будуць выглядаць нашмат перспектыўней, чым было да гэтага часу».

У сакавіку нашу краіну наведае старшыня Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) Крысцін Муттонен. Падчас візіту будзе абмяркоўвацца падрыхтоўка да правядзення чарговай сесіі ПА АБСЕ, якая павінна адбыцца ў Мінску 5-9 ліпеня 2017 года.

— Вызначым непасрэдны фармат, дэталі, тонкасці, мерапрыемствы, — паведаміў Баляслаў Пірштук.

Паводле яго слоў, Беларусь ужо прыступіла да арганізацыйных мерапрыемстваў сесіі, змястоўная ж частка будзе вызначана ў наступным годзе. Чакаецца, што ў беларускую сталіцу прыбудуць каля 700 удзельнікаў, у тым ліку звыш 500 парламентарыяў з 56 краін свету.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# УСЛЕД ЗА ІНАВАЦЫЯМІ

**Акадэміі навук Беларусі і Польшчы падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.**

Пра гэта расказаў маршал Сената Рэспублікі Польшча Станіслаў Карчэўскі на сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі філфака БДУ і прадстаўнікамі сярэдніх школ сталіцы, у якіх вывучаецца польская мова.

Акрамя гэтага, падчас свайго візіту ў Беларусь ён разам з парламенцкай дэлегацыяй і старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам Мясніковічам наведаў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі ў Бараўлянах і палац у Нясвіжы.

Рэктар Белдзяржуніверсітэта Сяргей Абламейка нагадаў, што паміж БДУ і польскімі вучэбнымі і навуковымі ўстановамі ўжо падпісана 33 пагадненні. Найбольш плённае супрацоўніцтва наладжана з ВНУ Варшавы, Лодзі і Беластока. Праходзяць абмены і стажыроўкі выкладчыкаў і студэнтаў. Іван Роўда, дэкан філфака БДУ, адзначыў, што польская філалогія — адна з самых папулярных на факультэце сярод абітурыентаў.

— Вельмі важна супрацоўнічаць ва ўсіх сферах, асабліва ў навуцы, — расказвае Станіслаў Карчэўскі. — Беларускія і польскія ВНУ знаходзяцца прыкладна на адных і тых жа пазіцыях у міжнародных рэйтынгах. Дзякуючы нашаму партнёрству, мы можам разам ісці наперад.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

Актыўнае супрацоўніцтва ідзе і ў медыцынскай сферы. Міністр аховы здароўя Васіль Жарко адзначыў, што «адбываецца абмен вопытам. Ажыццяўляюцца пастаўкі медыцынскай тэхнікі ў нашы бальніцы па лініі Еўрасаюза». Па словах кіраўніка міністэрства, ужо ёсць дамоўленасць аб сустрэчы з міністрам аховы здароўя Польшчы для абмеркавання перспектыў партнёрства. Станіслаў Карчэўскі пасля візіту ў лячэбную ўстанову заўважыў, што лячэнне дзіцячых анкалагічных захворванняў у Беларусі знаходзіцца на сусветным узроўні. Ён разам з Васілём Жарко абмеркаваў перспектывы польска-беларускага трансгранічнага супрацоўніцтва, у тым ліку ў клінічнай вобласці.

# СВЯТА З ЗАПАЛАМ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Некалькі гадоў таму ў Мінску здарыўся паказальны выпадак. Малады чалавек падрыхтаваў да запуску ракетніцу. Але не звярнуў увагу на яркую зялёную стрэлку, якая літаральна «крычала»: ставіць установку трэба вертыкальна. А ён невядома чаму паклаў яе на зямлю. Запал бікфордавага шнура, шыпенне — і гарачы снарад трапіў небараку прама ў твар.

Гартаю спіс няшчасных выпадкаў мінулага Новага года. А сёмай раніцы 1 студзеня дзяжурная медсястра Пінскай цэнтральнай бальніцы паведаміла, што да іх быў дастаўлены 35-гадовы мясцовы жыхар з тэрмічнымі апёкамі абодвух вачэй, твару і рванымі ранамі вуснаў. Ён патлумачыў, што траўмы атрымаў з-за выбуху петарды.

Вока чапляе міжволі ў спіску пацярпелых ад піратэхнікі тую акалічнасць, што гады іх нараджэння пачынаюцца з лічбы «2». Так, за мінулы навагодні сезон непаўналетніх, якім нанесла пашкоджанні святочная пальба, было 10 з агульных 15 пацярпелых. Сярод іх сустракаюцца траўмы даволі сур'ёзныя.

Далёка не заўжды дзеці самі становіцца віноўнікамі сваіх траўмаў. Напрыклад, 5-гадовага хлопчыка ў Гродне выбуховая хваля ад петарды моцна ўдарыла ў грудзі. А ў Бабруйску 15-гадовая дзяўчына тэрмічны апёк ілба і патыліцы атрымала знянацку. Каля гадзіны ночы гуляла каля свайго дома, раптам улавіла дзіўны гук ззаду і тут жа адчула смыленне ў патыліцы і правай частцы твару.

На жаль, не абыходзіцца і без адарваных частак цела. 27-гадоваму мужчыну з Ліды ўрачы былі вымушаны ампутаваць фалангу сярэдняга пальца на адной з рук. Жыхар Брэста, які ўзрываў петарду ў двары свайго дома, «зарабіў» вострую акустычную траўму правага вуха.

Вялікую патэнцыйную небяспеку хаваюць у сабе і бяскрыўдныя на першы погляд бенгальскія агні, на якія не патрэбна асаблівых дазволаў. Таму дарослыя вельмі ахвотна даюць іх дзецям у якасці забаўкі. Якая, аднак, далёка не бясшкодная. Калі міжволі дакрануцца да палаючага кнота, то імгненна скура будзе пашкоджана камбінаваным апёкам. Ён мала таго што тэрмічны, дык яшчэ і хімічны: прыгожыя іскры ўтвараюцца ў выніку ўзаемадзеяння нітрату барыю з парашком алюмінію ці магнію. Такія апёкі вельмі доўга зажываюць, ды і лячэнне іх даволі складанае.

## Калі ўзрыўчатка не спрацавала...

Дзіўна, але і дагэтуль супрацоўнікі МНС і МУС на сумесных рэйдах выяўляюць несертыфікаваную піратэхніку. Яна ў «левых» гандляроў каштуе абсалютна столькі ж, колькі і праверaная ў спецыяльных пунктах продажу. Прычым невядома, дзе яе зрабілі, як перавозілі, у якіх умовах захоўвалі, ці тэставалі на прадмет бяспечнасці. Калі легальная піратэхніка абавязкова суправаджаецца інструкцыяй на рускай ці беларускай мовах, то ў «шэрай» грымучкі яе або няма ўвогуле, або яна надрукавана па-кітайску. Пакладзі руку на сэрца, спытайце сябе: ці шмат хто з вашага акружэння ў стане зразумець іерагліфічныя тэксты? Малюнкаў (калі яны нават і ёсць) зусім не хопіць для разумення шматлікіх нюансаў. Асабліва калі здарылася так, што як быццам падрыхтоўка да запуску ішла строга па інструкцыі, але ракета ці петарда ўверх так і не ўзляцела. Можа, дома піратэхніка захоўвалася не так, як належыць, а можа, трапіўся бракаваны экзэмпляр. Паўза зацягваецца на хвіліну, другую. Зацікаўлены чалавек адпраўляецца паглядзець, што ж там адбылося. Нахіляецца над установкай — і па законе подласці ў гэтую ж секунду механізм спрацоўвае. А наступствы гэтага могуць быць розныя — ад знявечанага твару да выбітых вачэй.

— Піратэхніку важна правільна захоўваць, — працягвае Віталь Навіцкі. — Яе нельга проста так запхнуць пад ложак ля батарэі ці вынесці на балкон, каб не замінала пад нагамі. Порах ці гарачая сумесь могуць адсырэць ці, наадварот, перасохнуць — усё залежыць ад спецыфікі святочнай «грымучкі», якая зноў жа павінна быць дакладна распісана ў інструкцыі. Але ў любым выпадку гэта павінна быць сухое месца, абароненае ад прамых сонечных промняў. Між іншым, у інструкцыі павінен быць дакладна распісаны не толькі парадак правільнага запуску, які можа выконваць толькі цвярозы чалавек, але і дзеянні ў выпадку неспрацоўвання зараду. Часцей за ўсё трэба пачакаць 15—20 хвілін, пасля асцярожна наблізіцца да праблемнай узрыўчаткі і заліць яе вядром вады.

Міністэрства ўнутраных спраў папярэджвае, што выкарыстанне піратэхнікі ў грамадскіх месцах можа быць расцэнена як дробнае хуліганства. За гэта кашалёк можа схуднець на суму ад 42 да 630 рублёў. Ці яго гаспадар рызыкуе нават трапіць пад адміністрацыйны арышт да 15 сутак. Калі за ўжываннем піратэхнікі злавілі ваша дзіця, то штрафная санкцыя прадугледжвае суму да 210 рублёў (10 базавых велічынь) па артыкуле 9.4 КаАП (невыкананне абавязкаў па выхаванні дзяцей). А вось калі петарда ці ракета нанесла моцную шкоду здароўю ці маёмасці, то справа можа скончыцца нават крымінальнай адказнасцю. Таму падумайце лішні раз, падпальваючы запал у петарды: ці варта гэта такой рызыкі?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

### ■ ТЫМ ЧАСАМ



**Анастасія Рудкоўская стала лепшым прапагандыстам МНС**

У Мінску ўжо трэці раз прайшоў конкурс «Лепшы прапагандыст». Для таго каб трапіць на рэспубліканскі этап, удзельнікам прыйшлося спаборнічаць у сваіх тэрытарыяльных упраўленнях. У фінале сустрэліся пераможцы абласных і Мінскага гарадскога адборачных тураў.

Агульную перамогу прадстаўніцы Магілёўскага гарадскога аддзела МНС прынеслі два другія месцы ў намінацыях «Дамашняе заданне» і «Прамоўніцкае майстэрства», а таксама бліскуча пройдзенае тэсціраванне і дастойна прадстаўлены інавацыйны сацыяльны праект аб небяспецы пакідання дзяцей адных «Трымайце дзіця за руку».

Больш матэрыялаў з конкурсу можна пагледзець на сайце МНС.

# З ГОДНАСЦЮ І ВЕРАЙ

## НА ЗАКРЫЦЦІ ФУТБОЛЬНАГА СЕЗОНА НАЗВАЛІ ЛЕПШЫХ ГУЛЬЦОЎ, ТРЭНЕРАЎ І АРБІТРАЎ

**Як і годам раней урачыстая цырымонія «Зорны мяч» прайшла ў сталічным Prime Hall. У гэты вечар там сабралася ўся эліта айчыннага футбола. Ужо па традыцыі першым з прывітальным словам выступіў кіраўнік федэрацыі Сяргей РУМАС, ён падвёў вынікі адыходзячага года.**



*— 2016-ы выдаўся няпростым для ўсіх нас. Вядучыя клубы не змаглі прабіцца ў групавыя стадыі еўракубкаў, іншага выніку мы чакалі ад зборнай. Праблемным стаў і чэмпіянат краіны, але мы прынялі няўдачы з годнасцю і верай, што яны зробяць нас мацнейшымі ў будучыні, — сказаў Сяргей Мікалаевіч, але разам з тым адзначыў і плюсы праведзенай работы ў сёлетнім сезоне. — Дзве юнацкія зборныя прабіліся ў элітны раўнд чэмпіянату Еўропы. Мы правялі чэмпіянат Еўропы сярод дзяўчат да 17 гадоў, якому УЕФА даў найвышэйшую адзнаку. Сёлета былі ўведзены ў строй і ўжо функцыянуе тэхнічны цэнтр нашай асацыяцыі, якім мы без усялякага сораму можам ганарыцца,* — дадаў кіраўнік.

Ад слоў і вынікаў прысутныя перайшлі да самай цікавай часткі мерапрыемства — раздачы прызоў. Пачнём з дам. Лепшай футбалісткай жаночага чэмпіянату краіны аб'яўлена *Анастасія Ліннік* са сталічнай «Зоркі»-БДУ, яе аднаклубніца *Наталля Васкабовіч* стала лепшай футбалісткай Беларусі.

Галкіпер футбольнага клуба «Мінск» *Андрэй Клімовіч* названы лепшым варатаром чэмпіянату, лепшым абаронцам стаў *Павел Рыбак* з салігорскага «Шахцёра». Сярод паўабаронцаў ганаровай статуэткі ўдастоены *Ігар Стасевіч* з БАТЭ, ён жа стаў і лепшым гульцом чэмпіянату. Адзначым, такое званне Ігар атрымлівае ўжо трэці год запар.

Аднаклубнік Стасевіча, капітан барысаўчан *Віталь Радзівонаў* шосты раз прызнаны лепшым нападаючым чэмпіянату. У 25 матчах ён забіў 15 мячоў і падзяліў званне лепшага снайпера турніру разам з партнёрам па камандзе Міхаілам Гардзейчуком.

*— Рады, што мне ўдалося вярнуцца ў гэтую святочную залу. Рады таму, што працую ў лепшай камандзе краіны, з лепшымі ў краіне партнёрамі, якія дазваляюць дамагацца высокіх мэт. У БАТЭ створаны ўсе ўмовы, каб гульцы развіваліся, таму мне прыемна працаваць тут,* — адзначыў Віталь.

Прыз імя Аляксандра Пракапенкі «За футбольны талент і самааддачу ў гульні за Беларусь» атрымаў *Дзяніс Палякоў* з БАТЭ. Лепшым трэнерам краіны прызнаны *Віктар Ганчарэнка*, які цяпер трэніруе «Уфу». Лепшым футбалістам краіны названы *Цімафей Калачоў*, які гуляе за «Растоў». Для 35-гадовага Калачова гэта другая падобная ўзнагарода, упершыню ён быў названы лепшым футбалістам краіны ў 2013 годзе.

Лепшым гульцом краіны ў пляжным футболе названы *Ігар Брыштэль* (БДПУ). У такой жа намінацыі ў міні-футболе статуэтку забраў *Аляксандр Чэрнік* («Сталіца»). Лепшая суддзейская брыгада — *Аляксей Кульбакоў* (галоўны арбітр), асістэнты — *Віталь Малюцін і Дзмітрый Жук*. Прыз за асаблівы ўнёсак у развіццё масавага футбола атрымаў *Юрый Бялецкі* (Жабінка).

Акрамя індывідуальных узнагарод былі ўручаны і камандныя прызы. Футбольны клуб БАТЭ быў лепшым у намінацыях — «Справядлівая гульня», «Прыз сімпатый гледачоў», «За волю да перамогі», а таксама атрымаў прыз у намінацыі «Двума складамі».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■

### ■ Пастфактум

# Ад скарпіёна да гекона

## Ці трэба баяцца нечаканых гасцей у экзатычных таварах?

**Днямі ў Баранавічах адбыўся рэзанансны выпадак: пакупніка, які выбіраў бананы, за палец уджаліў скарпіён. Гісторыя скончылася хэпі-эндам, але ці абароненыя мы ад іншых такіх выпадкаў? І ўвогуле, ці сапраўды існуе небяспека прынесці дадому нечаканага паўднёвага «госця» разам з экзатычнымі фруктамі? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да загадчыка лабараторыі наземных бесхрыбетных жывёл Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Алега ПРЫШЧЭПЧЫКА.**

Паводле слоў навукоўца, выпадак, што адбыўся ў Баранавічах, — хутчэй выключэнне з правілаў. Звычайна за час транспарціроўкі, складзіравання і рэалізацыі прадукцыі пераважная частка яе «насельнікаў» гіне: як ад халоднага клімату ці ўтрымання тавару ў халадзільніку, так і ад голаду. Акрамя таго, напрыклад, у краінах Міжземнаморскага рэгіёна існуюць спецыяльныя службы, якія апрацоўваюць садавіну спецыяльным саставам. Але верагоднасць сустрэчы з паўднёвым «госцем» усё ж існуе, і гісторыя пакупніка з Баранавічаў гэта пацвярджае.

— Справа ў тым, што банан адносіцца да тых прадуктаў, якія хутка перасяпваюць, — тлумачыць Алег Прышчэпчык. — Калі ў крамы наладжаны прамыя пастаўкі такога прадукту з замежжа, то ў краіну могуць прывозіць напаўспелую прадукцыю жоўтазялёнага колеру. Яна вельмі хутка праходзіць праз мяжу і амаль адразу ж ідзе на рэалізацыю. Вядома, у такіх умовах нейкія прадстаўнікі фаўны могуць выжыць. Да нас трапляюць некаторыя віды сельскагаспадарчых шкоднікаў, тыя ж скарпіёны і нават скалапендры. Але цяпер больш папулярная іншая мадэль: у лагістычныя цэнтры прывозяць яшчэ зялёныя бананы, якія там даспяваюць, а ў такім выпадку выжыванне інвазіўных відаў практычна немагчымае.

Паводле слоў навукоўца, адзіны спосаб засцерагчыся ад непрыемнай сустрэчы з нечаканымі гасцямі — уважліва выбіраць садавіну з далёкага замежжа.

— Хоць бы выпадкі, калі нам перадавалі знойдзеныя ў іх насякомых і нават геконабананаеда. Думаю, калі дзенебудзь на складах работнікі і знаходзяць пабочную фаўну, то проста знішчаюць яе на месцы, нікуды не паведамляючы, — сцвярджае Алег Прышчэпчык. Ці трэба хвалявацца пасля выпадку ў Баранавічах? Не думаю, асабліва цяпер: зімой і вясной большасць садавіны будзе паступаць да нас са складоў, і па згаданых вышэй прычынах скарпіёнаў і іншых небяспечных відаў там быць не павінна.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■

# ПЕРАД КАЛЯДАМІ

**У Палацы культуры БелАЗа ў г. Жодзіна сёння пройдуць II Барысаўскія калядныя рэгіянальныя чытанні, прысвечаныя ролі праваслаўя ў гісторыі і культуры Беларусі.**

Падчас чытанняў будуць працаваць секцыі ў дзіцячым садзе-яслях №19, у гімназіі №1 г. Жодзіна. У цэнтральнай гарадской бібліятэцы ўдзельнікі абмяркуюць узаемадзеянне з установамі культуры, у Жодзінскай цэнтральнай гарадской бальніцы — з установамі аховы здароўя, супрацоўніцтва з Узброенымі Сіламі Беларусі — у вайсковай часці 28729.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# СУСЕДЗІ ДАПАМАГЛІ НЕ ЗАГІНУЦЬ

**Трагедыю, падобную той, што адбылася ў Віцебскай вобласці, дзе на пажары загінулі 3 чалавекі, атрымалася прадухіліць у Бабруйску. Як расказаў спецыяліст групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Уладзімір БУТКО, гарэла кватэра ў доме па вуліцы Гогаля:**

— Калі на месца здарэння прыбылі першыя машыны аварыйна-выратавальнай часці №4, з вокнаў кватэры ўжо валіў дым. Ратавальнікі Ігар Арцемчык, Эдуард Ткачэнка, Мікалай Кузянок і Аляксей Булак у пярэднім пакоі знайшлі на падлозе мужчыну і жанчыну ў непрытомным стане. Яшчэ аднаго мужчыну без прытомнасці вынеслі Аляксандр Панцялееў, Аляксандр Сямашка і Сяргей Дуускі. Усе трое пацярпелых былі перададзены медыкам і шпіталізаваны. Калі б не пільная суседка, якая першай пачала біць трывогу, людзі маглі б загінуць. Пакуль яна нам тэлефанавала, яе муж тушыў падпаленыя дзверы.

Пры праверцы высветлілася, што гаспадыня злашчаснай кватэры працуе ў Мінску, а ў Бабруйск прыехала, каб крыху адпачыць. З гэтай нагоды запрасіла ў госці двух сяброў. Як развіваліся падзеі потым, установіць следства.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# У БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ — ГОД ЯКАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вынікі праведзенага вучэння, мэтай якога з'яўлялася праверка адэкватнасці формаў і спосабаў процідзеяння новым выклікам і пагрозам ваеннай бяспецы дзяржавы, дэталёва намі прааналізаваны і будуць пакладзены ў аснову ўдасканалення тэорыі спецыяльных дзеянняў.

Прадстаўнікі Узброеных Сіл Беларусі ўдзельнічалі ў сумесных вучэннях сіл і сродкаў разведкі «Пошук-2016» на тэрыторыі Таджыкістана, міратворчых сіл «Непарушнае братэрства — 2016» на нашай зямлі і ў камандна-штабным вучэнні з кантынгентамі калектыўных сіл аператыўнага рэагавання «Узаемадзеянне-2016» у Расійскай Федэрацыі. Нязменна высокія вынікі дэманструюць воінскія часці Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны ў рамках тактычных вучэнняў з баявой стральбой на расійскім палігоне Ашулук. Сёлета ваеннаслужачыя вельмі добра паказалі сябе ў намінацыях «Авіядартс» і «Ключы ад неба» падчас «Армейскіх міжнародных гульняў — 2016». Для забеспячэння жывучасці авіяцыі абсталяваны і апрабаваны аэрадромныя ўчасткі дарог. Сёлета ўпершыню праведзена лётна-тактычнае вучэнне з пасадкай на аэрадромныя ўчасткі дарог у начных умовах самалётаў МіГ-29, Су-25, Як-130. Нядаўна завяршылася праверка ўзроўню прафесійна-службовай падрыхтоўкі афіцэраў Узброеных Сіл пад кіраўніцтвам Прэзідэнта Беларусі. Яе можна смела назваць галоўным іспытам года для беларускай арміі. І гэты экзамен з годнасцю вытрыманы.

***— Кіраўнік нашай дзяржавы, які асабіста ацаніў боегатоўнасць вайскоўцаў, адзначыў, што сістэму падрыхтоўкі ваенных кадраў неабходна ўдасканаліць. Якім чынам будзеце выконваць пастаўленую Галоўнакамандуючым задачу?***

— Кадры вырашаюць усё. Гэты тэзіс актуальны ва ўсе часы. Не з'яўляецца выключэннем і сістэма забеспячэння ваеннай бяспекі Беларусі. Зроблена вельмі шмат. Мы стварылі нацыянальную школу падрыхтоўкі ваенных кадраў на ўсіх узроўнях. Больш за тое, Беларусь з'яўляецца першай краінай на постсавецкай прасторы, дзе пачалі рыхтаваць ваенных лётчыкаў (сярод дзяржаў, дзе раней такая падрыхтоўка не ажыццяўлялася). Але, як і любая іншая, сістэма ваеннай адукацыі патрабуе пастаяннага ўдасканалення і развіцця. Размова ідзе аб тым, што галоўны прынцып падрыхтоўкі і войскаў, і ваенных кадраў — вучыць таму, што неабходна на вайне. На сучаснай вайне — надзвычай складанай і вельмі часта непрадказальнай.

Невыпадкова кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача сканцэнтраваць асноўныя намаганні на навучанні войскаў сучасным спосабам вядзення ўзброенай барацьбы. У прыватнасці, разгрупаванні баявых дзеянняў аўтаномнымі мабільнымі групамі, здольнымі нанесці праціўніку максімальна непрымальны ўрон. А ў падрыхтоўцы кадраў — на фарміраванні ўменняў і навыкаў практычных дзеянняў па кіраванні воінскімі падраздзяленнямі. Тут неабходна разумець, што, згодна з Ваеннай дактрынай, Беларусь не разглядае ні адну з дзяржаў у якасці праціўніка. Каб не было ворагаў у нашай краіны і надалей, неабходна ўмець абараняць Радзіму. На гэта якраз і накіравана падрыхтоўка войскаў, ваенных кадраў.

***— Чым было абумоўлена прыняцце новай Ваеннай дактрыны?***

— Распрацоўка новай Ваеннай дактрыны, па-першае, была абумоўлена значнымі зменамі ваенна-палітычнага становішча ў свеце і Еўрапейскім рэгіёне, у тым ліку непасрэдна каля межаў Рэспублікі Беларусь, якія адбыліся на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Па-другое, асаблівасцямі сучасных ваенных канфліктаў, характэрнымі рысамі якіх з'яўляюцца змешаныя спосабы ваенных дзеянняў, прымяненне як высокаэфектыўных сістэм высокадакладнай зброі, так і шырокае выкарыстанне нетрадыцыйных формаў прымянення ваеннай сілы, у прыватнасці, рэгулярных узброеных фарміраванняў. Па-трэцяе, з'яўленнем новых выклікаў і пагроз, звязаных з распрацоўкай і актыўным ужываннем на практыцы канцэпцый і механізмаў змены дзяржаўнай улады ў іншых краінах, змены іх канстытуцыйнага ладу і парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці шляхам правакавання ўнутранага ўзброенага канфлікту. Мір, бяспека і згода ў грамадстве — найважнейшыя каштоўнасці беларускага народа. Каб яны былі надзейна абаронены, палажэнні новай Ваеннай дактрыны ўжо рэалізуюцца.

***— Наступны год ва Узброеных Сілах Вы аб'явілі годам якасці...***

— Будаўніцтва і развіццё Узброеных Сіл працягваецца з задачай дасягнення іх новага якаснага стану. Год якасці прадугледжвае дасканалае авалоданне найноўшай тэхнікай і ўзбраеннем, якія паступаюць у беларускую армію, навучанне войскаў самым перспектыўным формам іх баявога прымянення. Асаблівая ўвага будзе нададзена павышэнню якасных паказчыкаў падрыхтоўкі ваенных кадраў. У нас створана айчынная сістэма ваеннай адукацыі: ад тактычнага да стратэгічнага ўзроўню. У цяперашні час ажыццяўляецца працэс яе якаснага ўдасканалення. Прычым галоўная ўвага надаецца практычным пытанням кіравання войскамі, баявой рабоце. У гэтым — залог бяспекі нашай краіны.

**«Згодна з Ваеннай дактрынай, Беларусь не разглядае ні адну з дзяржаў у якасці праціўніка».**

***— Вы не аднойчы адзначалі магутны патэнцыял айчыннага ВПК. А ці складаюць беларускае ўзбраенне і ваенная тэхніка канкурэнцыю аналагічнай прадукцыі замежных вытворцаў?***

— Толькі адзін прыклад. Сёлета беларускія каманды паспяхова выступілі на Міжнародных армейскіх гульнях, у тым ліку ў ходзе «Танкавага біятлону». Нашы танкісты ажыццяўлялі заезды на танках, якія прайшлі мадэрнізацыю ў Беларусі. У прыватнасці, на танку Т-72Б быў устаноўлены прыцэл айчыннай вытворчасці «Сасна-У». У ходзе спаборніцтваў падчас стрэльбаў з узбраення танка роўных беларусам не было. Таму варта аддаць належнае майстэрству нашых экіпажаў, у складзе якіх, дарэчы, былі і салдаты тэрміновай ваеннай службы.

Усё гэта сведчыць аб тым, што тэхніка і ўзбраенне, якія вырабляюцца айчынным ВПК, выкананы на ўзроўні лепшых сусветных стандартаў. Гэта і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання зброяй і войскамі, і оптыка-электронныя сістэмы і прыцэлы, а сёння і ракетная зброя. Прыклад таму — рэактыўная сістэма залпавага агню вялікай далёкасці «Паланэз». Гэтым можна ганарыцца.

***— Міністэрства абароны рэгулярна ажыццяўляе закупку ўзбраення і ваеннай тэхнікі за мяжой. Усё ж ёсць тое, чаго айчынны ВПК не здольны вырабіць сам? Або, каб ісці ў нагу з часам, мы павінны асвойваць і тую тэхніку, якая стаіць на ўзбраенні іншых армій свету?***

— За мяжой мы набываем толькі тыя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі, якія не вырабляе айчынны ваенна-прамысловы комплекс. Сёлета па раней падпісаных кантрактах працягнулася паступленне ў ВПС і войскі СПА вучэбна-баявых самалётаў Як-130, верталётаў Мі-8 МТВ-5, зенітна-ракетнага комплексу «Тор М2» (ужо чатыры батарэі ўзброены гэтымі сістэмамі). У цяперашні час прапрацоўваецца пытанне аб закупцы ў Расіі самалётаў Су-30.

Вайскоўцы ўжо не толькі асвойваюць тэхніку, а і прымяняюць яе ў ходзе баявой вучобы. Лётчыкі 116-й гвардзейскай штурмавой авіяцыйнай базы за кароткі час авалодалі новым самалётам Як-130 і ўжо паспяхова адпрацавалі прымяненне амаль усіх відаў штатнага ўзбраення: авіяцыйных бомбаў, некіруемых авіяцыйных ракет розных калібраў. Упершыню ў гісторыі нашай авіяцыі адпрацавана прымяненне высокадакладнай зброі — авіяцыйных бомбаў КАБ-500Кр. Гэта зброя адрозніваецца высокай дакладнасцю і эфектыўнасцю, патрабуе адпаведнага ўзроўню падрыхтоўкі лётнага складу.

***— Закранаючы адну з гарачых тэм. Не сакрэт, што памяншэнне колькасці прызыўнікоў — наступства дэмаграфічнай сітуацыі 1990-х гадоў, звязанай са спадам нараджальнасці. Ужо дзейнічае Закон «Аб альтэрнатыўнай службе». На Ваш погляд, ці прыжывецца альтэрнатыўная служба ў нашай краіне?***

— Беларусь — прававая дзяржава. У адпаведнасці з Канстытуцыяй парадак праходжання вайсковай службы, падставы і ўмовы вызвалення ад службы або замена яе альтэрнатыўнай вызначаюцца законам. Ён прыняты. Маладым людзям дадзена права праходзіць альтэрнатыўную, гэта значыць неваенную службу. Ці прыжывецца гэты від грамадзянскай службы? Для людзей, якія па рэлігійных перакананнях не могуць трымаць у руках зброю, — цалкам. Але ці шмат такіх у нашай краіне? На цяперашні момант гэта абсалютна мізэрная колькасць грамадзян. Кіраўніцтва ваеннага ведамства не сумняваецца, што абарона Радзімы была, ёсць і будзе святым абавязкам грамадзяніна Беларусі.

***— Любоў да Айчыны прывіваецца з сям'і. Але не кожную беларускую сям'ю сёння можна назваць патрыятычна настроенай. Ці дастаткова патрыятычнае выхаванне наладжана ў школе, ва ўніверсітэце. І ўвогуле, на Вашу думку, быць патрыётам сёння прэстыжна?***

— Больш чым 20-гадовы перыяд стабільнасці і міру ў незалежнай краіне аб'ектыўна паспрыяў зніжэнню пільнасці ў асобных грамадзян, выклікаў ілюзіі, што самыя важныя для народа каштоўнасці — мір і бяспека — дадзены нам раз і назаўсёды. Захаваць гэтыя каштоўнасці без гатоўнасці да ўсенароднай абароны Айчыны, якая пачынаецца з падрыхтоўкі моладзі да вайсковай службы, у сучасных умовах немагчыма.

У цэлым, грамадзяне нашай краіны гатовы абараняць сваю Радзіму, але ёсць і нявырашаныя пытанні. Размова ідзе аб неабходнасці ўдасканалення падрыхтоўкі моладзі да ваеннай службы. Малады чалавек псіхалагічна і фізічна не заўсёды гатовы да яе. Чаму так адбываецца? Адна з прычын у тым, што ў цяперашні час дапрызыўная падрыхтоўка недастаткова эфектыўная. Прычым большасць выкладчыкаў не маюць неабходнай кваліфікацыі, не служылі ў арміі і нават не ўяўляюць, што такое вайсковая служба. Адносна невялікі працэнт ваеннаслужачых запасу, якія выкладаюць дапрызыўную падрыхтоўку, абумоўлены невысокім статусам гэтай пасады для былога вайскоўца.

Ваенным ведамствам прапрацоўваецца пытанне ўдасканалення дапрызыўнай падрыхтоўкі. Для гэтага неабходна ўнесці адпаведныя змены ў навучальныя праграмы, прыняць меры па прыцягненні да дапрызыўнай падрыхтоўкі афіцэраў запасу, павысіўшы іх службовы аклад шляхам уліку выслугі ў выкладчыцкім стажы. У перспектыве цалкам рэальна ўкамплектаваць на ўсе 100% пасады выкладчыкаў афіцэрамі запасу альбо тымі, хто прайшоў спецыяльную падрыхтоўку на базе Ваеннай акадэміі. Па ініцыятыве Міністэрства абароны пытанне дэталёва аналізуецца зацікаўленымі органамі дзяржаўнага кіравання. Калі мы адчуваем праблему, то робім усё для таго, каб яе вырашыць.

***— Усё часцей непакоіць нестабільная абстаноўка ў свеце. Падчас калегіі міністэрстваў абароны Беларусі і Расіі, якая нядаўна адбылася ў Мінску, Сяргей Шайгу звярнуў увагу на ўмацаванне дзейнасці НАТА паблізу межаў Саюзнай дзяржавы. Ці можа беларуская армія служыць гарантам бяспекі хоць бы для жыхароў нашай краіны?***

— Яна ўжо служыць і рэальна забяспечвае бяспеку краіны, мірную працу беларускага народа, выконвае задачы па абароне Саюзнай дзяржавы. Для гэтага ажыццяўляецца рэалізацыя новай Ваеннай дактрыны, праводзіцца глыбокая мадэрнізацыя Узброеных Сіл, якія аснашчаюцца самай сучаснай тэхнікай і ўзбраеннем, ажыццяўляецца эфектыўнае ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва з Расіяй, дзяржавамі АДКБ. Усё гэта ў сукупнасці з паслядоўным шматвектарным знешнепалітычным курсам нашай дзяржавы, несумненна, будзе спрыяць далейшаму ўмацаванню бяспекі, а таксама падтрыманню міру і стабільнасці ў краіне.

***— 23 лютага — якраз у Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі — споўніцца шэсць гадоў сумеснаму праекту рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны «Плацдарм». Як ацэньваеце сумесны праект? Наколькі ён, на Ваш погляд, аб'ектыўна адлюстроўвае развіццё і будаўніцтва Узброеных Сіл?***

— Дзякуючы працы таленавітых і высокапрафесійных супрацоўнікаў газеты «Звязда» штомесячны спецвыпуск «Плацдарма» чакаюць не толькі ваеннаслужачыя і ветэраны, але і прызыўнікі, іх родныя і блізкія, тыя, хто ўжо адслужыў, хто марыць аб прафесіі вайскоўца. Важная і дакладная інфармацыя аб сучаснай беларускай арміі, якая падаецца на старонках выдання, становіцца здабыткам грамадскасці, што ў поўнай меры садзейнічае вырашэнню сумесных задач па ўмацаванні бяспекі Рэспублікі Беларусь, павышэнню маральнага духу беларускага народа, патрыятычнаму выхаванню грамадзян краіны. Я ўдзячны карэспандэнтам «Звязды», якія шчыра цікавяцца працэсамі, што адбываюцца ў войску, не баяцца складаных тэм, камандзіровак у аддаленыя гарнізоны, за прафесіяналізм і журналісцкае майстэрства, жывыя і цікавыя рэпартажы, актыўную грамадзянскую пазіцыю. Упэўнены, што пастаяннае плённае супрацоўніцтва будзе працягвацца і далей.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

## Па закліку сэрца

# ВАЛАНЦЁРЫ БЕЗ МЕЖАЎ

## У сталіцы ўзнагародзілі найлепшых і расказалі пра перспектывы руху

**Дарослае жыццё добрым справам не замінае, упэўнена камандзір валанцёрскага атрада «Сэрца Паліміра», інжынер па наглядзе за машынным абсталяваннем завода «Палімір» ААТ «Нафтан» Юлія ВЕКА. Дзяўчына разам з сябрамі-валанцёрамі стала пераможцай традыцыйнага рэспубліканскага конкурсу «Валанцёр года — Добрае Сэрца» ў намінацыі «Найлепшы валанцёрскі атрад сярод працоўнай моладзі». Форум правводзіў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.**

— Наш атрад аказвае дапамогу людзям сталага ўзросту, ветэранам, дзецям-інвалідам і дзецям-сіротам, — кажа Юлія. — Мы ўдзельнічаем у самых розных дабрачынных мерапрыемствах, напрыклад, у акцыі «У школу з Добрым Сэрцам», падчас якой зарабляем грошы для таго, каб падрыхтаваць да навучальнага года дзетак, сем'ям якіх патрабуецца матэрыяльная дапамога. Ці не замінае гэта асноўнай рабоце? Ні ў якім разе, гэта не так цяжка, як можа падавацца. Асабіста мне валанцёрскі рух прыносіць вялікае задавальненне, у першую чаргу таму, што я адчуваю зваротную рэакцыю ад людзей, якім мы дапамаглі. Гэта можа быць слова, а, можа, проста ўдзячны позірк.

Паводле слоў **сакратара Цэнтральнага камітэта БРСМ, каардынатара руху «Добрае Сэрца» Вікторыі МЯНАНАВАЙ**, гэты кірунак дзейнасці арганізацыі аб'ядноўвае больш як 34 тысячы юнакоў і дзяўчат у складзе больш як 1 300 атрадаў па ўсёй Беларусі. На яе думку, самае важнае для любога ўдзельніка — жаданне быць добраахвотнікам і неабыякавасць да чужых праблем.

— Валанцёрскі рух сёння кансалідуе грамадства, — адзначыла Вікторыя Мянанава. — Мы сёння гатовы супрацоўнічаць з маладзёжнымі валанцёрскімі арганізацыямі не толькі на тэрыторыі Беларусі, але выходзім і за межы нашай краіны.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Апроч іншых узнагароджаных падзяку за асабісты ўклад у развіццё валанцёрскага руху атрымалі і журналісты «Звязды»: рэдактар аддзела навін і рэпартажаў Сяргей РАСОЛЬКА і рэдактар аддзела адукацыі Надзея НІКАЛАЕВА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4»** г. Барановичи, ул. Тельмана, 100 |

**Предмет аукциона**

**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Тельмана, 100/1**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Контора гаражного хозяйства** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 893,8 кв.м | 110/С-6935 |
| **Асфальтовое покрытие территории** | Сооружение специализированное транспорта | 6851 кв.м | 110/С-112512 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 141000000001004013, общ. пл. 0,8198 га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания конторы гаражного хозяйства |
| **Обременения** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона **www.cpo.by** |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **359 524,91 белорусских рублей (BYN) 3 595 249 100 белорусских рублей (BYR) Снижена на 20%** |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 17.11.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **22.12.2016 г. в 14.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Тельмана, 100, актовый зал, ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **21.12.2016 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Утерянные печать и свидетельство о государственной регистрации Частного производственного унитарного предприятия «ПРОМ-ЛИГО», УНП 190597958, юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Уборевича, д. 18, кв. 48, **считать недействительными.**

Дзяржава для народа
Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў
7 снежня 2016 г.
№ 20 (383)



ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## ЕЎРОПА — АГУЛЬНЫ ДОМ

### Польскія рэгіёны цяпер будуць больш кантактаваць з беларускімі

**Словазлучэнне «форум рэгіёнаў» ужо традыцыйна асацыюецца з канкрэтнымі бізнес-праектамі, якія ажыццяўляюцца ў Беларусі і Расіі, з мерапрыемствам, якое паспяхова ладзіцца вось ужо трэці год запар. Пакуль такая форма супрацоўніцтва была ўнікальнай для абедзвюх краін. Аднак на гэтым тыдні Беларусь і Польшча дамовіліся аб падобным наладжванні двухбаковых адносін.**

«Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, падтрымаў вашу прапанову па правядзенні Форуму рэгіёнаў (Беларусі і Польшчы. — **«Зв.»**)», — заявіў **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі,** звяртаючыся да **Станіслава КАРЧЭЎСКАГА, Маршала Сената Рэспублікі Польшча,** падчас двухбаковай сустрэчы. Па словах спікера верхняй палаты беларускага парламента, на цяперашні момант дзейнічае 65 дагавораў аб партнёрскім супрацоўніцтве паміж Польшчай і Беларуссю. «І трэба было б гэтыя пытанні актывізаваць, каб яны насілі канструктыўны характар, — дадаў ён. — Нам трэба глядзець у будучыню і фарміраваць ясныя перспектывы. Прыярытэты для нас — гэта інвестыцыйнае супрацоўніцтва, глыбокая мадэрнізацыя пытанняў энергетыкі, інфраструктуры, культурных кантактаў».

«Нам хацелася б, каб перспектыўнае ўзаемадзеянне беларускіх і польскіх парламентарыяў аказвала пазітыўны ўплыў на развіццё кантактаў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з парламентамі ўсіх краін — членаў Еўрапейскага саюза», — заявіў беларускі сенатар. Пры гэтым Старшыня Савета Рэспублікі дадаў, што Еўропа — агульны дом, за бяспеку і дабрабыт якога мы нясём агульную адказнасць.

## КАНКРЭТНАЯ НАГРУЗКА ДЛЯ САВЕТА

**Падчас чарговага пасяджэння сесіі верхняй палаты беларускага парламента было разгледжана восем пытанняў, адно з якіх — выбар складу Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.**

«Мы ўсе ведаем, наколькі важна ўзаемадзеянне ў краіне не толькі на рэспубліканскім узроўні, але і па ўсіх вертыкалях і гарызанталі ўлады. Вядома, асноўныя задачы становяцца менавіта перад мясцовымі органамі кіравання і самакіравання», — адзначыла **Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі.**

**Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні** нагадаў, што Савет па ўзаемадзеянні быў створаны ў 2007 годзе. Але «жыццё віруе, жыццё змяняецца», таму на сённяшнім этапе развіцця ён мае патрэбу ў грунтоўным аднаўленні. «Павінна быць дакладная скаардынаванасць усіх нашых дзеянняў па рашэннях пытанняў і рэгіянальнай палітыкі, і мясцовага самакіравання», — лічыць ён.

У Савет уваходзяць каля 40 чалавек, узначальвае яго **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** Аляксандр Папкоў ад імя камісіі прапанаваў, каб у Савет па ўзаемадзеянні ўвайшлі старшыні абласных Саветаў дэпутатаў, а таксама з кожнай вобласці адзін раён і адзін сельскі Савет. «Мы лічым, што Савет па ўзаемадзеянні павінен несці канкрэтную нагрузку, разглядаць найбольш набалелыя пытанні, з якімі сутыкаецца наша грамадства. Самае галоўнае — нам варта падумаць аб тым, якім чынам стварыць умовы, каб мясцовае самакіраванне валодала ўсім неабходным для вырашэння праблем жыццезабеспячэння канкрэтнага чалавека і рэалізоўвала палітыку дзяржавы для народа», — пераканаіы парламентарый.

Падчас пасяджэння таксама былі абраны намеснікі старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Імі сталі **Ігар ЖУК, Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, Мікалай РАДАМАН.**

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ДБАЦЬ ПРА ІНШЫХ

# ...І САНАТОРЫЙ ДОМА

### Сацыяльны работнік у раёне незаменны



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**«Ведаеце, да нас цяпер пераходзяць працаваць з сельскай гаспадаркі, — расказвае дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ушацкага раёна Алеся ХВАШЧЭЎСКАЯ. — Там работы няма, а ў нас заробкі хоць і невялікія, затое рэгулярныя. Ёсць у нас і маладыя супрацоўнікі, і тыя, хто ў прафесіі па 15—20 гадоў. Мы сваіх спецыялістаў стараемся падтрымліваць, найбольш старанным выпісваем прэміі».**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «МС».)*

УЛАДА Ў АСОБАХ

# СІЛА АЎТАРЫТЭТУ МЯСЦОВАГА САВЕТА



**Саветы дэпутатаў — самая блізкая да народа ўлада. Ад таго, наколькі эфектыўна яны працуюць, людзі судзяць аб сістэме дзяржаўнага кіравання ў цэлым. Як павысіць эфектыўнасць работы Саветаў і іх аўтарытэт, як зрабіць больш важкім іх удзел у паляпшэнні жыццезабеспячэння насельніцтва, расказаў першы госць нашай рубрыкі «Улада ў асобах», старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар ЖУК.**

***— Ігар Георгіевіч, органы мясцовага самакіравання на Гродзеншчыне актыўна працуюць, вырашаюць многія надзённыя праблемы людзей. Дэпутаты зацвярджаюць планы сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэт рэгіёна і такім чынам уплываюць на вырашэнне пытанняў эканомікі і сацыяльнай сферы. Якія надзённыя пытанні падымаліся дэпутацкім корпусам вобласці сёлета?***

— Штомесяц на сесіях абласнога Савета дэпутатаў мы разглядалі пытанні, якія рэгламентуюць сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці, зацвярджалі бюджэт, інвестыцыйную праграму, прагнозныя паказчыкі... Напрыклад, абмяркоўвалі разам з педагогамі, як у нас рэалізуецца дзяржаўная праграма развіцця адукацыі, папярэдне наведаўшы ўстановы агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі і прафтэхадукацыі. У выніку прынялі рашэнні, якія, на наш погляд, павінны садзейнічаць далейшаму працэсу аптымізацыі сістэмы адукацыі ў вобласці. У поле зроку дэпутатаў аблсавета — работа органаў кіравання і самакіравання па рэалізацыі Дырэктывы Прэзідэнта Беларусі №1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны». На чарговай сесіі прааналізавалі, як пабудавана работа ў вобласці, ці ёсць пазітыўныя зрухі. А яны сапраўды ёсць. З кожным годам гіне менш людзей, паляпшаецца працоўная дысцыпліна. Не пакінулі без увагі і такія праблемы: гібель людзей на вытворчасці, пажары, асабліва ў сельскай мясцовасці, работу з адзінокімі, пенсіянерамі, з асацыяльнымі элементамі, са шматдзетнымі сем'ямі.

Кіраўніком дзяржавы і ўрадам надаецца вялікая ўвага выкарыстанню аб'ектаў нерухомасці дзяржаўнымі арганізацыямі і гаспадарчымі суб'ектамі з доляй дзяржавы. Выязную сесію аблсавета на базе Мастоўскага раёна мы правялі разам з семінарам для старшыняў раённых Саветаў дэпутатаў — агучылі асноўныя моманты работы ў гэтым кірунку. Паказалі, наколькі эфектыўна працуе Мастоўскі раён. Узнялі праблемы, з якімі сутыкаюцца мясцовыя органы ўлады па ўключэнні ў гаспадарчы абарот і эфектыўным выкарыстанні дзяржаўнай маёмасці, пустуючых вытворчых плошчаў.

> Ёсць такія прыклады, калі жыхары мікрараёна за свае сродкі аднавілі спартыўныя пляцоўкі, пасадзілі кветкі і кусты, добраўпарадкавалі зялёныя зоны. Усё гэта варта пераймання.

У выніку прыняты рашэнні, якія дапамогуць дабіцца больш значных вынікаў. На апошняй сесіі абласнога Савета дэпутатаў, якая праходзіла 23 лістапада, тэмай абмеркавання стала работа органаў мясцовага кіравання і самакіравання па пытаннях інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці, імпартазамяшчэння і рэалізацыі палажэнняў Дэкрэта №6 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «МС».)*

БЕЗ МЕЖАЎ

# ДОМ ПАД ПАРЫЖАМ

## Кантракт на пастаўку 70 драўляных будынкаў падпісалі беларуская і французская кампаніі

**Міжрэгіянальныя сувязі паміж Беларуссю і Францыяй шырацца. Так, плануецца падпісаць пабрацімскае пагадненне паміж Мінскай вобласцю і рэгіёнам Верхняя Францыя. Пра гэта паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Францыі Павел ЛАТУШКА на I Беларуска-французскім міжрэгіянальным форуме, які адбыўся на мінулым тыдні ў Мінску.**

Французскія бізнесмены прыехалі ў беларускую сталіцу, каб ацаніць інвестыцыйны патэнцыял краіны. Яны наведалі шэраг прадпрыемстваў і правялі сустрэчы з прадстаўнікамі міністэрстваў. Адным з практычных вынікаў форуму стала падпісанне кантракта паміж Шклоўскім заводам газетнай паперы і французскай кампаніяй «Logibat» аб пастаўцы 70 драўляных дамоў. Гэта працяг супрацоўніцтва, якое ўжо існуе паміж краінамі. «Фактычна ў Францыі з'яўляюцца беларускія вёскі, вуліцы маленькія гарады. Я перакананы, што гэта вельмі перспектыўны від дзейнасці», — падкрэсліў пасол.

Акрамя гэтага, плануецца развіваць узаемадзеянне ў сферах турызму і аховы навакольнага асяроддзя. Для гэтага будуць створаны дзве рабочыя групы па адпаведных пытаннях. Павел Латушка адзначыў і іншыя напрамкі партнёрства:

— Мы пашыраем двухбаковую дагаворна-прававую базу супрацоўніцтва. І за апошнія два-тры гады падпісалі некалькі пагадненняў, у тым ліку па эканоміцы і транспарце. Важным напрамкам з'яўляюцца міжрэгіянальныя сувязі, і прыярытэт тут — пабрацімства. Вядома, добры прыклад — Мінск і Ліён. Значна актывізаваліся за апошнія тры гады кантакты паміж Гомелем і Клермон-Феранам. Рэгулярна праходзяць візіты як мэраў, так і дзелавых колаў, праводзяцца сумесныя культурныя праекты. Аднаўлены адносіны паміж Цэнтральным раёнам горада Мінска і горадам Неверам. Усталяваныя кантакты паміж двума Брэстамі — гэта пэўны сімвал нашага супрацоўніцтва. Летась было падпісана пагадненне паміж Партызанскім раёнам горада Мінска і Туркуэнам. Я перакананы, што ўсё гэта дасць эканамічны вынік і адаб'ецца на развіцці адносін паміж нашымі краінамі.

За апошнія чатыры гады Пасольства Беларусі ў Францыі арганізавала 35 прэзентацый інвестыцыйных магчымасцей нашай краіны і наладзіла супрацоўніцтва практычна з усімі эканамічнымі цэнтрамі Францыі. Як вынік — на бізнес-форум у сталіцу прыехала каля сарака прадпрымальнікаў з сямі французскіх рэгіёнаў. Сустрэчу сімвалічна прымеркавалі да 40-годдзя ўсталявання пабрацімскіх сувязей паміж Мінскам і Ліёнам. На форуме быў прадстаўлены даволі шырокі спектр накірункаў патэнцыяльнага эканамічнага супрацоўніцтва: машынабудаванне, лёгкая прамысловасць, вырошчванне і перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі, інжынірынг буйных будаўнічых аб'ектаў, кансалтынгавыя і юрыдычныя паслугі, ахова здароўя, энергетыка.

Цікава, што да форуму ў Мінску далучыўся і шэраг іспанскіх кампаній: яны ўбачылі патэнцыял у развіцці такога супрацоўніцтва. **Намеснік міністра эканомікі Беларусі Ірына КАСЦЕВІЧ** расказала, чаму наша краіна становіцца больш інвестыцыйна прывабнай у свеце:

— Сёння паміж Беларуссю і Францыяй заключана 20 пагадненняў. У апошнія гады ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны адбыліся відавочныя пазітыўныя змены ў сферы правілаў вядзення бізнесу: паляпшэнне дзелавога клімату і інвестыцыйнай прывабнасці. Беларусь займае пятае месца сярод 190 краін свету па колькасці праведзеных рэформаў ва ўсіх сферах прадпрымальніцкай дзейнасці. Яна прызнана адным з вядучых рэфарматараў у свеце. Па рэйтынгу «Вядзенне бізнесу-2017» мы занялі 37-е месца, прасунуўшыся за год на 13 пазіцый. І гэта, на наш погляд, вынік сур'ёзнай работы краіны ў гэтым напрамку.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

СЯБРУЕМ РЭГІЁНАМІ

# ЁСЦЬ КАНТАКТ!

**Амаль 60 % аб'ёму знешнегандлёвых аперацый прадпрыемстваў Гомельшчыны прыпадае на Расію. Эканамічна наша вобласць злучана з 75 яе суб'ектамі ва ўсіх федэральных акругах. Гэтыя сувязі найбольш цесныя з Маскоўскай і Бранскай абласцямі, а таксама з самой сталіцай Расіі.**

З Гомельскай вобласці ў Расійскую Федэрацыю пастаўляюцца чорныя металы і вырабы з іх, сельскагаспадарчая тэхніка, малочная прадукцыя, вырабы з пластмасы і шмат чаго яшчэ.

**Начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва камітэта эканомікі Гомельскага аблвыканкама Ірына ДАВЫДЗЕНКА** гаворыць, што цяпер у Расійскай Федэрацыі дзейнічае пяць уласных суб'ектаў тавараправоднай сеткі гомельскіх прадпрыемстваў мяса-малочнай галіны. Аб'ёмы паставак прадукцыі за першае паўгоддзе на адрас уласных крам павысіліся практычна ўдвая:

— Акрамя таго, прадпрыемствы мяса-малочнай галіны маюць дыстрыб'ютараў у 12 рэгіёнах Расійскай Федэрацыі. Малочная прадукцыя пастаўляецца ў 15, а ялавічына і каўбасныя вырабы — у 17. Паміж Гомельскай вобласцю і расійскімі рэгіёнамі складзена 26 дагавораў аб гандлёва-эканамічным і навукова-культурным супрацоўніцтве. 80 дамоўленасцяў пра партнёрскія і пабрацімскія сувязі рэалізуюцца гарадамі і раёнамі вобласці з адпаведнымі адміністрацыйнымі расійскімі ўтварэннямі.

Больш за 10 гадоў ажыццяўляецца міжрэгіянальнае супрацоўніцтва паміж Жлобінскім раёнам і Выксунскім муніцыпальным раёнам Ніжагародскай вобласці. У горадзе Выкса працуе гандлёвы цэнтр «Жлобінскі кірмаш». На яго першым паверсе прадстаўлены беларускія прадукты харчавання, а на другім — прамысловыя тавары. Сваю прадукцыю сюды пастаўляюць не толькі Жлобінскі мясакамбінат, але і іншыя прадпрыемствы. Расіяне з задавальненнем набываюць мужчынскія касцюмы ад гомельскай фабрыкі «Камінтэрн», кашулі ад мазырскай «Надэкс», штучнае футра ад «Белфа», дзіцячае адзенне ад Жлобінскай швейнай фабрыкі і шмат чаго яшчэ...

Партнёрскія адносіны паміж Гомельскай вобласцю і паўднёва-заходняй акругай сталіцы Расіі актыўна развіваюцца на працягу апошніх дзесяці гадоў. Адным з вынікаў гэтага ўзаемадзеяння ў межах рэалізацыі дагавора аб эканамічным, навукова-тэхнічным і сацыяльна-культурным супрацоўніцтве стала ўладкаванне на тэрыторыі Савецкага раёна Гомеля праекта «Маскоўскі дворык», а ў раёне Новыя Чаромушкі — праекта «Беларускі дворык».

Апошні ўпрыгожвае скульптурная кампазіцыя, у якой ёсць месца фантану, а таксама зубру, буслам, вожыкам і жабкам. Гомельскі скульптар Дзмітрый Папоў паклапаціўся, каб па перыметры была выкладзена плітка з беларускім арнаментам і ўсталяваны лаўкі вытворчасці гомельскага ліцейнага завода «Цэнтраліт». Пра паходжанне



дворыка нагадваюць таксама выявы гербаў Гомеля і Гомельскай вобласці. На тэрыторыі добраўпарадкаваныя спартыўная і дзіцячая пляцоўкі з арэлямі, трэнажорамі, пясочніцамі і дэкаратыўнымі ліхтарамі.

Ну а ў падарунак гамяльчанам расіяне зрабілі ў Гомелі прыгожы і сучасны «Маскоўскі дворык». За кошт прэфектуры Паўднёва-заходняй акругі Масквы ў двары па вуліцы Бочкіна абсталяваны спортпляцоўкі са спецыяльным пакрыццём, дзіцячыя пляцоўкі з гульнявым абсталяваннем, усталяваны лаўкі, абноўлена хакейная пляцоўка, разбіты новыя газоны...

Дагавор аб эканамічным, навукова-тэхнічным і сацыяльна-культурным супрацоўніцтве паміж Гомельскім аблвыканкамам і Адміністрацыяй Бранскай вобласці падпісаны сёлета ў жніўні. На тэрыторыі гэтага расійскага рэгіёна дзейнічае сумеснае прадпрыемства па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі — закрытае акцыянернае таварыства «Брансксельмаш». Цяпер тут арганізаваны ўчасткі зваркі, афарбоўкі, механічнай апрацоўкі... Спецыялісты сумеснага прадпрыемства разам з Гомсельмашам займаюцца вытворчасцю і рэалізацыяй сельскагаспадарчай тэхнікі і запасных частак, а таксама сэрвісным абслугоўваннем. На прадпрыемстве адбываецца зборка сямі мадэляў камбайнаў, якія прайшлі выпрабаванні і маюць усе неабходныя сертыфікаты Расійскай Федэрацыі.

Развіваюцца прамыя партнёрскія кантакты і паміж адукацыйнымі ўстановамі Масквы і Гомельскай вобласці. Так, школа № 1368 Масквы і Рэчыцкі раённы ліцэй падпісалі дагаворы аб супрацоўніцтве. Аналагічныя існуюць паміж Гомельскім абласным ліцэем і Цэнтрам адукацыі «Школа здароўя» № 46 Масквы, а таксама паміж школай № 191 сталіцы Расіі і гімназіяй № 51 Гомеля.

Актыўна развіваецца супрацоўніцтва ў сферы спорту, турызму і культуры. Сёлета літаратурныя відэамасты звязвалі Гомель з Масквой. На іх абмяркоўвалася, у тым ліку, творчасць дзіцячых пісьменнікаў Гомельшчыны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# УЗАКОНІЦЬ «ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ»,

## або Чаму неабходна абараніць жывёл «дакументальна»

**Ужо не першы год ідзе работа над праектам закона «Аб абыходжанні з жывёламі». Гэтай вясной ён выносіўся на грамадскае абмеркаванне.**

Свой пункт гледжання выказалі як самі заканатворцы, так і прадстаўнікі зацікаўленых дзяржаўных структур, грамадскія арганізацыі, звычайныя людзі. Зараз дакумент рыхтуецца да першага чытання і па-ранейшаму з'яўляецца адным з самых абмяркоўваемых... Карэспандэнт «МС» пацікавіўся ў дэпутата Палаты прадстаўнікоў і ў прадстаўнікі мясцовых улад, наколькі актуальны гэты законапраект сёння.

### Чакаем вясенняй сесіі

— Ёсць людзі, якія паважаюць нашых братоў меншых, а ёсць такія, што адносяцца да іх абыякава, — адзначае **Юрый ДАРАГАКУПЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.** — Адбылося грамадскае абмеркаванне гэтага законапраекта. Адпаведна, палова людзей выказалася «за» яго, другая палова — супраць. Трэба знайсці нейкі парытэт. Зараз з Савета Міністраў да нас ізноў паступіў дапрацаваны варыянт. Нашы пастаянныя камісіі, некаторыя дзяржаўныя органы аналізуюць яго. Мы атрымліваем ад іх прапановы, заўвагі, дапаўненні. У хуткім часе пройдзе пасяджэнне нашай Пастаяннай камісіі і мы разгледзім дадзены законапраект, паколькі большасць прапаноў ужо паступіла. Вельмі спадзяюся, што да вясенняй сесіі дакумент мы ўсё-такі падрыхтуем.

Парламентарый падкрэсліў, што зараз няма закона аб абыходжанні з жывёламі.



— Ёсць правілы іх утрымання, зацверджаныя Мінжылкамгасам, — звяртае ўвагу старшыня Пастаяннай камісіі. — Але настаў час на законным узроўні разгледзець гэтую праблему. Непрыемна ж, калі ідзе чалавек з сабакам-догам, а жывёла — без намордніка, а часам — і без павадка. Гэта небяспечна. Трэба ўзаконіць «правілы гульні». Але ўласнікі жывёл прытрымліваюцца іншага пункту гледжання. Маўляў, чаму сабака, іншая жывёла не можа мець свабоды? Але ж у нас мясцовымі ўладамі вызначаны месцы для выгулу сабак. Ёсць пытанні і па колькасці ўтрымання жывёл у кватэры.

### Сабака проста так не гаўкае

У законапраекце прадугледжана, што ўласнік сабакі павінен прымаць меры да таго, каб жывёла паводзіла сябе спакойна, не парушала цішыні. Сабака проста так не гаўкае.

Што да адказнасці за няправільнае абыходжанне з братамі меншымі, то, як праінфармаваў Юрый Дарагакупец, будзе прымяняцца і адміністрацыйная адказнасць, і крымінальная...

— Для ўсяго гэтага надышоў час, — упэўнены суразмоўца. — У законапраекце разглядаецца не толькі абыходжанне са свойскімі жывёламі, але і з тымі, якія ўтрымліваюцца ў заапарках, цырках. Мы самі цудоўна павінны разумець, што адказныя за сваіх маленькіх (і не вельмі) сяброў.

### Звычайна жывёла не вінавата

Карэспандэнт «Мясцовага самакіравання» вырашыла даведацца, наконт якіх момантаў па ўтрыманні жывёл, клапоцяцца мясцовыя ўлады. **Віталь ЧЭХ, старшыня Беражноўскага сельскага Савета дэпутатаў (Столінскі раён Брэсцкай вобласці),** расказаў, што частая прычына спрэчкі паміж суседзямі на вёсцы — калі нечая жывёла зайшла ў агарод і нашкодзіла...

— Трэба патрабаваць больш адказнасці ад гаспадароў жывёл, — лічыць Віталь Чэх. — Я ведаю, што на Захадзе ў гэтым плане вельмі шмат санкцый — там за любую шкоду, якую прычыніла твая жывёла іншаму чалавеку, прыйдзецца адказваць. А ў нас у асноўным усё пушчана на самацёк. Трэба зрабіць заканадаўства ў гэтым плане больш жорсткім.

— Хацелася б, каб больш простай была сістэма разбіральніцтва з падобнымі справамі, каб гэтыя пратаколы разглядаліся не толькі судом, бо суды можна «заваліць» усімі гэтымі скаргамі, — прапануе Віталь Анатольевіч. — Было б лепш, каб нейкая камісія працавала на месцах, каб той жа старшыня сельскага выканаўчага камітэта без удзелу мог скласці гэты пратакол і прыняць нейкія меры. Мы ўвесь час мірым тых жа суседзяў. Але многа спраў праходзіць і праз суд. Нядаўна ў нас быў выпадак, калі сабака пагрыз суседскіх курэй. Аднаму суседу гаспадар сабакі заплаціў, а другая суседка пакрыўдзілася і падала на яго ў суд...

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# СІЛА АЎТАРЫТЭТУ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

**— Якія пытанні ні разглядалі б дэпутаты, іх галоўная мэта, галоўны «аб'ект» клопату — гэта чалавек, яго патрэбы...**

— На пасяджэннях прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў мы разгледзелі шэраг важных пытанняў, якія тычацца патрэб людзей і развіцця тэрыторыі. Напрыклад, у Мастоўскім раёне з запрашэннем старшыняў раённых Саветаў дэпутатаў абмеркавалі, як у вобласці выконваецца Дзяржаўная праграма па водазабеспячэнні і водаадвядзенні «Чыстая вада». З-за недахопу фінансавання праграма выканана не ў поўным аб'ёме, але, тым не менш, атрымалася расставіць прыярытэты: што трэба зрабіць, каб людзі не адчувалі недахопу ў якаснай пітной вадзе.

У Зэльвенскім раёне гаворка ішла аб рэалізацыі ў вобласці Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустых і старых дамоў у сельскай мясцовасці». У Зэльвенскім раёне, дзе за апошнія гады знесена шмат старых пустых дамоў і ўключана ў гаспадарчы абарот маёмасць, якая раней не выкарыстоўвалася, паказалі ўсім удзельнікам пасяджэння, як трэба працаваць з пустуючым жыллём, з уласнікамі, як уключаць у сельскагаспадарчы абарот землі. Паглядзелі, як працуюць мясцовыя Саветы дэпутатаў па навядзенні парадку ў сельскіх населеных пунктах, на могілках. Я лічу, што і мясцовыя жыхары не павінны заставацца ўбаку — яны могуць уносіць свой пасільны ўклад у навядзенне парадку на зямлі.

> Старшыня сельвыканкама павінен мець аўтарытэт, адпаведныя паўнамоцтвы, матэрыяльны і маральны рэсурс для вырашэння надзённых пытанняў.



У Гродзенскім дзяржуніверсітэце імя Янкі Купалы.

У Гродне з запрашэннем членаў створанай у мінулым годзе абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў абмеркавалі работу органаў тэрытарыяльна-грамадскага самакіравання і меры па павышэнні эфектыўнасці іх дзейнасці. У горадзе ёсць што паказаць, ёсць прыклады таго, як мясцовыя органы ўлады супрацоўнічаюць з грамадскасцю, як наводзіцца парадак у дварах, у тым ліку і пры ўдзеле саміх жыхароў. Мы імкнёмся больш шырока ўключаць людзей у працу па добраўпарадкаванні тэрыторый. Людзі павінны разумець, што ад іх таксама шмат што залежыць. Ёсць такія прыклады, калі жыхары мікрараёна за свае сродкі аднавілі спартыўныя пляцоўкі, пасадзілі кветкі і кусты, добраўпарадкавалі зялёныя зоны. Усё гэта варта пераймання.

У полі зроку абласнога Савета — і развіццё турызму на Гродзеншчыне. Як выконваецца абласная праграма развіцця турызму, паказвалі на базе Гродзенскага раёна. Тут вельмі вялікі патэнцыял, усё больш турыстаў прыцягвае наша жамчужына — Аўгустоўскі канал. Указ Прэзідэнта Беларусі значна спрасціў наведванне канала замежнымі турыстамі. Разгледзелі і пытанні развіцця агратурызму. Людзі зразумелі, што гэта выгадны бізнес, істотная таксама і дапамога дзяржавы. Са спрашчэннем візавага рэжыму агратурыстычны кампанент будзе развівацца сямімільнымі крокамі. Тут трэба фарміраваць адпаведную інфраструктуру, прыцягваць прыватны бізнес.

**— А якая роля сельскіх Саветаў, які іх уклад у вырашэнне пытанняў у рэгіёнах?**

— Адна з асноўных задач абласнога Савета дэпутатаў — каардынацыя работы Саветаў базавага ўзроўню — раённых і сельскіх. Мы павінны быць адзіныя, без выразнай каардынацыі нічога вырашыць немагчыма. Сельскія Саветы нярэдка становяцца ініцыятарамі новых спраў. У Навагрудскім раёне яны не проста бяруць удзел у праграмах трансгранічнага супрацоўніцтва, праектах міжнароднай тэхнічнай дапамогі ПРААН, але і ініцыявалі гэтае супрацоўніцтва. Многія сельскія Саветы ўжо асвоіліся ў новай для сябе справе і атрымалі гранты. Няхай яны і не такія вялікія ў грашовым вымярэнні, але гэтыя сродкі накіроўваюцца на рэалізацыю канкрэтных праектаў: добраўпарадкаванне вёсак, прывядзенне ў парадак могілак, стварэнне аб'ектаў турыстычнай інфраструктуры, рэканструкцыю музеяў, пракладку веладарожак... Людзі бачаць, што сельвыканкамы прыцягнулі дадатковыя грошы, а не папрасілі выдзеліць іх з бюджэту. Так павышаецца імідж мясцовай улады. Яскравы прыклад: Любчанскі пасялковы Савет выступіў з ініцыятывай і выйграў грант на ўстаноўку ў гарадскім пасёлку дыёднага асвятлення. Мясцовыя жыхары задаволены, ёсць эканамічны эфект. І такіх ініцыятыў шмат... Тут у нас вялікі патэнцыял, таму абласны Савет сумесна з абласной установай фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў і рэгіянальнымі прадстаўнікамі праграм ПРААН правёў семінар для старшыняў раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў.



Прыём грамадзян.



Падчас абласных «Дажынак».

**— Сёння абмяркоўваецца праблема аптымізацыі сельсаветаў, іх аб'яднання. Як вы да гэтага ставіцеся?**

— Мы ідзём не рэвалюцыйным, а эвалюцыйным шляхам. Кожны год з улікам змянення дэмаграфічнай сітуацыі, сацыяльна-эканамічнай структуры канкрэтнага раёна аптымізуем, прасцей кажучы, скарачаем колькасць сельсаветаў шляхам аб'яднання іх з іншымі. У гэтым годзе скарацілі чатыры. Пакуль у нас каля 20 сельсаветаў, дзе колькасць жыхароў даходзіць да тысячы чалавек. Аптымізацыя праводзіцца не дзеля аптымізацыі. На першае месца ставяцца інтарэсы людзей. Працуем з насельніцтвам, каб людзі не засталіся па-за ўвагай, маглі звярнуцца да кіраўніка мясцовага Савета і без праблем вырашыць адміністрацыйныя працэдуры.

**— Ці дастаткова сельскім Саветам паўнамоцтваў, каб дапамагаць людзям у вырашэнні жыццёвых праблем? Часам у людзей узнікае пытанне: а ці патрэбныя ўвогуле дэпутаты сельскіх Саветаў?**

— Я праводжу маніторынг меркаванняў сярод дэпутатаў рознага ўзроўню, размаўляю са старшынямі сельскіх Саветаў. Пакуль думкі наконт гэтага разыходзяцца, мы будзем сітуацыю вывучаць. У 2018 годзе адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы. Безумоўна, трэба падымаць аўтарытэт прадстаўнікоў мясцовай улады, мясцовага самакіравання. Я думаю, што мы ўжо гатовы да таго, каб праводзіць прамыя выбары старшыняў мясцовых сельвыканкамаў. Тады чалавек працай, ініцыятывай будзе даказваць, што ён на сваім месцы. Пры прамых выбарах будзе конкурс. А людзі на сяле ведаюць, хто чаго варты. І калі старшыню сельвыканкама абяруць аднавяскоўцы, яны з яго і спытаюць, ды і ён смялей будзе адстойваць свой пункт гледжання. Як заклікае кіраўнік дзяржавы, не трэба баяцца выказваць свае ідэі, павінен быць адкрыты дыялог. Мясцовае самакіраванне ад гэтага толькі выйграе. Старшыня сельвыканкама павінен мець аўтарытэт, адпаведныя паўнамоцтвы, матэрыяльны і маральны рэсурсы для вырашэння надзённых пытанняў.

**— Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч часта робіць акцэнт на ініцыятыве парламентарыяў. На што вы як член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні хацелі б звярнуць увагу, з якімі праектамі або ініцыятывамі выступіць?**

— Апошнім часам мы, сенатары, нацэлены больш актыўна займацца развіццём мясцовых тэрыторый, вырашаць праблемы на месцах. Як сказаў Прэзідэнт на сумесным пасяджэнні дзвюх палат парламента, нам трэба рухацца наперад, развівацца, разам пераадолець тыя негатыўныя тэндэнцыі ў эканоміцы, якія, на жаль, склаліся. Цяпер стабілізацыя ўжо дасягнута, і гэта стане пачаткам росту эканомікі. Нашых выбаршчыкаў хвалююць заработная плата, сацыяльная сфера, ахова здароўя, адукацыя, цэны ў крамах, узровень рэальных даходаў... Каб людзі былі задаволены, трэба, каб больш эфектыўна працавала эканоміка, развіваўся прыватны бізнес, якому таксама надаецца вялікая ўвага. Напоўніцца бюджэт — стане расці і заработная плата, будзе развівацца сацыяльная інфраструктура, павысіцца дабрабыт.

Я выступіў з прапановай, якая, думаю, павінна быць уважліва вывучана: стварэнне на ўзроўні рэспублікі фонду падтрымкі мясцовых ініцыятыў. Нашы сельскія Саветы ўжо ўдзельнічаюць у розных праектах трансгранічнай дапамогі, людзі ведаюць, як праект аформіць, як даказаць яго эфектыўнасць, як скласці бізнес-план.

Калі б на ўзроўні краіны мы стварылі фонд падтрымкі мясцовых ініцыятыў, то змаглі б стымуляваць гэтыя пачынанні. Хай бы ён папаўняўся не толькі з бюджэту, але і з іншых крыніц фінансавання, у тым ліку і спонсарскіх сродкаў. Органы мясцовага самакіравання, асабліва першаснае звяно, на конкурснай аснове прымалі б удзел у праектнай дзейнасці і атрымлівалі нейкія сродкі. Акрамя матэрыяльнага і маральнага стымулу, гэта толькі павышала б узровень даверу насельніцтва да кіраўніка мясцовага сельвыканкама. На першапачатковым этапе не трэба шмат грошай, а вось па меры развіцця эканомікі фонд будзе папаўняцца.

> Аптымізацыя праводзіцца не дзеля аптымізацыі. На першае месца ставяцца інтарэсы людзей.

Зараз пры Савеце Рэспублікі створана рабочая група, якая вывучае на практыцы прымяненне Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», распісаны алгарытм яе работы. Перада мной, як і перад іншымі членамі групы, пастаўлена задача сабраць праўдзівую і аб'ектыўную інфармацыю: як рэалізуецца закон на месцах, якія праблемы ўзнікаюць, што трэба зрабіць для ўдасканалення працы. Пасля аналізу сабранага матэрыялу намецім шляхі далейшай работы.

**— А якія, на Ваш погляд, кірункі важныя для развіцця Гродзенскага рэгіёна? На чым неабходна сёння засяродзіць увагу?**

— Галоўнае — і аб гэтым гаварылася на пятым Усебеларускім сходзе — сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, бізнесу, павышэнне долі высокатэхналагічнай і сярэднетэхналагічнай вытворчасці. Другі ключавы прыярытэт — занятасць насельніцтва, трэці — экспарт, чацвёрты — інфарматызацыя, пяты — наша моладзь. Немагчыма нешта выключыць з ланцужка. Калі гэтая сістэма пачне дакладна працаваць, усе будуць зацікаўлены ў рэалізацыі пастаўленых задач, мы будзем планамерна ісці наперад і ніхто нас не спыніць.

Вельмі важна, што ўлада сёння як ніколі даступная для людзей: праводзяцца прамыя тэлефонныя лініі, прыёмы грамадзян, выязныя прыёмы, разглядаюцца пісьмовыя звароты. Але жывыя зносіны павінна быць. Калі людзі з першых вуснаў чуюць, як працуе ўлада, якія праблемы яна вырашае і будзе вырашаць, то ўзровень інфармаванасці насельніцтва значна ўзрастае. Гэта адзін з ключавых момантаў работы органаў улады на месцах.

**Ірына АНІКЕВІЧ.**

ПРАВІЛЫ «ГУЛЬНІ»

# ЗАЦІКАВІЦЬ УЛАСНІКА МОЖНА ТОЛЬКІ РУБЛЁМ

## Пры продажы дзяржаўнай нерухомасці на аўкцыёне былы праваўладальнік зможа атрымаць палову выручкі. Але пакуль што ўсе грошы накіроўваюцца ў бюджэт



**Стаяла ў полі хатка з дзіркамі, а цяпер прыгожая такая, як з карцінкі. А ўсё таму, што пасля нядбайнага ўладальніка сюды прыйшоў руплівы гаспадар. Але ў жыцці гэта не вельмі проста, бо сапраўднага новага ўласніка трэба спачатку адшукаць... Аб тым, як у нашай краіне вырашаецца праблема нерухомай маёмасці, якая пустуе, практычна не выкарыстоўваецца, а часам нават разбураецца, карэспандэнту «Звязды» расказаў начальнік упраўлення па распараджэнні маёмасцю рэспубліканскай уласнасці Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй СЯМЁНАЎ.**

### Прававая база створана

Наш суразмоўца ўпэўнены, што сёння на заканадаўчым узроўні і па лініі практычных напрацовак у краіне створаны ўвесь шэраг механізмаў, які дазваляе беспраблемна ўцягваць у гаспадарчы абарот безгаспадарчую маёмасць. Існуе дастатковы інструментарый, пачынаючы ад аўкцыёнаў да передачы нерухомасці ў прыватную ўласнасць увогуле бясплатна. У гэтым механізме прадугледжваецца і арэнда, а таксама продаж маёмасці за 1 базавую велічыню.

> Вось тут дзяржава становіцца жорсткай. Яна забірае аб'ект назад, а чалавеку выстаўляе на аплату даволі сур'ёзны штраф.

Больш таго, сёння камітэтам падрыхтаваны праект Указа №294, паводле якога прадугледжана выкарыстанне новых механізмаў стымулявання прадпрымальніцкай дзейнасці. Напрыклад, сёння арандатар мае пераважнае права выкупу той маёмасці, якой ён карыстаецца на працягу 3 гадоў. Каб гэты механізм быў максімальна празрыстым, у праекце дакумента прапісваецца дакладны пералік падстаў, на аснове якіх такому арандатару нельга будзе адмовіць у набыцці аб'екта арэнды. Цяпер кожны прадпрымальнік ужо загадзя будзе ведаць дасканалыя правілы гульні на гэтым полі, а таксама неабходныя ўмовы, пасля выканання якіх арэндную маёмасць можна будзе выкупіць. У гэтым выпадку суб'ектыўны фактар зводзіцца да мінімуму.

Таксама ў гэтым праекце павялічваецца перыяд растэрміноўкі пры выкупе маёмасці кліентам на аўкцыёне да 3 гадоў. Больш таго, цяпер максімальны перыяд растэрміноўкі вызначае ўжо не дзяржава, а непасрэдна будучы гаспадар.

І яшчэ. Бадай, самым галоўным момантам у працэсе змены ўласніка з'яўляюцца грошы. Калі прадпрыемства прадае сваю непатрэбную маёмасць на аўкцыёне, то ўсе грошы накіроўваюцца ў рэспубліканскі бюджэт або ў агульную скарбонку па лініі камунальнай уласнасці. Менавіта гэты механізм у праекце новага дакумента плануецца падкарэктаваць. Цяпер 50% ад атрыманых на аўкцыёне грошай будзе накіроўвацца непасрэдна прадпрыемству, якому належаў гэты аб'ект, а другая палова — у адпаведныя бюджэты. Зразумела, што ў гэтым выпадку суб'екты гаспадарання будуць напрамую зацікаўлены выстаўляць падобныя аб'екты на продаж.

### Жыллё — за адну базавую

Паводле слоў Андрэя Сямёнава, штогод у гаспадарчы абарот плануецца вярнуць каля 1600 падобных аб'ектаў. Акрамя таго, пэўная колькасць праблемнай нерухомасці запланавана да зносу і кансервацыі. Агульная колькасць такой маёмасці напрыканцы года набліжаецца да 2,5 тысячы. Аб якой менавіта нерухомасці тут ідзе гаворка?

Па лініі рэспубліканскай уласнасці — гэта непатрэбныя будынкі прадпрыемстваў. Напрыклад, склады, былыя вытворчыя цэхі і іншыя памяшканні. У камунальнай структуры сярод пустых аб'ектаў нерухомасці большую частку складаюць памяшканні сацыяльнай сферы. Гэта былыя школы, дзіцячыя садкі, памяшканні нейкіх медыцынскіх устаноў, якія ў выніку аптымізацыі былі зачынены, а зараз стаіць задача аб іх далейшым выкарыстанні. Звычайна гэтыя будынкі ў даволі нармальным стане, але проста не функцыяныюць.

Попыт на такія «сцэны» невялікі, але ён ёсць. Тут пакупнік знаходзіцца часцей не з першага разу. «У нас прыкладна 75% такіх аб'ектаў на аўкцыёнах прадаецца з паніжэннем цаны на 80% або нават і ўвогуле за адну базавую велічыню (БВ). Па мінімальнай цане (за 1БВ) нерухомасць набываецца менавіта ў сельскай мясцовасці. Прадаць іх даражэй складана, бо яны знаходзяцца далёка ад магістральных шляхоў, у той мясцовасці, дзе слабая інфраструктура і транспартная лагістыка», — расказвае спецыяліст. Але







**Будынак былога Дома піянераў у г. п. Круглае Магілёўскай вобласці. Зараз тут гандлёвы цэнтр «Гаспадар», дзе створана 31 працоўнае месца** ***(на фота справа).***

і такія памяшканні атрымліваюць сваіх новых гаспадароў. Часцей там узнікаюць невялікія вытворчасці па лініі дрэваапрацоўкі, сацыяльныя аб'екты, музеі і г. д. У першую чаргу такімі памяшканнямі цікавяцца індывідуальныя прадпрымальнікі ці проста фізічныя асобы. Людзі часцей купляюць такія будынкі для далейшай мадэрнізацыі і выкарыстання ў якасці жылля. Атрымліваецца, што ў вёсцы ўласныя «сцэны» можна набыць за адну базавую?

«Калі на аўкцыёне адным з відаў выкарыстання аб'екта прапісваецца і «пад жыллё», то ніякіх праблем у будучага гаспадара не існуе. Дзяржава звычайна ідзе насустрач любым пажаданням пакупніка», — удакладняе Андрэй Сямёнаў. Аднак, тут існуе адно але...

### Побач з пернікам — бізун

Аб'екты, якія выстаўляюцца на аўкцыён за адну базавую, прадаюцца заўсёды з пэўнымі ўмовамі. Гэта можа быць рэканструкцыя памяшкання пад жыллё, вядзенне нейкай прадпрымальніцкай дзейнасці ці нешта іншае. Калі пакупнік выконвае гэтыя ўмовы, то пасля заканчэння тэрміну, вызначанага дагаворам куплі-продажу аб'екта, усе абмежаванні здымаюцца, а чалавек робіцца паўнавартасным уласнікам нерухомасці. Пасля гэтага гаспадар можа рабіць з гэтай маёмасцю любыя здзелкі, нават прадаць сваю справу ці жыллё трэцім асобам.

Цікава, а што будзе, калі новы гаспадар не паспее выканаць усе ўмовы дагавора?

Калі наш пакупнік шчыруе на аб'екце, але па нейкіх аб'ектыўных прычынах не змог уклацыся ў вызначаны тэрмін, тады мясцовыя ўлады пойдуць яму насустрач і падоўжаць тэрмін дагавора. Іншая справа, калі гэты прадпрымальнік набыў добры аб'ект за капейкі, але па сутнасці нічога там не зрабіў, а будынак пачаў разбурацца. Вось тут дзяржава стане жорсткай. Яна забірае аб'ект назад, а чалавеку выстаўляе на аплату даволі сур'ёзны штраф. Памер такога штрафу можа дасягаць амаль ацэначнага кошту нерухомасці.

Ёсць сёння ў мясцовых органаў улады для нядбайных гаспадароў (у тым ліку і прыватнікаў) і іншы алгарытм прымусу. Гэта механізм павышанага падаткаабкладання (зямельны падатак і падатак на нерухомасць). Ён таксама дзейнічае. Калі ўласнік упарта не «заўважае» сваю маёмасць, якая ўвогуле не выкарыстоўваецца і разбураецца, то падатак на такую нерухомасць могуць павялічыць нават у 10 разоў.

### Без сакрэтаў

Калі ў чалавека ёсць жаданне і магчымасці наладзіць сваю справу або калі ён вырашыў набыць нерухомасць у вёсцы, то што трэба рабіць? У якія дзверы грукацца?

Уся інфармацыя аб аб'ектах, якія не выкарыстоўваюцца і прапануюцца на продаж, знаходзіцца на сайтах дзяржорганаў (Дзяржмаёмасці, мясцовых гарадскіх, раённых і абласных выканкамаў), у аператараў электронных гандлёвых пляцовак і друкаваных сродках масавай інфармацыі. Усё гэта ў свабодным доступе. Застаецца толькі выбраць сабе нерухомасць, зарэгістравацца ў арганізатараў аўкцыёну і прыняць у ім удзел.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

• ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
• ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже права заключения договора аренды Торгового помещения сроком на 3 (три) года, принадлежащего государственному предприятию «Комплекс по оказанию услуг имени П.М. Машерова» на праве хозяйственного ведения**

| № лота | Наименование | Место нахождения | Начальная цена лота, в т.ч. НДС – 20%, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Сумма арендной платы в месяц, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Право заключения договора аренды Торгового помещения с инв. № 500/D-708029993. Площадь 501,6 кв.м. Помещение расположено в цокольном этаже и в подвале здания 1970 г.п. | г. Минск, ул. Варвашени, д. 11, пом. 1 | 1794,12 | 179,40 | 7162,99 | 5 |

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), - Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота №1 в течение 3 (трех) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя аукциона.

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. №150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Базовая арендная величина равна 13,60 бел. руб. в денежных знаках образца 2009 г.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 1 000, 00 белорусских рублей в денежных знаках образца 2009 года.

**Аукцион состоится 09.01.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и иностранные инвесторы. Порядок проведения аукциона, оформление участия в аукционе, определение лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещение затрат на организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.ino.by.**
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды объекта недвижимого имущества (Лот №1), принадлежащего Государственному предприятию «Комплекс по оказанию услуг имени П.М. Машерова», **проводимом 09 января 2017 г.**
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Лота №1.
Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **06.01.2017 в 12.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами) аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Пилипенко Сергей Леонидович, 8 (017) 306-47-35, 8 (044) 721-60-44.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: • +375(17) 306-00-57 • +375(29) 550-09-52 • + 375(29) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

КЛОПАТ

# ЗАЛАТЫ ЗАПАС

## Да пасяджэння сельвыканкама па праблемах адзінокіх і тых, хто пражывае адзін, рыхтуюцца загадзя

**«Вёска Азяты Жабінкаўскага раёна гэтым летам адзначыла 500-годдзе. На святкаванні юбілею асаблівую ўвагу звярнулі на «залаты запас» сельсавета — сталых людзей, якія найперш сваёй працай заслужылі павагу землякоў», — расказала старшыня Азяцкага сельвыканкама Ларыса ХАРС. Такіх у аграгарадку з гісторыяй даўжынёй у палову тысячагоддзя знайшлося нямала.**

АЛЬБОМ са здымкамі са святочных мерапрыемстваў захоўваецца на самым пачэсным месцы. Некаторыя з герояў той імпрэзы значацца і ў іншай папцы — са спісамі адзінокіх грамадзян і тых, якія адзінока пражываюць. Гэтым людзям мясцовая ўлада ўдзяляе асаблівую ўвагу. Старшыня сельскага Савета расказала, што днямі завяршаецца вялікая кампанія, якую выканкам праводзіў разам з прадстаўнікамі сацыяльнай службы, міліцыі, супрацьпажарнага нагляду. Цэлы месяц сельсавецкія работнікі са спецыялістамі ўказаных службаў наведвалі адзінокіх, састарэлых і тых, хто пражывае адзін. Глядзелі на бытавыя ўмовы, звярталі ўвагу на бяспеку, інструктавалі накont паводзін у выпадку паяўлення незнаёмых людзей, выяўлялі праблемы, слухалі пажаданні. Такім чынам камісіі наведалі дзесяць населеных пунктаў сельсавета. У паездцы па апошняй, адзінаццатай па ліку, вёсцы Азяты старшыню сельскага Савета суправаджала карэспандэнт «МС».

> Гадоў колькі таму пагасціць у вёску прыязджалі англічане. Яны заўважылі чалавека, што касіў траву каля хаты непрывычным для іх інструментам — звычайнай касой.

Першым мы наведалі ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Аляксея Філімонавіча Гумянку. На парозе дома нас сустрэў стройны падцягнуты мужчына, якому ніяк не дасі 93 гады. Аказалася, што свой новы дом ён пачаў будаваць у 74 гады. І падчас яго ўзвядзення многае зрабіў сваімі рукамі. Пасля яшчэ пажыць у новай хаце з жонкай, а вось апошнія гады Аляксей Філімонавіч жыве адзін.

У Азятах яго ўсе ведаюць і могуць прывесці шэраг фактаў, якія даказваюць, што нашы ветэраны — людзі са стрыжнем, адным словам, крэмень. Гадоў колькі таму пагасціць у вёску прыязджалі англічане. Яны заўважылі чалавека, што касіў траву каля хаты непрывычным для іх інструментам — звычайнай касой. Пацікавіліся, колькі яму гадоў. А калі даведаліся, што дзядуля ваяваў на франтах Другой сусветнай, дайшоў да Берліна, іх захапленню не было мяжы. Яны падрабязна распытвалі ветэрана пра ваенныя будні, сваёй фотасесіяй нават стамілі яго. І больш за ўсё іх здзівіла, што ў свае гады ён яшчэ косіць. А Аляксей Філімонавіч сказаў, што прывык да дзедаўскай касы, навамодныя трымеры яго не прывабліваюць.


Аляксей ГУМЯНКА.

Быў выпадак, калі яшчэ больш запаважалі ветэрана навакольныя. Пасля смерці жонкі да яго зачасцілі прадстаўнікі іншай канфесіі з прапановай прыйсці да іх, каб знайсці падтрымку і суцяшэнне. Вядома, людзі кіраваліся найлепшымі намерамі. І ён падзякаваў ды адказаў: «Я Радзіму і веру не мяняю».

І не дзіва пачуць такое ад чалавека, які прайшоў вайну. Забралі Аляксея на фронт у 1944-м. Ён і цяпер без запінкі пералічвае, якія рэкі фарсіраваў, якія гарады якіх краін Еўропы вызваляў. Сувязіст артылерыйскага палка з вёскі пад Жабінкай дайшоў да Берліна, пабываў у рэйхстагу. Дадому вярнуўся толькі ў 1947 годзе, служыў у арміі яшчэ два гады пасля перамогі. Тут адразу давялося ўпрагацца ў цяжкую сялянскую работу. Пасля арганізацыі калгаса пайшоў працаваць жывёлаводам, кароў пасвіў, даглядаў скаціну на ферме. Потым скончыў курсы трактарыстаў і да пенсіі працаваў на трактары. Работа механізатара тады азначала быць у полі з цямна да цямна. А з дамашняй гаспадаркай спраўляліся ноччу, успамінае ветэран вайны і калгаснай вытворчасці.

Цяпер Аляксея Філімонавіча не забываюць грамадскія арганізацыі, мясцовае сельгаспрадпрыемства. На святы прыходзяць з віншаваннямі, аказваюць дапамогу. Дочкі палічылі, што бацьку ўжо цяжка аднаму спраўляцца з дамашнімі справамі, сачыць за ўласным здароўем. І па чарзе пражываюць у роднай хаце. Калі мы наведалі гаспадара дома, яго дачка Надзея Аляксееўна рабіла прыборку ў пакоях.


Марыя ФЕДАСЮК.

МАРЫЯ Федасюк, якой 94 гады, таксама ў спісе вяскоўцаў, якія пражываюць адзінока. Старэйшая дачка жыве ў суседняй вёсцы, малодшая — у Брэсце. Вядома, дзеці завуць матулю да сябе, асабліва гарадскія.

— Яны мне пакойчык у доме на другім паверсе падрыхтавалі, — смяецца бабулька, — але ж пакуль сваімі нагамі перасоўваюся, не хочацца з роднай хаты ехаць. Я прывыкла да цішыні і спакою. Па тэлевізары толькі адзін канал гляджу — праваслаўны. Добра так зрабілі для нас: у царкву ісці не трэба, не ўсе ўжо могуць да храма дабрацца, а паглядзіш — на службе нібы пабыў.

Марыя Ісакаўна пражыла нялёгкае жыццё. Згадвае голад і холад дзяцінства, сям'я была надта бедная, бацькі не маглі нават у школу дачку адправіць. Потым вайна, пасляваенная калгасная жыццё. Чытаць і пісаць навучылася самастойна, па газетах. Марыя трыццаць гадоў адпрацавала даяркай на ферме. Была перадавіком у тыя часы, калі кароў даілі яшчэ ўручную. За ўдарную працу адзначана шматлікімі граматамі, узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Перадавая даярка ўмудралася, акрамя работы на ферме, спраўляцца яшчэ і ў брыгадзе на паляводстве. Таму яе рабочы год складалі не 365 дзён, а на сотню-паўтары больш. Марыя Ісакаўна параўноўвае ўмовы работы тады і цяпер. Кажа, што яна нават уявіць сабе не магла, што даярка, як цяпер называюць, аператар, можа прыйсці на працу ў добрым абутку і адзенні, а калі ферма далёка ад дому, то яе абавязкова падвязуць. Цяперашнія жывёлаводы пасля працоўнага тыдня абавязкова атрымліваюць выхадны. Пакаленне Марыі Федасюк пра такое і не марыла.

— Цяпер добра жыць, — разважае бабулька, — пенсію плацяць, дзеці-ўнукі глядзяць, толькі вось хваробы адольваюць, ногі зусім не слухаюцца.

> Дзеці мне пакойчык у доме на другім паверсе падрыхтавалі, — смяецца бабулька, — але ж пакуль сваімі нагамі перасоўваюся, не хочацца з роднай хаты ехаць.

У тым, што маці і бабулю родныя даглядаюць як след, няцяжка ўпэўніцца. У хаце парадак, ёй для забавы нават папугайчыка прывезлі, які весела шчабеча з клеткі. Кубкі, іншыя сувеніры з партрэтам бабулі — гэта праявы ўвагі ўнукаў. «Прыязджаюць кожны тыдзень, прывозяць усё, што патрэбна, а суп я і сама яшчэ звару», — паведамляе нам жанчына.

СТАРШЫНЯ сельскага Савета Ларыса Харс сказала, што пажылыя вяскоўцы, якіх мы наведалі, уяўляюць сабой прыклад ідэальнага стаўлення дзяцей да сваіх састарэлых бацькоў. Такіх прыкладаў, на шчасце, па сельсавеце можна знайсці нямала. Але ёсць і праблемы. Паводле слоў Ларысы Уладзіміраўны, у адзінаццаці населеных пунктах Азяцкага сельсавета налічваецца 44 адзінокія грамадзяне і 140 пражываюць адзінока. 24 чалавекі абслугоўваюць сацыяльныя работнікі.

Апошнія, як правіла, знаходзяцца з асяродку аднавяскоўцаў альбо суседзяў тых, каму патрабуецца дапамога. І гэта найлепшы варыянт.

Кіраўнік мясцовай улады згадала, як думала над прапановай стаць сацыяльным работнікам Лідзія Шурко, сумнявалася, ці атрымаецца ў яе. А потым так прывыкла да сваіх абавязкаў, што нават калі пайшла ў водпуск па доглядзе дзіцяці, клопату аб сваіх падапечных не пакідала. Муж ва ўсім дапамагае Лідзіі Пятроўне.

Цяпер у сельсавеце выяўляюць спісы, апрацоўваюць інфармацыю, атрыманую падчас рэйдаў камісій з тым, каб у пачатку года падвесці вынікі работы з пазначанай катэгорыяй людзей і прызначыць сацыяльных работнікаў тым, хто мае патрэбу і выказаў такое пажаданне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
yackevich@zviazda.by
*Жабінкаўскі раён.*

# ...І САНАТОРЫЙ ДОМА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Клопатаў у сацыяльных работнікаў хапае. На надомным абслугоўванні ў раёне — 582 чалавекі.

— Колькасць людзей, якім патрэбна сацыяльная дапамога, штогод павялічваецца. Чаму? Насельніцтва старэе. Дзеці, якія раней жылі ў вёсках, з'язджаюць у горад уладкоўваць сваё жыццё, а іх пажылыя бацькі застаюцца адны, — тлумачыць Алеся Уладзіміраўна.

Каб старыя не адчувалі сябе адзінока, пры тэрытарыяльным цэнтры для іх працуе аддзяленне дзённага знаходжання. Яго наведваюць 28 пажылых жыхароў раёна. Для пенсіянераў там арганізаваны розныя гурткі: дэкаратыўна-прыкладной творчасці, музычна-тэатральны, нават клуб падарожнікаў (яго наведвальнікі займаюцца так званым віртуальным турызмам — рыхтуюць матэрыял аб нейкім месцы і дзеляцца ім на чарговым сходзе клуба). Для аматараў скандынаўскай хады ёсць «Сцежка здароўя». Адкрыты клуб стасункаў «Надзея»: там пажылыя збіраюцца адзначаць дні нараджэння, памятныя даты.

Часта сярод наведвальнікаў дзённых аддзяленняў няма мужчын: нецікава ім вязаць і клеіць вырабы з прыродных матэрыялаў. Але ва Ушачах паклапаціліся пра прадстаўнікоў моцнага полу, прадумалі гурткі і для іх — напрыклад, шахматна-шашачны клуб. «У нас мужчыны вельмі актыўныя», — заўважае дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра.

Сярод запатрабаваных паслуг, якія аказвае ТЦСАН, — санаторый дома. Ён разлічаны ў сярэднім на дзесяць дзён. Да пажылога чалавека, які пакінуў заяўку, выязджае брыгада ў складзе сацыяльнага работніка, медыка і валанцёра з ліку пенсіянераў. Назначаюць працэдуры, робяць масаж, праводзяць культурныя чытанні. Сумесна з Домам культуры арганізоўваюць невялікія канцэрты.

— У гэтым годзе паслугу «санаторый дома» аказвалі больш за 20 разоў. У аддаленыя вёскі, праўда, брыгадзе складана выязджаць. Звычайна працуем па заяўках адзінокіх старых у бліжэйшых населеных пунктах.

Да Новага года тэрытарыяльны цэнтр Ушацкага раёна праводзіць акцыю «Павіншуй сваіх пажылых бацькоў». Прапануюць заказаць Дзеда Мароза і Снягурку для пенсіянераў, перадаць гасцінцы. Акцыю ладзяць ужо другі год. У цэнтры расказваюць, што віншаванні для сваіх адзінокіх суседзяў заказваюць нават проста іх знаёмыя. Дзякуючы сацыяльным работнікам, пажылыя людзі ў святы не адчуваюць сябе пакінутымі. Хаця, вядома, лепш было б, каб сваіх старых бацькоў наведалі і самі дзеці, якія некалі раслі ў гэтых вёсках.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

НА ВАРЦЕ

# ЛЕПШЫЯ ПА АХОВЕ
## грамадскага правапарадку

**...былі названы падчас праходжання ў Магілёве вучэбна-метадычнага збору па ўдасканаленні работы грамадскіх аб'яднанняў па прафілактыцы правапарушэнняў.**



— У параўнанні з папярэднімі дзесяццю гадамі сёння мы маем самы мінімальны ўзровень падлеткавай злачыннасці, — адзначыў за некалькі хвілін да пачатку мерапрыемства **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Сумесныя намаганні ўсіх суб'ектаў прафілактыкі дапамагаюць дабівацца такіх вынікаў. І галоўная роля тут належыць саветам грамадскіх пунктаў. У іх работе — і папярэджанне сямейных канфліктаў, і праблема бытавых злачынстваў.

На пытанне нашага карэспандэнта аб тым, наколькі актыўна выканаўчая ўлада ўзаемадзейнічае з суб'ектамі прафілактыкі, Валерый Малашка адказаў:

— Сёння працуе шмат розных камісій: па Дырэктыве №1, карупцыі, па справах непаўналетніх і гэтак далей, дзе ўлада ўзяла на сябе кіраўніцтва і разгляд тых ці іншых пытанняў. У міліцыі свой спектр работы, у МНС — свой, а ўзаемадзеянне ажыццяўляецца вакол органа выканаўчай улады — абласной і раённай.

Сёння ў вобласці працуе 211 саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку (ГПАП). Ад іх дзейнасці залежыць, наколькі аператыўна прымаюцца меры да парушальнікаў грамадскага спакою. Як і ў любой іншай рабоце, тут ёсць свае пытанні і праблемы, з якімі трэба разбірацца. Гэта таксама абмеркавалі ўдзельнікі сустрэчы. Дзесьці прысутнічае фармалізм, дзесьці прыйшлі новыя людзі, якія яшчэ не зусім разумеюць важнасць ускладзеных на іх абавязкаў. Валерый Малашка звярнуў увагу на тое, што з імі павінна весціся беспарапынная вучоба, каб работа з насельніцтвам адбывалася не па нейкім шаблоне. «У кожным рэгіёне ёсць свае асаблівасці, і іх трэба ўлічваць», — падкрэсліў ён.

**Начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама, палкоўнік міліцыі Аляксандр КАВАЛЬЧУК** дадаў, што трэба выкарыстоўваць індывідуальны падыход у дачыненні да канкрэтнага правапарушальніка і мабілізаваць у гэтым кірунку работу ўсіх суб'ектаў прафілактыкі.

Сярод тых, з каго трэба браць прыклад, — савет ГПАП №8 адміністрацыі Ленінскага раёна Бабруйска, абсалютны пераможца абласнога конкурсу на лепшую арганізацыю работы саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку. На другім месцы — савет Цяцерынскага сельвыканкама Круглянскага раёна, на трэцім — Следзюкоўскага сельвыканкама Быхаўскага раёна. Адзначаны таксама лепшыя па прафілактыцы правапарушэнняў супрацоўнікі міліцыі. Яны атрымалі Ганаровыя граматы і Падзякі Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама нагрудныя знакі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

ВАС СЛУХАЮЦЬ

# У СПРЭЧКАХ СВАЯКОЎ НЯМА ПЕРАМОЖЦАЎ
## Апошнім часам у сямейныя канфлікты імкнуцца ўцягнуць і ўладу

***— Звычайна на «прамую лінію» людзі звяртаюцца з нейкімі праблемамі. А тут, шчыра кажучы, вельмі парадаваў званок з Мінска: «Мы часта гасцюем у сваякоў, якія жывуць у вёсцы Цімкавічы Капыльскага раёна. Проста зачараваны старшынёй сельскага Савета дэпутатаў Аленай Вострыкавай. Бачым, што на вачах мяняецца населены пункт. Дзякуючы Алене Мечыславаўне, добраўпарадкаваны вясковыя могілкі. Старшыня сельвыканкама не толькі арганізавала вяскоўцаў на добрую справу, але і сама з лапатай ды граблямі ў руках разам з усімі прыбірала пагост. А якое свята вёскі яна зладзіла — з конкурсамі, песнямі, танцамі! На яго прыехалі землякі з усіх куткоў Беларусі, нават тыя, хто доўгі час не быў на малой радзіме. Мы напісалі калектыўную падзяку ў Капыльскі райвыканкам з просьбай заахвоціць яе матэрыяльна».***

**Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ** добра ведае сваю падначаленую. «Сапраўды, яна вельмі дзейсная, нераўнадушная да праблем жыхароў і заслугоўвае падзякі», — пагадзіўся ён.



Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ.

> Хтосьці патрабаваў падсыпаць вуліцу гравіем, а нехта — наогул заасфальтаваць. Але ў садовых таварыствах ёсць праўленне, старшыня, якія і павінны вырашаць унутраныя праблемы.

А вось далей пайшлі скаргі, і не заўсёды абгрунтаваныя. Ганна Уладзіміраўна з Калодзішчаў выказала незадаволенасць тым, што далекавата ад яе дома прыпынак грамадскага транспарту — трэба ісці да яго амаль паўтара кіламетра. Жанчына прасіла «працягнуць маршрут». Але, як адзначыў Іван Ліпніцкі, каля кожнага двара прыпынак не зробіш, паколькі існуюць сацыяльныя стандарты, якія тычацца ў тым ліку і арганізацыі работы транспарту.

Ларыса Фуркевіч паведаміла, што ў Барысаве аўтобусы на прыпынках не падыходзяць да самага бардзюра. Каб зайсці ў салон, трэба прыкласці намаганні нават маладому чалавеку. А што казаць пра нямоглых пенсіянераў? Яна звярталася наконт гэтага ў аўтапарк №3, але нічога не змянілася. Канешне, каля кожнага прыпынку кантралёра не паставіш, відэакамеру не ўсталюеш. Тым не менш існуюць правілы для вадзіцеляў, якіх яны павінны прытрымлівацца. Іван Эдуардавіч даў даручэнне даслаць пісьмо кіраўніцтву аўтапарка, каб там правялі інструктаж з усімі кіроўцамі пад подпіс. Пры гэтым ён адзначыў, што такія званкі на «прамую лінію» паступалі з Барысава і раней.

Скарга Мікалая Іванавіча з Валожынскага раёна цалкам знайшла падтрымку ў старшыні абласнога Савета дэпутатаў. Справа ў тым, што кіраўніцтва ААТ «Лоск» не выдала зарплату работніку — за верасень ён атрымаў толькі палову заробку, за кастрычнік яму не далі ні капейкі. Мужчына звольніўся з арганізацыі, але да гэтага часу з ім не разлічыліся. Іван Ліпніцкі канстатаваў, што гэта грубае парушэнне заканадаўства: яму павінны былі даць разлік на працягу трох дзён. Іван Эдуардавіч даручыў падначаленым пісьмова паведаміць аб гэтым факце старшыні райвыканкама для прыняцця мер, а таксама папярэдзіць аб недапушчальнасці такіх паводзін дырэктара таварыства.

Не абышлося на гэты раз і без пытанняў пенсійнага забеспячэння. Зінаіда Макараўна з Сёмкава Гарадка Мінскага раёна атрымлівае пенсію 180 рублёў. Пасля таго як заплаціць першачарговыя плацяжы, зусім мала застаецца на жыццё. Жанчына прасіла, каб падказалі, куды звяртацца за субсідыямі на жыллёва-камунальныя паслугі.

Галіна Міхайлаўна са Старадарожскага раёна выгадавала восем дзяцей. Шмат часу правяла ў водпуску па доглядзе за малымі. Сёлета ў кастрычніку ёй споўнілася 55 гадоў, пачала афармляць пенсію. Ёй налічылі ўсяго пяць гадоў працоўнага стажу...

Іван Эдуардавіч паабяцаў, што жанчынам дадуць тлумачэнні і неабходныя кансультацыі ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама. І, калі гэта адпавядае нормам закона, то могуць аказаць аднаразовую матэрыяльную дапамогу.



Нямала было званкоў з садовых таварыстваў. Як правіла, іх члены жывуць на дачах з вясны да восені. А на зіму перабіраюцца ў гарадскія кватэры з усімі выгодамі. Тым не менш яны хочуць, каб і ў садовых таварыствах былі такія ж зручнасці, як у сталіцы, і перш за ўсё — выдатныя дарогі. Хтосьці патрабаваў падсыпаць вуліцу гравіем, а нехта — наогул заасфальтаваць. Але ў садовых таварыствах ёсць праўленне, старшыня, якія і павінны вырашаць унутраныя праблемы на агульным сходзе.

Фаіна Андрэеўна з Дзяржынскага раёна расказала, што тры гады таму сын купіў для бацькоў дом у вёсцы Скарабагатаўшчына. Але тут ніяк не вырашыцца праблема з асвятленнем вуліцы. Жанчына звярталася ў сельвыканкам. Старшыня неаднаразова адрасавала просьбы сяльчан мясцоваму энергазбыту, але там ніякім чынам не рэагуюць. Іван Ліпніцкі паабяцаў пісьмова звярнуцца да старшыні райвыканкама, каб той пасадзейнічаў уладкаванню асвятлення ў цёмныя часы сутак.

Анатоль Васільевіч з Маладзечна патэлефанаваў ад імя ўсіх ветэранаў, не згодных з пераносам невялікага рынку, што месціцца ў цэнтры горада, у «чыстае поле». «Пажылым людзям вельмі зручна рабіць тут пакупкі — не трэба далёка ехаць, ды і цэны задавальняюць. Але замест рынку плануюць пабудаваць ці то гандлёвы цэнтр, ці то «Еўраопт» — ніхто не ведае. Чаму перш чым прымаць рашэнне, мясцовыя ўлады не параіліся з людзьмі, не наладзілі грамадскія слуханні?» Вядома, пытанне патрабуе дадатковага вывучэння, праз месяц ветэрану дадуць падрабязны адказ.

А вось Івана Іванавіча з Мінска раздражняе рэклама на тэлебачанні. Пенсіянер патрабаваў, каб... яе знялі з усіх тэлеканалаў! Ён ужо пісаў кіраўніцтву тэлекампаніі і атрымаў адказ, які яго не задаволіў, бо забараняць рэкламу ніхто не збіраецца. І смех і грэх, як кажуць. Ну чым можа дапамагчы старшыня Мінблсавета? «Дык гэта ж добра: рэкламны ролік круцяць на адным канале, можна пераключыцца на іншы. Як кажуць, адным махам забіць двух зайцоў — глядзець некалькі фільмаў», — пажартаваў Іван Эдуардавіч.

Але найбольш раздражняюць спрэчкі паміж сваякамі, блізкімі, роднымі — тыя, якія выносяць на абмеркаванне. Валянціна Міхайлаўна з Жодзіна сцвярджае, што брат і сястра не пускаюць яе на парог, каб пабачыцца з маці. Жанчына і сама не супраць забраць старую: «У яе ж вялікая пенсія». І тут стала зразумела прычына канфлікту: кожны з бакоў гатоў даглядаць матулю дзеля грошай.

Канфлікты паміж суседзямі, сваякамі цягнуцца гадамі. І ў гэтым супрацьстаянні няма пераможцаў. Людзі проста не задумваюцца, на што трацяць сваё жыццё. Памірыць іх не зможа ні Бог, ні цар, ні воінскі начальнік, калі самі не адумаюцца, не сядуць за стол перамоў.

> А вось Івана Іванавіча з Мінска раздражняе рэклама на тэлебачанні. Пенсіянер патрабаваў, каб яе знялі з усіх тэлеканалаў.

— На «прамыя тэлефонныя лініі» цяпер пераважна ідуць прыватныя пытанні — не памірыліся паміж сабой суседзі, сваякі. Шмат зваротаў з садовых таварыстваў па ўладкаванні дарог, прыпынкаў: кожны хоча, каб грамадскі транспарт спыняўся амаль што пад вокнамі. Затое практычна зніклі скаргі на работу жыллёва-камунальных службаў, на ацяпленне жылога фонду.

Усяго ж за тры гадзіны старшыня абласнога Савета дэпутатаў выслухаў 30 чалавек.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

ПЫТАЛЬНІК

# КАРОВА ПРЫВАТНАЯ. А КЛОПАТ ПРА ЯЕ?

## Ці павінен ветурач сельгаспрадпрыемства аказваць дапамогу хворай жывёле з падворка вяскоўца

*Прывітанне, паважаная рэдакцыя! Жыву ў вёсцы, трымаю гаспадарку, як гэта рабілі мае бацькі. І вось у мяне склалася такая сітуацыя. Карова павінна была цяліцца. У суботу вечарам (30 студзеня гэтага года) нішто не прадказвала біду, прыкмет пагаршэння і змянення стану здароўя жывёлы не назіралася. У нядзелю ранкам карова не ўстала. Паколькі ў Клецкай ветэрынарнай станцыі быў выхадны, я звярнулася па тэлефоне па дапамогу да мясцовага ветэрынара, які мяне абнадзеіў, сказаўшы, што ў яго ёсць усе неабходныя медыкаменты. Час ішоў, доктар не перatэлефанаваў, і я зноў набрала яго нумар. Прапанавала, каб яго падвезлі мае дзеці на машыне, на што пачула: «Я ў гаспадарцы». Тады я мусіла звярнуцца да сваякоў, якія знайшлі мне ветурача з Клецка. Той прыехаў у свой асабісты час, усё зрабіў, але... Карміліца загінула. У мяне быў стрэс, дэпрэсія, і я трапіла ў бальніцу з павышаным ціскам і пагаршэннем стану здароўя. Мне вельмі крыўдна за такое стаўленне нашага доктара да жывёл. Звярнулася ў дзяржаўны ветэрынарны нагляд (дакументы дасылаю), але нічога зразумелага не пачула...*

**Галіна Аляксандраўна ЯГОРАВА,**
*вёска Карацк Клецкага раёна.*



Пісьмо чытачкі на самай справе большае па аб'ёме, не кажучы ўжо пра шквал эмоцый у ім. Зразумець жанчыну можна. Як яна піша, «прапала карміліца»... Праўда, на першы погляд можа выклікаць здзіўленне той факт, што Галіна Аляксандраўна звярталася да падзей, якія адбыліся дзесяць месяцаў таму. За гэты час эмоцыі як быццам бы павінны былі сціхнуць. Аднак усё становіцца зразумелым пасля азнаямлення з копіямі дакументаў, што разам з лістом даслала ў рэдакцыю заяўніца. А адказы на пытанні, зададзеныя чытачкай, без перабольшвання могуць зацікавіць многіх з тых, хто трымае ў гаспадарцы кароў. Абагульнюўшы іх, галоўнае пытанне можна сфармуляваць так: ці павінен ветэрынарны ўрач сельскагаспадарчага прадпрыемства ў выпадку неабходнасці аказваць дапамогу ў лячэнні дамашніх жывёл прыватнікам?

Чытаем адказ з Клецкай раённай ветэрынарнай станцыі за подпісам галоўнага дзяржветінспектара С.А. Навумовіча на скаргу жыхаркі вёскі Карацк: «... *Згодна з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь, артыкулам 15. 46, пунктам 2 «Неаказанне ветэрынарнай дапамогі хворай жывёле», на ветэрынарнага ўрача складзены пратакол №6 ад 8.02.2016 года аб адміністрацыйным правапарушэнні і накладанні адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе штрафу — 10 базавых велічынь (два мільёны сто тысяч рублёў (да дэнамінацыі. — **С.Р.**)*». Справядлівасць узяла верх, вінаваты пакараны? Чаму ж тады застаецца незадаволенай заяўніца?

Відавочна, прычынай таму некалькі радкоў ад таго самага ветэрынарнага ўрача з сельскагаспадарчага прадпрыемства на другім дакуменце — Пастанове №2 па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні ад той жа Клецкай раённай ветэрынарнай станцыі ад 8.02.2016 года? У ёй указана, што ветурач парушыў артыкул 15.46, частку 2 ветэрынарна-санітарных правілаў «Неаказанне ветэрынарнай дапамогі хворай жывёле», за што атрымлівае адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе штрафу ў памеры дзесяці базавых велічынь. Дык вось, у канцы гэтага дакумента рукой ветэрынарнага ўрача дапісана: «*З пастановай не згодны, паколькі я з'яўляюся работнікам юрыдычнай асобы і за станам і лячэннем скаціны, размешчанай на прыватным падворку, я не адказваю*».

Больш за тое, калі мы патэлефанавалі **галоўнаму дзяржветінспектару Клецкага раёна Сяргею НАВУМОВІЧУ**, той сказаў, што пасля пракурор ...адмяніў спагнанне. Раз так, значыць ветурач меў рацыю і не павінен быў аказваць дапамогу рагулі з прыватнага падворка? Сяргей Антонавіч зазначыў, што такая дапамога насельніцтву, якое пражывае на тэрыторыі сельскагаспадарчага прадпрыемства, яго ветэрынарным урачом аказвацца ...павінна. Як так? Далей Сяргей Навумовіч заўважыў: *гэтае пытанне не ўрэгулявана заканадаўствам...*

Разабрацца больш падрабязна ва ўсіх нюансах справы нам дапамагала **намеснік галоўнага дзяржветінспектара Клецкага раёна Святлана МАРОЗ.**

— У кожнай гаспадарцы ў калектыўным дагаворы прапісана пытанне абслугоўвання насельніцтва на адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы: як ветэрынарны ўрач сельскагаспадарчага прадпрыемства павінен праводзіць дыягностыку, прафілактыку і лячэнне хворых жывёл прыватнікаў за кошт гаспадаркі. Могуць быць розныя варыянты. Напрыклад, першы разавы выклік для фізічных асоб бясплатны, наступныя — платныя. У нас, да слова, у ветстанцыі толькі платныя выклікі ветурача, — расказала Святлана Георгіеўна.

Здаецца, праблема з хворай каровай Галіны Ягоравай павінна была б вырашыцца ўжо на гэтай стадыі: бясплатны ці платны выклік (не думаю, што заяўніца пашкадавала б грошай у апошнім выпадку), ветурач павінен быў аказаць патрэбную дапамогу жывёле. Але ж...

— Гаспадарка, да ветурача якой звярталася з просьбай дапамагчы жыхарка вёскі Карацк, гэта ЗАМЕЖНАЕ прадпрыемства, — адразу адказвае на маю заўвагу суразмоўца.

Выходзіць, меў рацыю работнік гэтага прадпрыемства, калі на дакуменце зрабіў прыпіску аб сваёй нязгодзе з накладаннем адміністрацыйнага спагнання. І з гэтым пагадзіўся пракурор, які ў выніку адмяніў спагнанне.

Можна зразумець пачуцці і думкі ўладальніцы каровы: дык хто ж тады павінен аказваць дапамогу хворай жывёле? На вёсцы куды найперш ідуць? Да ветэрынара, што жыве побач. А той адмаўляе і, выходзіць, што цалкам правамоцна?

Святлана Мароз прызнае, што праблема, калі гаварыць у больш шырокім сэнсе, сапраўды ёсць.

— З 1995 года дзейнічаў Ветэрынарны статут Рэспублікі Беларусь, у якім было прапісана, што ветурач гаспадаркі павінен аказваць дапамогу насельніцтву, якое пражывае на адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы. Аднак у 2014 годзе яго адмянілі, а новага няма, — расказала Святлана Георгіеўна.

Намеснік галоўнага дзяржветінспектара Клецкага раёна, каментуючы далей ліст заяўніцы ў рэдакцыю (тая пыталася, куды можна звяртацца ў выхадны дзень за тэрміновай ветдапамогай у выпадку неабходнасці), заўважыла, што ў такія дні на ветстанцыі арганізавана дзяжурства. «*Да таго ж лячэннем каровы займаліся два розныя спецыялісты, пакуль гаспадыня не паспрабавала паклікаць на дапамогу трэцяга. І ў гэтым была прычына яго адмовы, тым больш, як ён тлумачыў, на той момант знаходзіўся не на месцы. Сама жывёла не была застрахаваная, таму можна зразумець пачуцці гаспадыні*».

Ад сябе хацелася б дадаць, што справа ў гэтай сітуацыі, яшчэ і, як яно нярэдка бывае, у так званым чалавечым фактары... Адзін запатрабаваў, другі запярэчыў...

***

На жаль, на працягу амаль двух тыдняў у рэдакцыі не атрымалася звязацца з адпаведнымі спецыялістамі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, каб пачуць больш падрабязны каментарый: не столькі адносна канкрэтнага здарэння, колькі пра сітуацыю, у якой мы спрабавалі разабрацца, увогуле...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

ВЕСТКІ З РЭГІЁНАЎ

## Алея параалімпійскай славы

**У мінулую пятніцу ў аграгарадку Міханавічы ўрачыста адкрылі алею, прысвечаную беларускай параалімпійскай славе. Дрэўцы высаджаны на тэрыторыі храма Дзімітрыя свяціцеля Растоўскага, дзе размешчана аддзяленне для дзённага знаходжання інвалідаў.**

З гэтай нагоды ў аддзяленні сабралася шмат знакамітых гасцей — прадстаўнікі міністэрстваў, ведамстваў, Мінаблвыканкама, Газпрама, дэпутаты. Яны прыехалі сюды не толькі для таго, каб сустрэцца з наведвальнікамі, але і абмеркаваць пытанне па стварэнні на базе аддзялення Рэспубліканскага цэнтра параалімпійскага спорту.

— Тут павінен з'явіцца цэлы комплекс са спартыўнымі заламі, басейнам, — адзначыў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Мікалай УЛАХОВІЧ.**— Мы ўпэўнены, што дзеці з абмежаванымі магчымасцямі павінны займацца спортам. Мы звяртаем увагу не толькі на інвалідаў, але і інвалідаў-спартсменаў. Яны не могуць працаваць на прадпрыемствах, але ў стане займацца спортам. Для гэтага не трэба спецыяльнага дазволу.

Дарэчы, у Мінску няма параалімпійскага цэнтра. А Міханавічы — практычна прыгарад сталіцы, куды зручна дабірацца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## Удзячныя вавёркі

**Экалагічная акцыя «Частуем птушак і вавёрак» прайшла ў Цэнтральным гомельскім парку. Падтрымаць братоў нашых меншых у часы, калі ім складана знайсці для сябе харч, прыйшло шмат дзяцей з бацькамі.**

Такім чынам супрацоўнікі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля штогод нагадваюць жыхарам пра тых, каму складана знайсці сабе пражытак узімку. Вядома, гонар гомельскага парка — вавёркі, якія кормяцца літаральна з рук. Кожны з удзельнікаў акцыі змог асабіста пачаставаць рыжых насельнікаў. Для птушак, а тут жывуць не толькі сініцы, але і сітаўкі, берасцянкі, гілі, дзятлы, іншыя, было ўсталявана некалькі новых кармушак. Да таго ж, дзеці паўдзельнічалі ў культурна-забаўляльнай праграме з гульнямі, конкурсамі і віктарынамі. Дарэчы, адміністрацыя ўстановы нагадвае, што «пакармiць» звярком можна і праз спонсарскі рахунак, калі пералічыць сродкі на ўтрыманне жывёл і птушак гомельскага парку.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## Выратаваў чалавека

**У мінулую суботу бяда здарылася ў вёсцы Падлессе Жабінкаўскага раёна. Дом адной з жыхарак вёскі загарэўся сярод белага дня, калі гаспадыні не было дома. Праўда, у хаце заставаўся яе грамадзянскі муж, інвалід другой групы.**

Пра далейшае карэспандэнту «МС» расказаў **начальнік Жабінкаўскага райаддзела па надзвычайных сітуацыях Алег БУТРЫМ.**

— У гэты час па вуліцы праязджалі Мікалай Бобрык і яго 86-гадовы дзядзька Уладзімір Сцяпанавіч. Яны ўбачылі дым, спыніліся, Мікалай найперш стаў выклікаць ратавальнікаў. А Уладзімір Бобрык заўважыў у акне сілуэт чалавека і паспяшаўся на дапамогу. Пенсіянер не разгубіўся, выбіў аконнае шкло і выцягнуў чалавека на вуліцу. Як высветлілася пазней, 51-гадовы мужчына не так даўно перажыў інсульт, ён пакуль вельмі слабы і самастойна выбрацца з ахопленага агнём дома не мог. А паколькі адлік часу ў задымленым памяшканні ішоў на секунды, то выходзіць, што сталы чалавек выратаваў жыццё маладзейшаму.

Уладзімір Сцяпанавіч Бобрык пражывае зараз у Брэсце, а вёска Падлессе — яго родныя мясціны, якія ён па-ранейшаму наведвае. Паводле слоў Алега Бутрыма, пажарна-выратавальная служба абавязкова публічна падзякуе Уладзіміру Сцяпанавічу за адвагу, праяўленую пры выратаванні чалавека на пажары.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

МАЛЫ, ДЫ ДАРАГІ

# БІЗНЕСУ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

**Стэрэатып пра тое, што пераважная большасць прадпрымальнікаў — гэта гандляры, абвяргае адпаведная статыстыка. Бізнес на самай справе шматпрофільны. Усё больш рашуча рушыць ён у сферы вытворчасці. Дарэчы, на Віцебшчыне ёсць прадукцыя, якую вырабляюць толькі на прадпрыемствах малога і сярэдняга бізнесу. У прыватнасці, аднафазныя электрарухавікі пераменнага току, адзенне з натуральнага футра, шампунь, шакалад і гэтак далей.**

## У глыбінцы — прэферэнцыі

На сёння ў паўночнай вобласці краіны зарэгістраваны больш за 9 тысяч фірмаў, якія адносяцца да малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, каля 23 тысячы ІП.

Колькасць дзелавых людзей з глыбінкі таксама павялічваецца. І ім гарантаваныя прэферэнцыі. Адпаведны Дэкрэт №6 Прэзідэнта з'явіўся ў 2012 годзе. Дзякуючы прывілеям, колькасць прадпрымальніцкіх арганізацый у малых гарадах, аграгарадках павялічылася на 5%. А разам гэта амаль што 40% ад усіх зарэгістраваных у вобласці.

— Падатковымі льготамі актыўна карыстаюцца суб'екты прадпрымальніцтва Бешанковіцкага, Расонскага і Лёзненскага раёнаў. Маёмаснымі — Полацкага, Віцебскага і Пастаўскага. А найбольш актыўныя «льготнікі» — у Лепельскім, — канстатуе **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег МАЦКЕВІЧ.**

У сельскай мясцовасці выгадней распачынаць сваю справу і беспрацоўным. Усе патэнцыяльныя прадпрымальнікі з ліку беспрацоўных могуць прэтэндаваць на добрую бязвыплатную субсідыю. Яе сума — ад 11 да 20 сярэдніх бюджэтаў пражытачнага мінімуму (з 1 лістапада памер аднаго бюджэту —174,52 рубля)...

А як могуць дэпутаты мясцовых Саветаў дапамагчы развіццю недзяржаўнага сектара эканомікі?

— У краіне створаная нармальная нарматыўная база для падтрымкі дзелавой ініцыятывы. У нас сапраўды спрыяльныя ўмовы для інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці. Пашыраецца дзяржаўна-прыватнае партнёрства. І дэпутаты абласных і раённых Саветаў павінны прымаць рашэнні, якія дапамагалі б росквіту прадпрымальніцтва. Я маю на ўвазе магчымасць выкарыстання дзяржаўнай маёмасці, зямлі і іншае, — расказвае **памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Віцебскай вобласці Аляксандр ПАЗНЯК.**

## Маленькія і вялікія

Каля 80% суб'ектаў сярэдняга прадпрымальніцтва ажыццяўляюць дзейнасць у галіне прамысловасці, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі. А так званы малы бізнес (фірмы да 100 чалавек) засяродзіўся ў асноўным на сферы паслуг насельніцтву. І толькі 36,5% займаюцца гандлем.

Цікава, што невялікія фірмы, як і ў краінах з багатым вопытам бізнес-дзейнасці, паспяхова выконваюць заказы буйных прадпрыемстваў. Гэта — партнёрства ў форме субкантрактацыі. Такім чынам, на падставе кааперацыі выпускаюцца: упакоўка для харчовых прадуктаў, камплектуючыя для абутку, вымяральныя прыборы, солад, тара, паддоны... У пераліку заказаў бізнесу ёсць і ланцугі, і спружыны для сельскагаспадарчай тэхнікі, і крапежныя вырабы, і гэтак далей. Але да вопыту ў гэтым пытанні развітых краін нам яшчэ далёка. А менавіта такая практыка — адзін з вядучых фактараў павышэння эфектыўнасці вытворчасці.

— Змяніць сітуацыю можа рэструктурызацыя прамысловых прадпрыемстваў. Незагружанае абсталяванне і пустыя цэхі — гэта раскоша. Кожны рубель актываў павінен працаваць. Тут могуць быць створаны функцыянальныя малыя прадпрыемствы. Адпаведна з'явяцца новыя працоўныя месцы, панізяцца выдаткі, скароцяцца імпарт, — працягвае віцэ-губернатар.

Што датычыцца экспарту, на долю бізнесу на сёння прыходзіцца амаль што яго траціна. Зразумела, патэнцыял вялікі.

## Што ў інкубатары

У народзе кажуць, што куранят восенню лічаць, а ў інкубатары для бізнесу прырост падлічваюць вельмі часта.

— За 16 гадоў адкрылі больш за 100 паспяховых прадпрыемстваў. На іх працуюць каля 1000 чалавек... Сёння ў васьмі будынках размешчаны каля 180 суб'ектаў гаспадарання, — расказвае **дырэктар інкубатара малога прадпрымальніцтва прававой групы «Закон і парадак» Міхаіл КЕЙЗЕРАЎ.**

У інкубатары па сімвалічнай цане можна арандаваць памяшканне пад офіс, вытворчасць, склад. Тут аказваюць юрыдычныя, бухгалтарскія, маркетынгавыя паслугі. Стварaецца бізнес-школа для кіраўнікоў прадпрыемстваў — іх навучаць арыентавацца ў сучасных рэаліях бізнесу, перадольваць крызісы, правільна наладжваць сувязі, шукаць інвестараў і заказчыкаў.

Пра тое, што падтрымка мясцовай улады параўнальна эфектыўная, сведчаць наступныя лічбы. Толькі ў першым паўгоддзі гэтага года пачалі дзейнасць каля 150 новых арганізацый і 12 вытворчасцяў. Створана каля 1,2 тысячы новых рабочых месцаў...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

ЛАД ЖЫЦЦЯ



# У ЧАРГУ ПА ФРУКТОВЫ СЫР!

## Які смак беларускай кухні? Сям'я Вінакуравых упэўнена, што яблычны

**Юлія і Кастусь мінчане, але пяць гадоў таму вырашылі пераехаць у Смаргонскі раён і пачаць уласную справу. Як гаворыць гаспадыня, яны фанаты вясковага ладу жыцця. Цяпер разам са сваімі дзецьмі Артурам і Веранікай жывуць на хутары і робяць, для кагосьці цудоўны, а для знаўцаў — традыцыйна беларускі, яблычны сыр.**


Фота citydog.by

Юлія і Кастусь Вінакуравы.

## Ведаем наша

Не кожная сям'я адважыцца пераехаць са сталіцы ў вёску. Але Кастусь і Юлія гавораць, што нават на хутары жыць не цяжка. Асабліва калі ёсць машына. Перад тым як пераехаць, яны змянілі некалькі хат. Спачатку купілі хату-гнілушку ўсяго за 300 долараў. Святло ўключаеш — і яна як абажур: звонку відаць, як праміні прабіваюцца скрозь сцены. У ёй перазімавалі, а потым пераехалі на хутар. Там і пачалі займацца сядзібай і вырошчваць экалагічна чыстыя прадукты.

Яблычны сыр нельга з чымсьці пераблытаць, таму яго лёгка зрабіць беларускім нацыянальным прадуктам, лічаць гаспадары. Увогуле, яго гатуюць толькі ў нас і ў Літве, але рэцэпты з розных краін адрозніваюцца, ды і смак таксама. Рэцэпт яблычнага сыру вядомы на нашых землях здаўна. Адзін з яго варыянтаў — салодкі. Яблыкі напалову змешваюць з цукрам ці мёдам. Але такая страва магла з'явіцца на стале толькі заможных шляхціцаў, бо цукар быў даволі дарагім інгрэдыентам. А вось сяляне хутчэй ужывалі яблычны сыр з кменам. Калі дадаць туды яшчэ чырвонага перцу і солі — ён будзе нагадваць каўбасу. Такі сыр добра ідзе ў якасці закускі.

Цяпер сям'я Вінакуравых разлічвае адкрыць сваю сырную вытворчасць. У рамках аграсядзібы вырабляць прадукт даволі цяжка: прадаваць можна толькі з рук у рукі, ды і шмат не нагатуешь. А так можна выходзіць на вялікія аб'ёмы і гандляваць праз крамы. Другая ідэя — звярнуцца да кансервавага завода, каб узяць абсталяванне ў арэнду і на ім ужо гатаваць яблычны сыр і прадаваць пад сваім брэндам. Гэта першы прадукт, з якім яны плануюць выходзіць на рынак, потым могуць дадавацца іншыя традыцыйныя вырабы, каб развіваць даступнасць і пазнавальнасць прадуктаў беларускай кухні.

## Кулінарныя традыцыі

Кастусь і Юлія гавораць, што яны па духу вясковыя людзі. «Нам падабаецца, калі прыходзяць госці — адразу стол накрыць трэба». Калі пераязджаеш у глыбінку, пачынаеш цікавіцца традыцыямі мясцовасці, дзе жывеш, таму гаспадары ведаюць вельмі шмат «тутэйшых» рэцэптаў:

— На Смаргоншчыне — гэта грыбныя катлеты. Без іх ніяк. Абавязкова робяць галёнку з фасоллю і ячнымі крупамі, запечаную ў печы. Ёсць у нас і бонды — ячменныя булкі — для іх вадкае цеста на «дзікіх» дражджах наліваецца ў апалонік, потым у печку так «шлёп!» — і падымаецца. Вельмі смачна.

Каб зрабіць беларускую кухню брэндам, лічыць Кастусь, трэба пачынаць з традыцыйных прадуктаў. Зараз Беларусь асацыюецца толькі з бульбай, неабходна такую сітуацыю мяняць. Гэта паступовы працэс. У нас ёсць рэстараны беларускай кухні і сучасныя кулінарныя кнігі па ёй. Адзінае, чаго цяпер няма, — гэта рэгіянальных кухняў. У межах Беларусі існуюць асаблівасці ў кожнай мясцовасці. Так, праект «Адпачынак у вёсцы» збіраў гэтыя рэцэпты, каб зрабіць кулінарную карту і кожны вандроўнік ведаў, якую ўнікальную страву ў аграсядзібах можна пакаштаваць. Выхадам на такую рэгіянальную кухню мог бы стаць зборнік рацэптаў па мясцовасцях, як, напрыклад, ужо існуе па касцюмах.

## Адкрыты шлях для бізнесу

Аграсядзіба ў Вінакуравых не простая, а пермакультурная. Гэта азначае, што яны вырабляюць толькі экалагічна чыстыя прадукты. «Заўсёды прыемна зарабляць грошы на сваім ладзе жыцця. Да таго ж зараз гэта папулярна і прыцягвае людзей. Вырашылі ў гэтым кірунку развівацца». Цяпер яны вырабляюць малочныя сыры і вырошчваюць агародніну для адной з мінскіх крам. Юлія гаворыць, што сёння мясцовыя ўлады вельмі зацікаўлены ў развіцці такіх стартапаў:

— У нас цэлая праграма па падтрымцы малога і сярэдняга бізнесу. Мы абмяркоўвалі свой праект з кіраўніком нашага раёна Генадзем Харужыкам. Ён заўсёды вельмі прыхільна ставіцца да гэтай справы. У нас кожны год праводзяцца кірмашы для прыцягнення інвестыцый. І нашу ідэю з задавальненнем вылучаць на такі форум, каб знайсці фінансавую падтрымку. Але для гэтага патрэбны добры бізнес-план.

Сыр робяць у сыраварцы з казінага і авечага малака. З каровамі не заладзілася — травастой не падыходзіць, атрымліваўся толькі кефір, бо малако кіслае. У гаспадарцы трымаюць адзінаццаць коз, чатыры свінні, тры авечкі, цяля, курэй, індыка і качак. Думалі выходзіць на зімовую зеляніну — паставілі цяпліцу. Але вырашылі, што даволі дорага падключаць зімовае ацяпленне, так што зеляніну вырошчваюць сезонную. Планы ёсць і па развіцці турызму:

— Мы хочам зараз зрабіць квэсты для сем'яў. Для дзяцей — на адным участку, каб далёка не хадзіць, а для дарослых можна і на машыне або веласіпедзе па мясцовасці пакатацца. Мы супрацоўнічаем з рознымі сядзібамі. Як на Валожыншчыне працуе праект «Адпачынак у вёсцы», так і тут можна зрабіць грамадскае аб'яднанне. Такім чынам, мы будзем прыцягваць турыстычны гасцінец да мяжы з Літвой. Для гэтага ў нас ёсць і зацікаўленыя гаспадары аграсядзіб з Астравецкага раёна. Ды і нашы знаёмыя падтрымліваюць гэту ідэю. Напрыклад, Юлія Літвінава і Зміцер Мурашка рамеснікі. Яны вельмі творчыя людзі. Зміцер займаецца традыцыйнай экаархітэктурай. Таму, калі зрабіць такі цікавы маршрут, можна прыцягнуць шмат турыстаў. Гэта будзе развіваць і мясцовую супольнасць, бо сядзібы могуць рабіць і сацыяльныя праекты.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказныя за выпуск КАРПЕНКА Н.У., АНІСОВІЧ Н.А.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 6 снежня 2016 года.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «В ЕГИПЕТ С ЮРКАС»

**1. Сведения об организаторе.**

Частное торговое унитарное предприятие «Юркас» (Далее – Организатор).

УНП 690731341. Зарегистрирован решением Солигорского райисполкома от 18.05.2009 г. № 0090853. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 690731341. Юридический адрес: 223701, г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 40-27/1.

Местонахождение Организатора: Щомыслицкий с/с, 58, район деревни Озерцо, 223021, Минская область, Минский район, Республика Беларусь.

Электронный адрес: info@yurkas.by

**2. Наименование Рекламной игры.**

**«В Египет с Юркас»**

**3. Территория проведения.**

**Магазины, реализующие дверные полотна, поставляемые Частным торговым унитарным предприятием «Юркас» на территории Республики Беларусь, согласно прилагаемому списку:**

| № п/п | Наименование организации | Адрес салона |
|---|---|---|
| 1 | Частное предприятие "Подлога Лайф" | г. Пинск, ул. Первомайская, 61А |
| 2 | Частное предприятие "Подлога Лайф" | г. Пинск, пл. Ленина, 6-22 |
| 3 | Частное предприятие "Подлога Лайф" | г. Пинск, пр-т Жолтовского, 26 |
| 4 | ООО "ЛЕГРАНДплюс" | г. Орша, ул. Мира, 59 |
| 5 | ЧТСУП "Галас-ЕДИС" | г. Береза, ул. Советская, 56 |
| 6 | ЧТПУП "СтройЕвроСервис" | г. Слуцк, ул. Ленина, 159А |
| 7 | Частное предприятие "Лонгстеп" | г. Речица, ул. Снежкова, 23В |
| 8 | ЧТПУП "ПошейдонСтиль" | г. Лунинец, пл. Ленина, 10 |
| 9 | Частное предприятие "ТрейдПрогресс" | г. Кобрин, ул. Дзержинского, 68 |
| 10 | Частное предприятие "ТрейдПрогресс" | г. Кобрин, ул. Пушкина, 8-1 |
| 11 | ИП Копытич Ю.И. | г. Ивацевичи, ул. Сикорского, 7 |
| 12 | ООО "Гиппогрупп" | г. Борисов, ул. Строителей, 26 |
| 13 | ИП Ляшенко И.В. | г. Жлобин, ул. Первомайская, 64 |
| 14 | ИП Ляшенко И.В. | г. Гомель, ул. Карповича, 17 |
| 15 | ЧП "КабАвтоСервис" | г. Брест, ул. Карьерная, 12-19 |
| 16 | ЧП "КабАвтоСервис" | г. Брест, ул. Морозова, 1 |
| 17 | ИП Дорофейчик С.М. | г. Слоним, ул. Советская, 19 |
| 18 | ООО "ЕвроПластСтандарт" | г. Бобруйск, ул. Минская, 123 |
| 19 | Частное предприятие "УиндКров" | г. Волковыск, ул. Жолудева, 5 |
| 20 | ИП Жерносеков А.В. | г. Полоцк, ул. Пушкина, 20-2 |
| 21 | ЧТУП "Дом-Стиль Плюс" | г. Лида, ул. Мицкевича, 15-2 |
| 22 | ИП Смолько Д.В. | г. Могилев, бульвар Непокоренных, 26 |
| 23 | ИП Смолько Д.В. | г. Могилев, пр-т Мира, 27В |
| 24 | ИП Бугаев А.В. | г. Мосты, пр-т Юности, блок 2, секция 11 |
| 25 | ЧТУП "ДвериМебель" | г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 33А |
| 26 | ООО "Белинфогид" | г. Витебск, ул. С. Панковой, 2 |
| 27 | Частное предприятие "СРС-Дверь" | г. Минск, пр-т Победителей, 127-282 |
| 28 | Частное предприятие "СРС-Дверь" | г. Минск, ул. Неманская, 3-368 |
| 29 | ИП Глушаков Л.В. | г. Могилев, ул. Минское шоссе, 31 |
| 30 | ЧТУП "ИмпАрт" | Минский р-н, Новодворский с/с, 40/2-10 |
| 31 | ИП Веревка А.Н. | г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 86 |
| 32 | ОДО "ЮКа-Мастер" | г. Мозырь, ул. Интернациональная, 113 |
| 33 | ООО "МВТрейд" | г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 95 |
| 34 | ООО "МВТрейд" | г. Гродно, ул. Белуша, 41 |
| 35 | ИП Чичелис Д.Н. | г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 163А |
| 36 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Минск, ул. Тимирязева, 123/2-209 |
| 37 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Минск, ул. Тимирязева, 123, пав. 265 |
| 38 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Минск, ул. Уручская, д. 19, пав. П2/Б |
| 39 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Минск, Строительный рынок «Уручье», пав. 201 |
| 40 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Солигорск, ул. Заслонова, д. 47, пом. 73 |
| 41 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Солигорск, ул. Октябрьская, 40-2Т |
| 42 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Витебск, Смоленская пл., д. 5, пом. 18 |
| 43 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Витебск, ул. М. Горького, 43а/10 |
| 44 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Гомель, проезд Ильича, 2Б |
| 45 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Минск, ул. Тимирязева, 123/1 |
| 46 | Частное предприятие "Дверной лидер" | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 58 |
| 47 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 153Б |
| 48 | Частное предприятие "Дверной лидер" | г. Минск, ул. Уманская, д. 54, пав. 83 |
| 49 | ИП Салкевич А.Ч. | г. Щучин, ул. Авиаторов, 7 |
| 50 | ИП Шавель А.Н. | г. Лида, ул. Ленинская, 7 |
| 51 | ОДО "АквилонМир" | г. Пружаны, ул. Макаренко, 21 |
| 52 | ИП Дроздова М.А. | г. Новополоцк, ул. Молодежная, 166 |
| 53 | ООО "МВлюкс" | г. Витебск, пр-т Строителей, 2 |
| 54 | Частное предприятие "Юриал Строй" | г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 129 |

**4. Сроки проведения рекламной игры.**

10.12.2016 – 28.02.2017 (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

1. Юркевич Зоя Владимировна, Частное предприятие «Юркас», заместитель директора по поставкам и логистике.

Члены комиссии:

1. Новожилов Владимир Владимирович, Частное предприятие «Юркас», заместитель директора по маркетингу.
2. Сергеев Андрей Владимирович, Частное предприятие «Юркас», заместитель директора по развитию.
3. Кабаненко Артур Владимирович, Частное предприятие «Юркас», начальник отдела продаж по Республике Беларусь.
4. Жигало Екатерина Игоревна, Частное предприятие «Юркас», помощник руководителя.
5. Синякович Роман Станиславович, Частное торговое унитарное предприятие «СРС-Дверь», директор.




**6. Перечень продукции, участвующей в Рекламной игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж дверных полотен торговой марки «ProfilDoors» (Профильдорс), за исключением дверных полотен серии PORTAS.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо:

1. В период с 10 декабря 2016 года по 31 января 2017 года (включительно) совершить совокупность следующих действий:

- Совершить покупку от 3 дверных полотен Торговой марки «PROFILDOORS» в одном договоре в любом из магазинов, реализующих дверные полотна на территории Республики Беларусь, за исключением дверных полотен серии PORTAS. Договор необходимо сохранить до окончания рекламной игры

- Заполнить анкету участника с помощью менеджера в соответствующих магазинах или самостоятельно на сайте yurkas.by/igra:

• город;
• адрес магазина «Юркас», в котором совершена покупка;
• фамилия, имя, отчество покупателя;
• дата совершения покупки;
• телефон для связи с указанием кода города либо кода мобильного оператора;
• почтовый адрес, индекс;
• электронная почта (при ее наличии);
• возраст покупателя (полных лет).

2. Оплатить дверные полотна, приобретаемые по договору (дверные полотна в количестве от 3 в одном договоре) в срок с 10.12.2016 до 10.02.2017 года. Физические лица, заключившие договора, но которые не оплатили полностью товар по договору в указанный срок (до 10.02.2016 г.) в рекламной игре не участвуют.

Заполняя анкету на сайте Организатора, участники подтверждают факт ознакомления и полное согласие с правилами проведения данной Рекламной игры.

В Рекламной игре принимают участие покупатели, выполнившие условия рекламной игры. Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное предоставление информации, запрашиваемой в анкете участника, несоответствие договора данным Правилам или его отсутствие.

По дате и времени регистрации анкеты на сайте (yurkas.by/igra/) рекламной игры Организатором присваиваются порядковые номера последовательно в автоматическом режиме после корректного заполнения анкеты. При наличии адреса электронной почты номер участника высылается на указанный электронный адрес участника.

В случае если одно физическое лицо совершило несколько покупок, соответствующих настоящим Правилам, физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз. Из зарегистрированных анкет, соответствующих Правилам, формируется список участников Игры в порядке, определенном регистрацией анкет на сайте (далее – Список участников).

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 2152,26 (две тысячи сто пятьдесят два) белорусских рубля и 26 копеек в денежных единицах 2009 года / 21 522 600 (двадцать один миллион пятьсот двадцать две тысячи шестьсот) белорусских рублей в денежных единицах 2000 года.

**Приз, участвующий в розыгрыше**

| № | Наименование | Кол-во, пар. | Цена за 1 ед., бел. руб. с НДС в денежных ед. 2009/2000 | Всего, бел. руб. с НДС в денежных ед. 2009/2000 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Тур на двоих в Египет, 7 ночей с 7 по 14 марта 2017 г., включающий, в том числе:**<br>- медицинское страхование,<br>- авиаперелет Минск–Хургада (Египет)–Минск,<br>- трансфер аэропорт–отель–аэропорт,<br>- проживание двух человек в отеле MINAMARK RESORT& SPA 4* в двухместном номере,<br>- питание на двоих по системе «24 часа все включено» | 1 | 2163,13 / 21 522 600 | 2163,13 / 21 522 600 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

**9.1. Место, дата и время проведения розыгрыша.**

Розыгрыш приза состоится 14 февраля 2017 года в 19.30 в студии по адресу: г. Минск, Макаенка, д. 9, студия АСБ-5 в прямом телевизионном эфире розыгрыша 782 тиража лотереи «Ваше Лото», проводимого РУП «Белорусские лотереи».

**9.2. Порядок проведения розыгрыша.**

Для проведения розыгрыша используются лототрон и набор карточек в количестве равном количеству присланных анкет с порядковыми номерами.

Каждая зарегистрированная анкета Участника оформляется в одну карточку Участника, которая содержит порядковый номер Участника. Карточки распечатываются, засыпаются в лототрон, перемешиваются, затем один из членов комиссии вынимает карточку, которая и определяет победителя в розыгрыше.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Порядок проведения розыгрыша. Определение выигрышного номера получателя приза происходит путем случайного вытаскивания карточки из барабана. В розыгрыше будет определен только один Победитель Рекламной игры, который получает тур на двоих в Египет, 7 ночей, с 7 по 14 марта 2017 г., с проживанием в отеле MINAMARK RESORT& SPA 4* в двухместном номере.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Победитель Рекламной игры извещается о выигрыше заказным письмом с уведомлением, высланным по указанному в анкете участника почтовому адресу до 16 февраля 2017 года (включительно).

Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять победителя любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на указанные при регистрации на Интернет-сайте yurkas.by номера сотовых телефонов операторов, по электронной почте, звонком по телефону.

Победитель может получить приз при предъявлении паспорта (вида на жительство и т.п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности), а также договора на приобретение товара, участвующего в рекламной игре, в офисе Организатора по адресу: Минская область, Минский район, Щомыслицкий с/с, 58, (район деревни Озерцо), до 28 февраля 2017 г. с 10.00 до 17.00 в рабочие дни.

Победитель должен в срок до 03 марта 2017 г. предъявить подарочный сертификат в турагентстве ЧТТУП «Траст Аэро Турс» по адресу: г. Минск, ул. Ульяновская, д. 30, при себе иметь паспорт(а) лиц, отправляющихся в путешествие.

В случае отказа победителя от получения приза или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

Победитель самостоятельно несет ответственность за уплату всех необходимых налогов и пошлин в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, отчества, фамилии, фотографии, аудио- и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения Рекламной игры.

Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты подлежат опубликованию в газете «Звязда» – до 20 февраля 2017 года.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, Участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Налогообложение призов производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех Участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефонам «горячей линии»: +375(17) 511-99-65, +375(29) 69-69-777 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также на сайте www.yurkas.by/igra

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2895 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 28 ноября 2016.

ЮРКАС® дверная компания

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **ЛОТ № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 250/D-30466, раположенное по адресу: г. Полоцк, ул. Гагарина, 50б, пом. 3, площадь – 204,6 кв.м, назначение – административное помещение, находящееся на земельном участке с кадастровым номером №243500000005000569, площадь – 0,6910 га, назначение – для содержания и обслуживания административного здания, котельной, механических мастерских, гаража на 25 мест и мастерских (доля в праве аренды 2/25). Право собственности, правообладатель – Ледахович Елена Владимировна; право хозяйственного ведения, правообладатель – ЧТПУП «Сантехобогревмонтаж». Стоимость после переоценки – 64800,00 белорусских рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЧТПУП «Сантехобогревмонтаж» (г. Полоцк, ул. Гагарина, 50б-3) |
| **Место-нахождение (адрес) имущества** | Витебская область, г. Полоцк, ул. Гагарина, 50б-3 |
| **Наличие обременений** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка, г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 12 16 декабря 2016 года в 10.00 |
| **Справочная информация** | Справочная информация об организации торгов: ГУЮ Витоблисполкома 210101, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, www.vitebskjust.gov.by, Начальник отдела принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка Лисова Людмила Геннадьевна, тел. 8 0214 42 64 98 Судебный исполнитель Пашкевич Майя Владимировна, тел. 8 0214 44 20 52 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка: ф-л 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 648, р/с 3642903000517, УНН 300002505, **не позднее 15.12.2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# ОАО «Красный Октябрь»

**извещает акционеров о проведении 22 декабря 2016 года в 11.00 внеочередного общего собрания по адресу: г. Витебск, проспект ген. Людникова, 10**

**Повестка дня:**

1. Об изменении номинальной стоимости акции и величины уставного фонда в связи с проведением деноминации.
5. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в приемной предприятия с 13 декабря 2016 года, в рабочие дни с 13.30 до 17.00.

Регистрация участников собрания – 22 декабря 2016 года по месту проведения собрания с 10.00 до 10.45. Список акционеров для участия в собрании будет составлен согласно данным реестра акционеров на 5 декабря 2016 года. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Справки по тел. 8-0212-52-55-70.

УНП 300003144 ***Наблюдательный совет ОАО «Красный Октябрь»***

# РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе ПО ПРОДАЖЕ ГАРАЖА С ПОДВАЛОМ, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 10-138

| Наименование | Начальная цена продажи, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%)* | Задаток, бел. руб.* | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|
| **Лот №1.** Изолированное помещение (гараж с подвалом) с инвентарным номером 500D/70783432. Назначение – помещение транспортного назначения. Общая площадь – 34 кв.м (общ. площадь гаража – 18,4 кв.м, подвала – 15,6 кв.м). Этаж – 1. Год постройки – 2002. Право собственности. Расположен по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 10-138, в ГСПК «Мечта-14» на 1-м этаже. Стены – кирпичные, перекрытия – ж/б, ворота – металлич., полы – бетонные, подвал – бетонный. Скрытая электропроводка. | 9 914,40 | 991,44 | 5% |

()* – Цена указана в денежных знаках образца 2009 г.

**СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ, НА КОТОРОМ РАСПОЛОЖЕН ОБЪЕКТ**

Кадастровый номер земельного участка – 500000000003000221, общая площадь – 10 034 кв.м, целевое назначение – строительство и обслуживание многоэтажного гаража на 599 машино-мест с пунктом технического обслуживания и мойкой машин. Земельный участок на праве постоянного пользования

**УСЛОВИЯ**

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 05.01.2017 г. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами

Валюта торгов – белорусский рубль. Валюта платежа – белорусский рубль

Участник аукциона, желающий принять участие в аукционе по нескольким лотам, вносит задаток в сумме, предусмотренной для каждого лота. Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), ему присваивается статус «Претендент на покупку»

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона

Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов)

Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом

Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций

**Аукцион состоится 10.01.2017 г. в 10.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже гаража с подвалом, **проводимом 10.01.2017 г.** (Октябрьский МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – **05.01.2017 в 11.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Зизека Виктор Михайлович, +375 (44) 717-54-20.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение**

## «Минскстрой»

**220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 327-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- пр-т Газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес., ул. Щорса, д.1 – 41 мес., ул. Налибокская, д. 34 – 20 мес., ул. Одинцова, д. 54 – 13 мес., ул. Г. Ширмы, д. 7 – 18 мес., пр-т Газеты «Правда», д.1 – 15 мес., ул. Одинцова, д. 56 – 13 мес., ул. Горецкого, д. 36 – 13 мес., ул. Академика Высоцкого, д. 3 – 9,8 мес.

Объединение осуществляет строительство объекта «Группа жилых домов и надземная гараж-стоянка в микрорайоне № 7 пос. «Восточный». Вторая очередь строительства. Многоквартирный жилой дом № 5а по генплану».

Свидетельство (удостоверение) № 500/1109-7220 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 6 октября 2014 года.

Земельный участок площадью 0,1007 га.

Проектом предусмотрено строительство односекционного 19-этажного 132-квартирного жилого дома в конструкциях серии М111-90 с техническим подпольем и теплым чердаком.

Начало строительства жилого дома – февраль 2016 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – октябрь 2017 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу (заключение от 19.05.2014 № 274-15/14, дополнение к заключению от 11.11.2016 № 765-15/16).

Договор строительного подряда от 25.02.2016 №201с-02-16, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир:

- однокомнатные №№ 8, 12,15, 17, 19, 22, 24, 26, 29, 31, 33, 36, 38, 40;
- двухкомнатные №№ 7, 9, 14, 16, 18, 21, 23, 25, 28, 30, 32, 35, 37, 39;
- трехкомнатные №№ 20, 27, 34, 41.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

1613 руб. – для 1-комнатных квартир, расположенных на 2-м – 6-м этажах, при условии 100%-ной оплаты;

1709 руб. – для 1-комнатных квартир, расположенных на 2-м – 6-м этажах, при условии оплаты согласно графику платежей;

1571 руб. – для 2-комнатных квартир, расположенных на 2-м – 6-м этажах, при условии 100%-ной оплаты;

1668 руб. – для 2-комнатных квартир, расположенных на 2-м – 6-м этажах, при условии оплаты согласно графику платежей;

1530 руб. – для 3-комнатных квартир, расположенных на 2-м – 6-м этажах, при условии 100%-ной оплаты;

1631 руб. – для 3-комнатных квартир, расположенных на 2-м – 6-м этажах, при условии оплаты согласно графику платежей.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Заместитель генерального директора* *С.Ф. Рута*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.**

**Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, (029) 896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru**

| Наименование объекта, нач. цена (с учетом/до деноминации) |
|---|
| Лот №1. Встраиваемая электрическая поверхность ДО-620, инв. №144974, 2005 г.в. Нач. цена: 10/100 000 руб. без НДС. |
| Лот №2. Кремовзбивальная машина КА-103, инв. №64163, 1984 г.в. Нач. цена: 291,60/2 916 000 руб. без НДС. |
| Лот №3. Мармит 1-ых блюд на 2 конфорки, 2 полки, инв. №145041, 2011 г.в. Нач. цена: 168/1 680 000 руб. без НДС. |
| Лот №4. Мармит 2-ых блюд 6-ю гастроемк., 2 полки, инв. №145042, 2011 г.в. Нач. цена: 252/2 520 000 руб. без НДС. |
| Лот №5. Морозильник М-7 184-000, инв. №145044, 2011 г.в. Нач. цена: 84/840 000 руб. без НДС. |
| Лот №6 Овощерезальная машина, инв. №64206, 1988 г.в. Нач. цена: 72/720 000 руб. без НДС. |
| Лот №7. Пекарский шкаф б/у, инв. №145085, 2012 г.в. Нач. цена: 268/2 680 000 руб. без НДС. |
| Лот №8. Электрическая сковорода, инв. №64150, 1984 г.в. Нач. цена: 136/1 360 000 руб. без НДС. |
| Лот №9. Привод универсальный, инв. №64190, 1985 г.в. Нач. цена: 92/920 000 руб. без НДС. |
| Лот №10. Прилавок кассовый универсальный ПКУ-70К, инв. №145043, 2011 г.в. Нач. цена: 96/960 000 руб. без НДС. |
| Лот №11. Прилавок холодильный, 2 полки, ПВВ(Н)-84К, инв. №145040, 2011 г.в. Нач. цена: 212/2 120 000 руб. без НДС. |
| Лот №12. Холодильник ХМ 1845-62 Атлант, инв. №145088, 2012 г.в. Нач. цена: 128/1 280 000 руб. без НДС. |
| Лот №13. Холодильник ХМ-6023-031 Атлант, инв. №145087, 2012 г.в. Нач. цена: 120/1 200 000 руб. без НДС. |
| Лот №14. Электроплита, инв. №145084, 2012 г.в. Нач. цена: 148/1 480 000 руб. без НДС. |
| Лот №15. Грузовой бортовой GAZ 3307, рег.знак 9901 ВТО, 1993 г.в., цвет голубой. Нач. цена: 1 495/14 950 000 руб. без НДС. |
| Лот №16. Оборудование навесное снегоочистителя фрезерно-роторного ОФР-200, 2011 г.в., инв. №145035. Нач. цена: 6 058/60 580 000 руб. без НДС. |
| Лот №17. Станок сверлильный (2М112), 1993 г.в., инв. №144739. Нач. цена: 175,50/1 755 000 руб. без НДС. |
| Лот №18. Станок горизонтально-фрезерный, инв. №141202, 1982 г.в. Нач. цена: 520/5 200 000 руб. без НДС. |
| Лот №19. Станок горизонтально-фрезерный 6Р81, инв. №143649, 1984 г.в. Нач. цена: 650/6 500 000 руб. без НДС. |
| Лот №20. Станок токарно-винторезный 16Д20, инв. №144698, 1993 г.в. Нач. цена: 1 105/11 050 000 руб. без НДС. |
| Лот №21. Станок токарно-винторезный (1Е61М), инв. №141217, 1966 г.в. Нач. цена: 390/3 900 000 руб. без НДС. |
| Лоты №22-23. Машина сновальная. Нач. цена за 1 лот: 2 600/26 000 000 руб. без НДС. |
| Лот №24. Резервуар алюминиевый емкостью 1,5 м³ (ГСМ), инв. №18571, 1971 г.в. Нач. цена: 208/2 080 000 руб. без НДС. |
| Лот №25. Котел КПЭ СМ-60, инв. №144862, 1991 г.в. Нач. цена: 310/3 100 000 руб. без НДС. |
| Лот №26. Машина МПУ-700 (посудомоечная), инв. №144863, 1991 г.в. Нач. цена: 487,50/4 875 000 руб. без НДС. |
| Лот №27. Машина протирочная МП-1000, инв. №144886, 1993 г.в. Нач. цена: 220/2 200 000 руб. без НДС. |
| Лот №28. Устройство варочное (общепит.) марки УЭВ 60.000.000РЭ, инв. №144871, 1991 г.в. Нач. цена: 105/1 050 000 руб. без НДС. |
| Лот №29. Увлажнитель воздуха АГ-1, инв. №145019, 2010 г.в. Нач. цена: 93/930 000 руб. без НДС. |
| Лот №30. Воздухосборник 4 м.куб., инв. №144867, 2013 г.в. Нач. цена: 180/1 800 000 руб. без НДС. |
| Лот №31. Воздухосборник 4 м.куб., инв. №144869, 2013 г.в. Нач. цена: 180/1 800 000 руб. без НДС. |
| Лот №32. Воздухосборник 4 м.куб., инв. №144868, 1992 г.в. Нач. цена: 180/1 800 000 руб. без НДС. |
| Лот №33. Машина сновальная Текстима 4125, инв. №14300, 1967 г.в. Нач. цена: 1 050/10 500 000 руб. без НДС. |
| Лот №34. Молот кованый пневматический марки МБ-412, инв. №141220, 1966 г.в. Нач. цена: 477/4 770 000 руб. без НДС. |
| Лот №35. Станок сверлильный инв. №144749, 1993 г.в. Нач. цена: 225/2 250 000 руб. без НДС. |
| Лот №36. Станок вертикально-сверлильный марки 2Н125Л, инв. №143048, 1976 г.в. Нач. цена: 190/1 900 000 руб. без НДС. |
| Лот №37. Станок зубофрезерный марки 5310, инв. №141196, 1964 г.в. Нач. цена: 535/5 350 000 руб. без НДС. |
| Лот №38. Станок круглопильный Ц-5, инв. №141200, 1964 г.в. Нач. цена: 135/1 350 000 руб. без НДС. |
| Лот №39. Станок круглошлифовальный марки 3А151, инв. №141219, 1967 г.в. Нач. цена: 580/5 800 000 руб. без НДС. |
| Лот №40. Станок обдировочно-шлифовальный марки ТШ 2, инв. №141663, 1968 г.в. Нач. цена: 217,50/2 175 000 руб. без НДС. |
| Лот №41. Станок отрезной – ножовочный марки 8Б72 инв. №142468, 1972 г.в. Нач. цена: 190/ 1 900 000 руб. без НДС. |
| Лот №42. Станок плоско-шлифовальный марки 3Д711ВФ11, инв. №144334, 1991 г.в. Нач. цена: 7 150/71 500 000 руб. без НДС. |
| Лот №43. Станок рейсмусовый СР-8 марки СР-8, инв. №143359, 1978 г.в. Нач. цена: 1 095/10 950 000 руб. без НДС. |
| Лот №44. Станок токарный марки 1К62, инв. №143669, 1984 г.в. Нач. цена: 557,50/5 575 000 руб. без НДС. |
| Лот №45. Станок универсальный заточной 3В642, инв. №141161, 1964 г.в. Нач. цена: 327,50/3 275 000 руб. без НДС. |
| Лот №46. Станок деревообрабатывающий УС-2М, инв. №141199, 1965 г.в. Нач. цена: 249/2 490 000 руб. без НДС. |
| Лот №47. Таль электрическая 0,5 т марки CD 0,5 т, в/п 6 м, инв. №144881, 2013 г.в. Нач. цена: 210/2 100 000 руб. без НДС. |
| Лот №48. Трансформатор силовой марки ТМЗ1000, инв. №141363, 1967 г.в. Нач. цена: 1 152/11 520 000 руб. без НДС. |
| Лот №49. Трансформатор силовой марки ТМЗ1000, инв. №141364, 1967 г.в. Нач. цена: 1 152/11 520 000 руб. без НДС. |
| Лоты №50–51. Емкость стальная 2,5 м.куб. Нач. цена за 1 лот: 72/720 000 руб. без НДС. |
| Лот №52. Изолированное помещение с инв. №200/D-96658 (Ткацкий цех №1) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. М. Горького, 62-1, площадью 15077,3 кв.м, Кап. строение с инв. №200/С-97005 тепловая сеть к зданию №62 протяж. 68,1 м; Кап. строение с инв. №200/С-97007, паропровод к зданию №62, протяж. 29 м; Кап. строение с инв. №200/С-97014, канализационная сеть бытовая от здания №62, протяж. 123 м; Кап. строение с инв. №200/С-97006, водопроводная сеть технической воды к зданию №62 протяж. 69,8 м; Кап. строение с инв. №200/С-97013, канализационная сеть ливневая от здания №62, протяж. 118,7 м; Озеленительные насаждения, инв. №144995, 2006 г.в.; Виноград «Девичий» 4 шт., инв. №144508, 2007 г.в.; Дорожное покрытие, инв. №12080, 2010 г.в.; Лифт грузовой ПГ-286, инв. №11011, 1991 г.в.; Трансформатор силовой ТМ-1000, инв. №141362, 1967 г.в.; Трансформатор силовой ТМ-1000, инв. №141330, 1966 г.в.; Трансформатор силовой ТМ-1000, инв. №141364, 1967 г.в.; Бак воды 125М3, инв. №18664, 1965 г.в.; Турникет-трипот Т-025 R, инв. №144513, 2009 г.в.; Щит управления, инв. №144373, 1991 г.в.; Щит управления, инв. №144370, 1991 г.в.; Щит управления, инв. №144371, 1991 г.в.; Кран мостовой 5т в составе: опоры металлические 10 шт. высотой 12 м, кран-балка опорная с длиной пролета 15 м грузоподъемностью 5 тонн, тельфер грузоподъемностью 5 т высотой подъема 12 м, инв. №143362, 1979 г.в. Имущество расположено на земучастке с кадастровым №240100000003009640 площадью 1,9676 га (долевая аренда). Нач. цена: 2 780 899,68/27 808 996 800 руб. без НДС |
| Лот №53. Капитальное строение с инв. №200/С-87185 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. М. Горького, 62/1, назначение – сооружение специализированное электроэнергетики, наименование – сооружение трансформаторной подстанции площадью 183,3 кв.м, составные части: 2 линии электропередачи, в т.ч. 5 единиц кабельных линий: Кабель ААБ 3*150 3 шт. протяженностью 1420 м, инв. №15196, №15197, №15211, Кабель ААБ 3*150 2 шт. протяженностью 2230 м, инв. №15198, №15199. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №240100000003009640 площадью 1,9676 га (долевая аренда). Нач. цена: 122 780/1 227 800 000 руб. без НДС |
| Лот №54. Капитальное строение с инв. №200/С-82204, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 66, корп. 1, площадью 380,7 кв.м, наименование: здание компрессорной, назначение: здание специализированное энергетики; дорога на промплощадке площадью 95 кв.м, инв. №12007; забор кирпичный на кирпичных столбах протяженностью 140 м.п., высотой 3,3 м с воротами металлическими автомобильными дл. 6 м, инв. №12038; мостовой кран 5 т, инв. №142263-1. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №240100000003004246 площадью 0,3481 га. Нач. цена: 63 380/633 800 000 руб. без НДС |

Повторные торги состоятся **22.12.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 07.12.2016 с 8.30 по 21.12.2016 до 17.30.** Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 09.11.2016, 12.10.2016. Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Задаток на участие в торгах составляет 10% от начальной цены лота и перечисляется на р/с: №3012411521014 (руб.), №3012411521812 (RUB), №3012411521519 (USD), №3012411521522 (EUR) в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., МФО 739, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Условия: оплата НДС сверх цены продажи имущества, комиссия по конвертации и переводу валюты, демонтаж оборудования осуществляется за счет покупателя, по лотам №№52–53: обеспечение потребителей электрической энергии (в т.ч. абонентов и субабонентов) электрической энергией с заключением договоров энергоснабжения, а также иных условий и норм в соответствии с действующими в РБ правилами энергоснабжения

Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в т.ч. индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. **Победитель торгов (претендент на покупку) обязан:** в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Имущество, выставляемое на торги бывшее в употреблении. **Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

■ Хто каго?

# «Гусей — кармі і сцеражы: На шляху — ні-ні! У ваду — не лезці...»

**Што было, — было: па адной вясковай вуліцы гусі хадзілі. А тут, як на ліха, машына і...**
**Не паспела затармазіць: адну асобіну збіла, астатнія — ходу, у двор...**
**Кіроўца (чалавек яшчэ) услед за імі падаўся. Кажа:**
**— Прабачце, гаспадынька, я, відаць, вашу гуску збіў? Можа, глянеце?**
**Выйшла кабета за весніцы, паглядзела.**
**— Не, — сказала, — гэта не мая, у мяне такіх пляскатых зроду не было.**



А вось іншых — шэрых ці белых, круглых, спаважных, нават... пісьменных шмат — і было, і ёсць. Сведчаннем таму

*Гэты здымак — з Беларусі,*
*Дзе чытаюць нават гусі!*
*Напісалі: нельга ў ваду, —*
*Чарадой шукаюць броду.*

Во, якія паслухмяныя — на думку сужэнцаў Астроўскіх з Мінска. Ці якраз наадварот, як лічыць **спадар Анатоль Гарачоў з в. Даўнары Іўеўскага раёна:**

*Надпіс, можа, і не хлусіць:*
*Рэчка — з кепскай славаю.*
*Калі ж гусі з Беларусі,*
*Усё адно паплаваюць!*

Ёсць і кампрамісны варыянт: гэта значыць, паплаваюць гусі, але ж далёка не ўсе, як мяркуе **спадарыня Раіса Васільева з Гомеля.** Яна, уважліва паглядзеўшы на здымак, не проста прыдумала подпіс, а намалявала карціну, прычым з дыялогамі. Накшталт — спынілася гэта чарада на беразе, пад забараняючым «знакам», і гамонку вядзе:

*— Не было ж такога зроду:*
*Нам, гусям, ды нельга*
*ў ваду?..*
*Ў гусака свае законы:*
*— Мне пляваць! Я сам*
*вучоны:*
*Там у кайф купаецца,*
*Дзе забараняецца!*
*...Я спытаю ў вас хутчэй:*
*— Бачыў хтось такіх...*
*людзей?*

Ну, вядома ж... І, згадзіцеся, не толькі па тэлевізары ў крымінальнай хроніцы. Яны побач з намі жывуць: то вуліцу перабягаюць на чырвонае святло, то, напіўшыся, транспартам кіруюць, то бензінам дровы ў печы падпальваюць, то па тонкім лёдзе ходзяць, а то проста з моста ў ваду, а потым...

Мае рацыю **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска:**

*Каб не каяцца да скону*
*Ты не плюй на забарону*
*І не кідайся з разгону*
*Безаглядна ў кар'ер...*
*Лепей добранька правер.*

Задачка для тых, хто не хоча праверяць: Косця заплыў за буйкі на 10 метраў, Валера — на 20. Каго вадалазы знойдуць раней?

Адгадалі? Значыць, пагодзіцеся, што ў якасці подпісу пад верхнім здымкам могуць быць і вось гэтыя радкі ад **спадарыні Чыгрынавай:**

*Мудры бабчын гусак,*
*Каб адвесці бяду,*
*Маладых забіяк*
*Не пускае ў ваду.*

Правільна робіць. Але ж цікава, чаму: што з вадой той сталася?

Успамін з канверта — зноў жа ад **спадарыні Чыгрынавай:** «Каля нашай вёскі некалі была сажалка — чыстая-чыстая, бо жывілася выключна крыніцамі. Да таго ж яе з трох бакоў атуляў лес і хіба з аднаго паўночнага прасціралася поле. Карацей — прыгажосць была невыказная: усіх, хто прыязджаў у госці, вяскоўцы вадзілі ў гэты райскі куточак, каб паказаць ды і самім яшчэ раз палюбавацца. Больш за тое — рыбакі любілі пасядзець там з вудамі, дзеці — пакупацца ды пазагараць, парачкі — памілавацца...

І толькі аграному ўсё гэта было непатрэбна: яму ворыўнай зямлі не хапала, хацелася плошчы пасяўныя пашырыць. Вось і аддаў ён загад узараць тое поле — аж да самай сажалкі. Трактарысты пярэчыць не сталі: зрабілі, як загадаў. Потым туды ж прывезлі пратраўленае зерне і калійную соль.

Мяхі з ёй, пэўна, лепш было б паставіць паводдаль і не на раллю. Бо ноччу пайшоў дождж, і ручайкі з атрутай пацяклі ў ваду. Назаўтра па берагах сажалкі ляжала мёртвая рыба. А потым памерла і яна сама».

Людзі праўду кажуць, што ўсё прырода сцерпіць, але ж і адпомсціць.

У адным высакагорным санаторыі пацыент паскардзіўся, што яму цяжка дыхаць. «Ды быць не можа! — здзівіўся доктар. — У нас жа — найчысцейшае паветра!..» — «Вось-вось, найчысцейшае, — кажа хворы. — А я прывык бачыць, што ўдыхаю».

І, вядома ж (як лічаць **сужэнцы Астроўскія**), што ўжываю:

*Мы вадзіцу з крамы п'ём,*
*Хоць ля возера жывём...*
*Там — калі б ні ўзялі пробы —*
*То атрута, то мікробы.*

**Спадар Віктар Сабалеўскі з Узды** наватr «прозвішча» іх ведае:

*Прыязджаць на Нарач*
*модна...*
*Хоць бывае й там «псіхоз»:*
*Выганяе з гладзі воднай*
*Злосны дзед Цэркарыёз.*
*Кажа: нечага купацца,*
*Гэта месца — для гусей.*
*Людзям — толькі любавацца,*
*А паплаваць — у басейн.*

Трэба сказаць, што гэта — не найгоршае месца яшчэ (асабліва зімой). А вось летам...

*...Ну якое там купанне, —*
*Мусім плёскацца ў ванне!*
*Бо мікробы і хваробы*
*Нам ніяк не даспадобы!..*
*Ну а гускам што рабіць?*
*Ні нырнуць, ні корм здабыць.*

Шкадуе птушак **спадарыня Соф'я Кусянкова з в. Лучын Рагачоўскага раёна.** І, вядома ж, не без падстаў:

*Сёння гвалт у чарадзе:*
*— «Быць бядзе!»*
*ды «Быць бядзе!»*
*Бо ў раку, паўз агароды,*
*З фермы хлынулі адходы...*
*Гускам страх не толькі*
*плыць,*
*Нават лапкі памачыць!*

Лічыць так **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў. Цалкам лагічная здагадка і ў спадара Мікалая Старых з Гомеля:**

*Знюхаў наш гусак смурод...*
*Кажа: «Побач — ёсць завод.*
*Каб здаровымі застацца,*
*Лепш і праўда не купацца —*
*Лёгка гэтак сказаць,*
*а вось зрабіць...*
*Кінуў заклік «грамацей»:*
*«Вадаём — не для гусей!»*
*Ну а тым — нырнуць ахвота*
*Тым — на сушы —*
*не пражыць...*
*«Грамацея» б па суботах*
*У парылку не пусціць!*

Строгае пакаранне ў **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў!**

Ад яго ж і наступныя разважанні: «Забароны ў жыцці, безумоўна, патрэбны: на брыдкаслоўе, курэнне, браканьерства, наркотыкі, на распіццё спіртных напояў у пэўных месцах... Але ж шмат абмежаванняў шкодных, тых, што адбіваюць усякае жаданне працаваць, перашкаджаюць чалавеку дзейнічаць, будаваць свой дабрабыт і нават жыццё».

Выснову гэтую **спадар Валерый** «ілюструе» наступнымі радкамі:

*Купіць свінак селянін —*
*Забарона! Каранцін!*
*Афрыканская чума!*
*І... свіней ужо няма.*
*Ён завёў быў*
*дома качак, —*
*З вадаёмам перапоны...*
*Перспектываў больш*
*не бачыць:*
*Што ні крок, — то забароны!*

«А таму, — працягвае **спадар Гаўрыш,** — не трэба спяшацца з такімі забаронамі. Трэба ўважліва аналізаваць наступствы, шукаць іншыя варыянты дзеянняў».

Гэта, вядома ж, цяжэй, чым «шыльду» прыбіць да жывога (!) дрэва, але... бяспечней, бо, можа ж стацца, што гусі пачуюць словы **спадара Міколы Кісяля з Мінска:**

*— Хопіць вам гагакаць,*
*Горка ў пер'е плакаць.*
*Лепш — падняцца ў неба*
*Ды к «шыльдапісаку» —*
*Дзеўбануць дзе трэба*
*Гэтага сабаку!*

Месцазнаходжанне аднаго з іх (пісак ці сабак) ведае **спадарыня Ніна Бурко з в. Капланцы Бярэзінскага раёна:**

*Рыбак заядлы, Аляксей*
*Перахітрыў-такі гусей,*
*Калі прыбіў цвікамі, зрання,*
*Што забаронена купанне.*
*І сталася — яго рака!*
*Адзін «купае» чарвяка!*

Трэба разумець, не проста так. Зараз — без гусей, без перашкод, у поўнай цішы — рыбы сабе наловіць, потым ля вогнішча стане юшку варыць...

Дарэчы, неяк на пах яе да аднаго вось такога рыбака цыганку прынесла. Падышла ды кажа: «Брыльянтавы, дай руку, паваражу табе». Ён працягнуў. Жанчына глянула і гаворыць: «Ой, даражэнечкі, бачу, што захварэеш ты: дызентэрыя пачнецца... Ад прыбіральні нікуды не адыдзешся. Можа, нават у бальніцу загрыміш». — «Што — такія дрэнныя лініі?» — пытае рыбак. — «Не, такія брудныя рукі...»

А дзе мікробы, там, як вядома, хваробы — нікому не патрэбныя. Таму скончыць агляд нашай конкурснай пошты хочацца іншымі цалкам лагічнымі тут радкамі **спадара Віктара Сабалеўскага:**

*Апусцілі дзюбы гусі:*
*«На вярхах» узгоднена,*
*Што ў рэках Беларусі*
*Плаваць забаронена.*
*Не таму, што там чума*
*Ці які гвінейскі грып —*
*Набліжаецца зіма*
*І гусак ужо асіп.*

А таму з купаннем давядзецца пачакаць — лета, цяпла, водпуску, мора...

Кажаце, доўга? І сапраўды: святы (на думку **спадара Васіля Міронычка з Бабруйска**) куды бліжэй. Ды яшчэ і якія! Да такіх, калі не кабанчыка, то, як мінімум

*Гусей — кармі і сцеражы:*
*На шляху — ні-ні,*
*у ваду — не лезці...*
*Але ж,*
*як да Каляд дажыў,*
*То смачна з яблыкамі з'есці!*

Хто б спрачаўся — мы не будзем. Як і з вызначэннем пераможцаў.

Такім чынам, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі да папярэдняга конкурснага здымка (на ім, нагадаем, было як мінімум чатыры кабеты ў беларускіх нацыянальных строях і адна, можна сказаць, без ніякага... «Звязда» 29 верасня г.г.) напісалі **спадары Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны,**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Іван Астроўскі з Мінска, а таксама спадарыні Раіса Васільева з Гомеля, Любоў Чыгрынава з Мінска і Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны.** З гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзіліся і журы маленькае — рэдакцыйнае.

Такім чынам, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на першы квартал 2017 года накіроўваецца ў вёску Лучын, што на Рагачоўшчыне.

Хочаце, каб газета прыходзіла і да вас? Тады ёсць варыянты, як той казаў: першы — аформіць падпіску, другі — уважліва паглядзець на новы конкурсны здымак, прыдумаць подпіс, можна некалькі — трапных, дасціпных, кароткіх (не больш за 8 радкоў) і даслаць у рэдакцыю.

Поспехаў!

**Валянціна ДОЎНАР.**

*dounar@zviazda.by*

***АД ІХ ЖА** шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі гэтым разам не прайшлі строгі конкурсны адбор, але наступным... Пішыце!*

■

# Кніга як люстэрка традыцый і навацый

**У Міністэрстве інфармацыі краіны пад кіраўніцтвам першага намесніка міністра Ігара ЛУЦКАГА прайшло пасяджэнне аргкамітэта па правядзенні 24-й Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.**

Несумненна, прыярытэтнымі кірункамі ў арганізацыі і правядзенні свята кнігі, якое пройдзе 8—12 лютага 2017 года, стануць 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, юбілеі класікаў беларускай літаратуры — народных паэтаў Беларусі Якуба Коласа, Янкі Купалы, Пімена Панчанкі, народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля.

Краінай — ганаровым госцем на выстаўку запрошана Вялікабрытанія. Варта ўспомніць, што ў нас традыцыйна ўмацоўваліся беларуска-англійскія літаратурныя сувязі. У Мінску выйшла нямала кніг пісьменнікаў Вялікабрытаніі на беларускай і рускай мовах. Творы Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, нашых айчынных класікаў перакладзены на англійскую мову.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкі дом «Звязда» пры падтрымцы міністэрства інфармацыі рыхтуюць правядзенне ў час выстаўкі-кірмашу традыцыйнага Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час». Папярэднюю згоду прыняць у ім удзел выказалі празаікі, паэты, драматургі, публіцысты больш як з дзесяці краін свету. Пройдзе ў лютым і семінар маладых пісьменнікаў. Арганізатары гэтага творчага праекта — Міністэрства інфармацыі краіны, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура».

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

■ Не абмініце!

# Багдановіча чытаюць... зоркі

## Незвычайны праект да 125-годдзя паэта арганізавала Нацыянальная бібліятэка

**Гаворка зусім не ідзе пра чытанне вершаў класіка зоркамі кіно, тэлебачання, спорту. Паэт пісаў «Бачыце гэтыя зоркі...», а цяпер — зоркі бачаць яго вершы. На светлавым электронным табло Нацыянальнай бібліятэкі.**

Да канца года мінчане і госці горада, мінаючы галоўную «кніжніцу» краіны ў прыцемках, будуць чытаць Максіма. Яго прыгожыя радкі многім ужо знаёмыя, а для іншых стануць і адкрыццём. Магчыма, нехта натхніцца на больш блізкае знаёмства і зазірне ў сам будынак бібліятэкі. Тут таксама чакае сюрпрыз — на адмысловай выстаўцы можна пабачыць сапраўдны скарб — кнігу паэзіі «Вянок» з аўтографам самога Максіма Багдановіча. Выстаўка, што атрымала сімвалічную назву «Светлы след...», арганізаваная галоўнай бібліятэкай краіны і Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь і прымеркаваная да 125-годдзя паэта, паказвае шлях самога Максіма Багдановіча — праз кнігі і дакументы.

— Мы таксама зрабілі свой уклад у тое, каб імя Максіма Багдановіча сёння гучала і было вядомае, — зазначыў **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, доктар педагагічных навук Раман МАТУЛЬСКІ.** — Адразу пасля заснавання наша бібліятэка пачала збіраць матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю паэта. Але ў гады Вялікай Айчыннай вайны многія набыткі гэтай работы былі страчаны. Сёння, калі мы гаворым пра зорку Бадановіча, можам згадаць і нашу бібліятэчную зорку — нястомную збіральніцу Ніну Ватацы. Амаль усё жыццё яна прысвяціла збору і захаванню матэрыялаў пра Максіма, і праз многа гадоў яе праца не страціла сваёй вартасці.

Выстаўка «Светлы след...» падкрэсліве значнасць яшчэ адной не надта гучнай, але вельмі важнай галіны — архіўнай. Тут прадстаўлены ўнікальныя дакументы розных гадоў, самы стары з іх датуецца 1918 годам.

— На гэтую выстаўку мы выбралі і прадставілі дакументы, звязаныя з ушанаваннем памяці паэта, — тлумачыць **дырэктар Нацыянальнага архіва Віктар КУРАШ.** — Так, тут ёсць дакумент, што фіксуе рашэнне 1918 года аб стварэнні Беларускага народнага дома імя Максіма Багдановіча, Ахоўная грамата Прэзідыўма ўрада Беларусі пры ўрадзе РСФСР аб запрашэнні бацькі паэта на пражыванне ў нашай краіне з выдзяленнем яму кватэры. Гэта і перапіска мастакоў з ЦК партыі аб стварэнні помніка паэту ў Мінску, і лісты Саюза пісьменнікаў да Пятра Машэрава з просьбамі аб заснаванні музея Багдановіча ў Мінску.

Але і гэта — не ўсе падарункі Максіму ад Нацыянальнай бібліятэкі. Тут таксама падрыхтавалі абноўленае і дапоўненае электроннае выданне «Паэт красы і гармоніі», прысвечанае Максіму Багдановічу. Гэта сапраўдная бібліятэка, што змяшчае больш як 250 алічбаваных тэкстаў, работы мастакоў, фрагменты тэлефільмаў і песні на вершы класіка.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

■

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЦЫБУЛЯ НА ПАДАКОННІКУ



**Калі арганізму не хапае цынку, псуюцца скура, валасы і пазногці, парушаецца рэпрадуктыўная функцыя, пачынаюцца гарманальныя збоі, зялёная цыбуля дапаможа папоўніць недахоп не толькі вітамінаў, але і такога важнага мікраэлемента! Усім вядома, што яе можна вырошчваць зімой на падаконніку. А каб рабіць гэта было яшчэ лягчэй, прапануем некалькі спосабаў з выкарыстаннем падручных матэрыялаў.**

### *Ва ўпакоўках з-пад яек*

Наліваем у ёмістасць вады і размяшчаем на ёй кардонныя яечныя латкі. Высаджваем апрацаваныя ў цёплай вадзе цыбулькі



ў кожнае вочка. Працэс апрацоўкі надзвычай просты: замочваем цыбуліны ў цёплай вадзе (40 °C) на 10 хвілін. Гэтая працэдура забяспечыць больш актыўны рост маладых зялёных пёраў! Не забывайцеся пастаянна даліваць ваду ў ёмістасць! Рост цыбулі пачнецца адразу пасля высадкі, і неўзабаве можна будзе парадавацца ўраджаю.

Вельмі зручна прарошчваць на падаконніку адразу дзясятак цыбулін у пластыкавым кантэйнеры з пад яек. Каб сваімі рукамі збудаваць такую «гідрапонную ўстаноўку», трэба толькі падрэзаць кантэйнер на дзве паловы, выразаць у вочках верхняга «яруса» адтуліны, а ніжні «паддон» запоўніць



вадой і адрэзаць у яго лішнія грудкі. Затым скласці дзве часткі адна на адну і падкласці паміж імі драўляныя шпажкі-палачкі, як паказана на фота. З-за таго, што цыбуліны не сутыкаюцца з вадой, яны не загніваюць, а дзякуючы насычэнню каранёў кіслародам даюць вельмі добры ўраджай.

### *У пластыкавай бутэльцы*

Багаты ўраджай у кароткія тэрміны на вельмі маленькім участку зямлі: вось што абяцае гэты трук з пластыкавай бутэлькай.



Адразаем верхнюю частку вялікай пластыкавай бутэлькі. Гарачым прутком робім адтуліны ў ніжняй часткі бутэлькі. Гэта неабходна для папярэджання залішняй вільготнасці на імправізаванай градцы! Праразаем бакавыя адтуліны ў пластыкавай бутэльцы: не мае значэння, круглыя ці квадратныя. Яны павінны знаходзіцца на адлегласці каля 10 см адна ад адной. Цяпер можна запаўняць бутэльку грунтам і цыбулінамі! Не забудзьцеся папярэдне патрымаць цыбулю пару дзён у вадзе, яна пусціць маленькія зялёныя парасткі, якія пасля ператворацца ў шчодры ўраджай. Важна пакінуць сцябло звонку: уласна, гэта ўся тонкасць пасадкі цыбулі. Калі ўсе цыбуліны размешчаны на сваіх месцах, можна дадаць яшчэ зямлі і ўставіць адрэзаную верхнюю частку бутэлькі.

## Стымулятары ўтварэння каранёў з падручных сродкаў

**Пры размнажэнні раслін чаранкамі часам узнікае праблема з утварэннем каранёў. Для паскарэння працэсу можна звярнуцца да стымулятараў прамысловай вытворчасці, самыя папулярныя з іх — карнявін і гетэраауксін. Але ёсць і некалькі правераных часам народных спосабаў.**

### *Мёд*

У 1,5 л вады раствараюць чайную лыжачку мёду, чаранок змяшчаюць у раствор на адну трэцюю і вытрымліваюць у ім 12 гадзін.

### *Бульба*

Для ўкаранення падыдзе буйная бульбіна. З яе старанна выдаляюць усе вочкі, робяць надрэз і ўстаўляюць у яго чаранок. Пры дастатковым паліве ён хутка дасць карані. Нават расліны, якія дрэнна чаранкуюцца, можна ўкараніць такім спосабам, бо чаранкі атрымліваюць з бульбы масу пажыўных рэчываў.

### *Сок альясу*

У ваду з чаранкамі дадаюць 3—7 кропель свежага соку альясу. Ён не толькі паскарае з'яўленне карэньчыкаў, але і стымулюе імунную сістэму чаранка.

### *Вербная вада*

Некалькі галінак вярбы (падыдуць таксама таполя, багун) паставіць у ваду і дачакацца з'яўлення каранёў. Калі карэньчыкі з'явяцца, вярбовыя дубчыкі можна прыняць і паставіць у гэтую ваду чаранок. Атрыманую ваду не мяняюць, толькі даліваюць пры неабходнасці.

### *Дрожджы*

Рыхтуюць раствор дражджэй (100 мг на 1 л) і змяшчаюць у яго чаранкі на суткі, пасля гэтага іх абмываюць і пераносяць у запоўненую да паловы ёмістасць з вадой.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.14 | 16.48 | 7.34 |
| Віцебск — | 9.10 | 16.31 | 7.21 |
| Магілёў — | 9.04 | 16.38 | 7.34 |
| Гомель — | 8.52 | 16.43 | 7.51 |
| Гродна — | 9.28 | 17.05 | 7.37 |
| Брэст — | 9.20 | 17.14 | 7.54 |

## Месяц

*Першая квадра 7.12—13.12.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр. Кацярыны, Сямёна.*
*К. Лiліі, Марыі, Марцiна, Тодара.*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА




## …у суседзяў




## УСМІХНЕМСЯ

**Добры суразмоўца не толькі слухае, але і падлівае.**

— Люся, ты ведаеш, мне цябе вельмі не хапае!
— Сапраўды?!
— Так... Давядзецца, напэўна, яшчэ адну жанчыну завесці.

**Хочаце даведацца, што вашы сяброўкі думаюць пра вашага мужа, скажыце, што ён аказаўся падонкам і вы разводзіцеся.**

Знаёмствы ў інтэрнэце.
Ён:
— Я маленькі, тоўсты, лысы, у акулярах, але ёсць крутая BMW... І дом на моры!
Яна:
— Нічога, галоўнае душа!

**Мяне клікалі мары, прыгоды, вялікія справы!**
**Але канапа крычала мацней за ўсіх.**




Малюнак Алега ПАПОВА.

## Навагоднія падарункі ад «Звязды»




Як самым блізкім людзям, сваім чытачам мы падрыхтавалі сюрпрызы ўжо з першага нумара 2017 года. У ім усе, хто падпісаўся на «Звязду», атрымаюць (абсалютна бясплатна!) такі вось прыгожы стырны насценны каляндар на тоўстай паперы, з добра бачнымі лічбамі.

У першыя дні студзеня разам з нумарамі газеты вы атрымаеце каляндар канфесійных свят, народны каляндар і месяцавы каляндар садаводаагародніка.

***Заставайцеся са «Звяздой» — ідзіце ў нагу з часам! Няхай кожны дзень будзе добрым!***

## Даты | Падзеі | Людзі

### 7 СНЕЖНЯ

**1635** год — упершыню была выказана ідэя будаўніцтва канала, які злучыў бы басейн ракі Прыпяць з Заходнім Бугам. І толькі ў 1785 годзе ў мястэчку Гарадзец Кобрынскай эканоміі адбылася знамянальная падзея — адкрыццё Каралеўскага канала (Днепра-Бугскі канал). Судна з карaлём Станіславам Аўгустам на борце ўрачыста праплыло да наступнага шлюза.

**1764** год — у Санкт-Пецярбургу заснаваны Дзяржаўны музей Эрмітаж. Калекцыя музея налічвае каля трох мільёнаў твораў мастацтва і помнікаў сусветнай культуры, сярод якіх «Мадонна Бенуа» Леанарда да Вінчы, «Вяртанне блуднага сына» Харменса ван Рэйна Рэмбранта і многія іншыя.



**1862** год — на тэрыторыі Беларусі пракладзена першая чыгуначная лінія Парэчча—Гродна як частка Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі.

**1940** год — нарадзіўся (г. Масква) Юрый Аляксандравіч Ялхоў, беларускі кінааператар, рэжысёр. Сярод аператарскіх работ: мастацкія фільмы «Двое на востраве слёз», «Наш бранепаезд», «Сын за бацьку». Пастаноўшчык мастацкіх фільмаў «Прабач нас, мачыха-Расія», «Анамалія», «Анастасія Слуцкая».

**1941** год — нарадзіўся (вёска Верхні Церабяжоў Столінскага раёна) Васіль Дзмітрыевіч Ліцвінка, беларускі фальклярыст, кандыдат філалагічных навук. У 1970 годзе скончыў БДУ, дзе і працаваў. З 1991 года быў старшынёй Беларускага саюза фальклярыстаў. Збіраў і даследаваў беларускі фальклор і этнаграфію. Памёр у 2007 годзе.

### Было сказана

**Еўдакія ЛОСЬ, паэтэса:**

*«Чужое неба сэрцу*
*не дагодзіць,*
*Душы не загадае: не балі!..»*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4881.
Нумар падпісаны ў 19.30 6 снежня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12